КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 44 (267) ◂ 25 лістапада ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**ГАНЕБНЫ ПРЫСУД**

Стар. 6

**РУБЕЛЬ ПАМРЭ, СУВЕРЭНІТЭТ ТАКСАМА**

Ці паспрыяе знешнегандлёваму абароту ўступленне Беларусі ў Еўразійскі саюз? — фінансавы аналітык Сяргей Чалы мяркуе, што высновы рабіць пакуль рана

Стар. 5

**ІСПАНСКАЯ МАЗАІКА**

Пасля катастрофы сацыялістаў на парламенцкіх выбарах у Іспаніі склаліся падставы для адыходу ад двухпартыйнай сістэмы

Стар. 29

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10044

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ГРАМАДСТВА ПАВІННА ПРАЧНУЦЦА**

Інтэрв'ю з расійскім праваабаронцам Алегам Арловым

▸ **З НАГОДЫ**

# СПРОБА РЭІНКАРНАЦЫІ ІМПЕРЫІ

**Вольга ХВОІН**

**Кіраўнік краіны ўнёс на ратыфікацыю ў Палату прадстаўнікоў дамову аб Еўразійскай эканамічнай камісіі (ЕАК), падпісаную ў Маскве тыдзень таму. Еўразійская эканамічная інтэграцыя мае шанцы стаць пераломным момантам для суверэнітэту Беларусі.**




18 лістапада ў Маскве адбылася сустрэча Дзмітрыя Мядзведзева, Аляксандра Лукашэнкі і Нурсултана Назарбаева, па выніках якой яны падпісалі дэкларацыю аб еўразійскай эканамічнай інтэграцыі і дамову аб Еўразійскай эканамічнай камісіі — вышэйшым органе Мытнага саюза (МС) і Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП). Еўразійская эканамічная камісія прыйдзе на змену камісіі Мытнага саюза, што спыніць сваё існаванне 1 ліпеня 2012 года. Камісія павінна пачаць працу з 1 студзеня 2012 года. ЕЭК плануецца надзяліць функцыямі «кіраўніцтва інтэграцыйнымі працэсамі ў фармаце МС (Мытнага саюза) і АЭП (Адзінай эканамічнай прасторы)». Камісіі будуць паступова перадавацца нацыянальныя паўнамоцтвы.

ЕЭК будзе складацца з савета і калегіі, у раду ўвойдзе па адным віцэ-прэм'еры ад урада кожнай краіны, у склад калегіі — па тры прадстаўнікі кожнага боку. Таксама для ЕЭК прадугледжаны паўнамоцтвы па стварэнні дэпартаментаў, што будуць рыхтаваць рашэнні і займацца маніторынгам у падведамасных галінах, і кансультатыўных органаў. Калегію Еўразійскай эканамічнай камісіі ўзначаліць на чатыры гады міністр прамысловасці і гандлю РФ Віктар Хрысценка.

Ужо праз пяць гадоў мусіць быць сфармаваны адзіны ўнутраны рынак Еўразійскага саюза. «Нядаўна краінамі-ўдзельніцамі Еўразійскага саюза была прынятая дэкларацыя аб еўразійскай інтэграцыі. У ёй намечаныя канкрэтныя крокі ў гэтым кірунку. Еўразійская эканамічная прастора прадугледжвае свабодны рух тавараў, паслуг і працоўных рэсурсаў. Аднак на працягу бліжэйшых пяці гадоў нам трэба будзе зрабіць каласальную працу, у тым ліку па падрыхтоўцы неабходнай дакументацыі, што дасць магчымасць да 2016 года забяспечыць поўнафарматны адзіны ўнутраны рынак. У перспектыве ад нас запатрабуецца яшчэ больш высокая ступень інтэграцыі», — адзначыў генеральны сакратар Еўразійскага саюза Таір Мансураў.

Еўразійскі саюз будзе саюзам суверэнных дзяржаў, у якога будуць свае наднацыянальныя органы з больш чым 175 функцыямі, тлумачыў у эфіры праграмы «Весці» кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Аднак інтэграцыя ў бок Азіі для Беларусі цяпер ёсць вымушаным прагматычным крокам. Зацікаўленасць Беларусі ў гэтым праекце прадыктаваная намерам атрымаць цэны на газ і іншыя энерганосьбіты, аднолькавыя з расійскімі суб'ектамі гаспадарання. А папсаваныя з Захадам адносіны вымушаюць шукаць падтрымкі ў Расіі, якая не прад'яўляе прэтэнзій да аўтарытарызму Лукашэнкі. Пакуль ад Мытнага саюза Беларусь нясе больш стратаў, але застаецца спадзеў у перспектыве выйграць, атрымаўшы высокапрыбытковыя кошты на энергарэсурсы.

Разам з тым для вышэйшага кіраўніцтва Беларусі змяшчэнне эканамічнага цэнтру на Усход не ёсць спрыяльным момантам, бо адначасова з перадачай кантрольных функцый за размеркаваннем эканамічных плыняў страчваецца і доля ўлады. Наменклатура і прадстаўнікі сілавых ведамстваў, уплывовасць якіх у краіне цяпер не мусіць выклікаць сумневаў, добра адчуваюць, хто кіруе працэсам і адкуль ідзе рэсурс. Адпаведна, і погляды хутка скіроўваюцца ў бок такой крыніцы. А наднацыянальныя органы, што мяркуецца стварыць у межах еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, акурат забіраюць частку паўнамоцтваў у сябраў гэтага праекту.

Застаюцца амбітныя геапалітычныя інтарэсы Масквы, якая ў падобных аб'яднаннях не можа бачыць сябе роўняй Беларусі ці Казахстану. Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў ужо заявіў, што жадаючыя інтэграваецца ў Мытны саюз і Адзіную эканамічную прастору будуць працаваць па адмысловай «рабочай карце». «Гэта далучэнне можа доўжыцца год, два, тры, дзесяць, пятнаццаць гадоў для таго, каб не парушыць нашых эканамічных інтарэсаў, нашай Еўразійскай эканамічнай супольнасці, нашай прасторы і будучага саюза і для таго, каб не стварыць складанасцяў для краінаў, што далучацца. Будзем дзейнічаць акуратна», — дадаў ён і адправіў на адрас Беларусі шпільку. — Давайце паглядзім, што ў нашых суседзяў адбываецца, у нашых блізкіх суседзяў, сяброў-беларусаў: у іх 100-працэнтная інфляцыя. Чаму? Таму што трэба своечасова рэформы рабіць». Хуткі інтэграцыйны рух палітолагі тлумачаць блізкімі прэзідэнцкімі выбарамі ў Расіі. І Пуцін, які збіраецца балатавацца ў прэзідэнты, у гэтым маштабным эканамічным і палітычным праекце выступае як вялікі правіцель, што збірае землі імперыі.

Для Беларусі еўразійская эканамічная інтэграцыя пакуль не набыла характар незваротнасці, і разварот у бок ЕС цалкам магчымы, але ўмовы для гэтага з серыі нерэальных. З паступовым уцягваннем у азіяцкі саюз краіна, якая мае еўрапейскую гістарычную і культурную спадчыну, ад Еўропы будзе дыстанцавацца і калі не ісці азіяцкімі дарогамі, то заставацца ў цяперашнім падвешаным стане краіны на раздарожжы.

У Еўропе праект стварэння Еўразійскага саюза сустрэлі з насцярогай і нават загаварылі аб спробе адрадзіць пад новай шыльдай СССР. «Грамадствы краін ЕС бачаць іншы, альтэрнатыўны праект. Гэта акажа ўплыў на грамадства краін былога камуністычнага блока, можа паўплываць і на рускамоўнае насельніцтва краін Балтыі. Еўразійскі блок разбурае адзінства ЕС. Ён спрыяе расколу таварыстваў Еўропы: гэта дадатковая карта еўраскептыкаў», — цытуе інфармацыйнае агенцтва «Delfi» выкладчыка Інстытута міжнародных адносінаў і палітычных навук Віленскага ўніверсітэта Нерыюса Малюкявічуса.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ПАДАТКІ ТАКСАМА РАСТУЦЬ

**Віцебскі гарадскі савет дэпутатаў прыняў рашэнне павялічыць з 2012 года стаўкі падатку на нерухомасць і зямельнага падатку на тэрыторыі горада.**

Паводле гэтага рашэння, падатак на нерухомасць (у тым ліку падатак на нерухомасць на незавершанае будаўніцтва) для юрыдычных асоб узрасце ў 1,7 разы. Выключэнне складуць арганізацыі-фундатары алімпійскага камітэта Беларусі ў Віцебскай вобласці і футбольнага клуба «Віцебск» — для іх падатак павялічыцца ў 1,5 разы.

Для фізічных асоб падатак за жылыя дамы, надворныя пабудовы і іншыя будынкі і збудаванні будзе павялічвацца дыферэнцавана, у залежнасці ад іх ацэначнага кошту і з улікам каэфіцыента якасці асяроддзя і тыпу населенага пункта па стане на 1 студзеня 2012 года.

Калі ж дамы ці любыя будынкі, што належаць фізічным асобам, прызначаны і (ці) выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, то падатак на нерухомасць павялічваецца ў 2 разы незалежна ад кошту пабудовы.

Зямельны падатак для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў павялічыцца ў 1,5 разы, а для фізічных асоб — у 1,7 разы.

**Паводле «Народных навін Віцебска»**

### ЦІ З'ЯВІЦЦА АРХЕАЛАГІЧНЫ ЗАПАВЕДНІК?

**Стварыць археалагічны запаведнік «Сярэднявечны Брэст» прапануюць брэсцкія актывісты Руху "За Свабоду".**

Такая прапанова была накіравана да мясцовых уладаў горада Брэст. Сябры руху прапануюць у Генеральным плане горада над Бугам пашырыць функцыянальную разнастайнасць мемарыяльнага комплексу Брэсцкая крэпасць.

Каардынатар брэсцкага рэгіянальнага аддзялення Руху «За Свабоду» Дзяніс Турчаняк патлумачыў неабходнасць напісання такога звароту: «Трэба пагадзіцца, што матэрыяльныя сведчанні, якія знаходзяцца ў зямлі, з'яўляюцца еўрапейскай археалагічнай спадчынай, а таксама крыніцай ведаў пра старажытную гісторыю. Неабходная ахова археалагічнай спадчыны павінна быць адлюстравана ў гарадскім планаванні. Мэта гэтай аховы — абарона археалагічнай спадчыны як крыніцы еўрапейскай калектыўнай памяці і прылады для гістарычных і навуковых даследаванняў».

Актывісты лічаць магчымым стварэнне археалагічнага запаведніка «Сярэднявечны Брэст» унутры знешніх абарончых валоў Брэсцкай крэпасці з мэтай захавання мемарыяльных сведчанняў у горадзе з амаль 1000-гадовай гісторыяй. Таксама грамадскія дзеячы прапануюць забараніць на месцы старога Брэста любое новае будаўніцтва.

**Паводле Радыё «Рацыя»**

КАМПАНІЯ

## «ХОПІЦЬ КАРМІЦЬ РЭЖЫМ!»

**Зарэгістраваны ў Чэхіі Малады Фронт распачынае кампанію пад назвай «Хопіць карміць рэжым».**




«Мы прааналізавалі выпадкі, калі беларусы проста ад добрай душы ды ад пустога гаманца спансуюць рэжым Лукашэнкі на мільёны, а бывае і мільярды долараў», — каментуюць моладзевыя актывісты сваю ініцыятыву.

Першая стадыя дадзенай кампаніі — адмова ад радыёкропак, якія слухаюць адзінкі, але плацяць усе.

Па горадзе Мінску — 617 000 радыёкропак — гэта роўна столькі, колькі ва ўсіх астатніх абласных цэнтрах рэспублікі. Калі груба скласці — гэта дзесьці 1 мільён 200 тысяч радыёкропак. Плюс «Белтэлекамаўскіх» крыху больш — 1 мільён 375 тысяч. Калі скласці, то атрымліваецца дзесьці 2,5 мільёна на 10 мільёнаў насельніцтва — гэта інфармацыя з вуснаў намесніка начальніка па эксплуатацыі «Беларускага радыётэлевізійнага перадаючага цэнтра».

Мы рэгулярна аддаём дзяржаве 850 рублёў за радыёкропку — менавіта такая сума прыходзіць нам у «жыроўках» штомесяц. Па сённяшнім курсе долара атрымліваецца, што за гэтую паслугу мы плацім 3 мільёны долараў на год. Яшчэ некалькі месяцаў таму, калі афіцыйны курс долара быў 3 тысячы рублёў, а паслуга каштавала тыя ж 800 з нечым рублёў, то прыбытак Перадаючага цэнтра складаў недзе 8,5 мільёнаў долараў на год.

«Але ёсць магчымасць абсалютна легальна адключыцца ад радыёкропкі. Дастаткова напісаць заяву з адмовай без указання прычынаў, звярнуцца ў мясцовы «цэнтр» і... здабыць трошку больш свабоды для сябе і сваёй сям'і. А галоўнае — перастаць бяздумна спансаваць рэжым», — прапануюць маладафронтаўцы.

**Паводле інфармацыі прэс-службы МФ**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## СКАНДАЛЬНЫ РЭЙД У КРУПКАХ

**У Крупках, дзе 18 і 19 лістапада сталічная міліцыя беспрычынна збіла некалькі дзясяткаў чалавек, прайшлі суды. Затрыманыя атрымалі штрафы 700 тысяч рублёў.**

Міліцыя правяла «зачыстку» двух мясцовых клубаў. Адмыслова для гэтага разам з праваахоўнікамі прыехаў нават аўтазак. Паводле словаў сведак і пацярпелых, амапаўцы ў чорнай форме ўрываліся ў клубы і загружалі ў аўтазак усіх, хто ім не падабаўся. «Зачыстка» працягвалася, пакуль былі месцы ў аўтазаку.

«Мы сядзелі ў клубе з пляменнікам і дачкой, раптам запалілася святло, і я пачуў гук удару. Азіраюся, а там такі здаровы амапавец ударыў хлопца ў твар, ад чаго той адляцеў і галавой рассек нейкай дзяўчыне брыво, потым чаго хлопца забралі. Забіралі людзей без усялякага прынцыпу — проста тых, хто не спадабаўся. Ніякай там бойкі не было, і п'яных асабліва таксама, яны хапалі ўсіх, хто блізка быў. Атрымліваецца, зараз ні нам, ні дзецям нашым нават схадзіць на дыскатэку нельга! Як увогуле далей жыць?» — абураецца Аляксандр, сведка падзеяў.

Былому міліцыянту Руслану пашанцавала менш: «Мы з сябрамі выйшлі з дыскатэкі ды пайшлі ў краму купіць папіць. За намі зайшлі каля 20 амапаўцаў. У краме стала цесна, і хтосьці выпадкова штурхнуў аднаго з іх. Яны пачалі крычаць на чалавека і пагражаць яму. Я зрабіў заўвагу, нагадаўшы пра дырэктыву прэзідэнта «Аб ветлівым звароце да грамадзян». Тады яны мяне скруцілі ды кінулі ў аўтазак».

Пасля гэтага ў пастарунку амапаўцы пагражалі Руслану згвалтаваць дубінкай і збівалі затрыманых з ім сяброў. Паводле рапарту, Руслан напаў на 20 амапаўцаў, лаяўся на іх матам і г. д.

Малады чалавек зазначае, што мясцовыя міліцыянты самі баяліся гасцей са сталіцы: «Ды яны ўвогуле пры іх шэптам размаўлялі. Капітан да гэтага сяржанта (амапаўца) падыходзіў і казаў: дазвольце звярнуцца...»

Паводле Мінгарвыканкаму, гэта была прафілактычная акцыя, накіраваная на перадухіленне правапарушэнняў. «Насамрэч гэтая «прафілактычная акцыя» проста паказала тую неабмежаваную ўладу, якая цяпер у руках міліцыі, і прадэманстравалі такі ўзаконены гвалт. Гэта агульная тэндэнцыя, якая зараз ідзе ў краіне, — нармальная з'ява для паліцэйскай дзяржавы», — каментуе рэйд міліцыянтаў праваабаронца Уладзімір Лабковіч.

Праваабаронцы заклікаюць усіх пацярпелых і незаконна асуджаных звяртацца ў суд з абскарджаннем прысудаў. Праваабарончы цэнтр «Вясна» прапаноўвае сваю дапамогу ў напісанні скаргаў і заяваў да дзеянні міліцыі.

**Паводле інфармацыі Руху «За Свабоду»**

ЗВАРОТ

## МАЦІ ПРОСІЦЬ ВЫРАТАВАЦЬ СЫНА

**Генадзь КЕСНЕР**

**Любоў Кавалёва, маці Уладзіслава Кавалёва, якога абвінавачваюць у спрычыненасці да выбуху на станцыі метро «Кастрычніцкая» ў Мінску 11 красавіка, просіць грамадскасць абараніць яе сына ад смяротнага пакарання.**

Прыгаварыць да расстрэлу фігурантаў справы Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва запатрабаваў пракурор Аляксей Стук.

На спецыяльным сайце ў інтэрнэце размешчаны зварот Любові Кавалёвай, дзе гаворыцца: «Калі ласка, дапамажыце ўратаваць майго сына ад смяротнага пакарання».

Варта адзначыць, што большасць спецыялістаў і незалежных назіральнікаў, а таксама адвакаты лічаць, што віна Канавалава і Кавалёва ў інкрымінаваных ім злачынствах з'яўляецца не даказанай. Такой жа думкі прытрымліваюцца нават некаторыя пацярпелыя ў выніку тэракта.

Беларусь на сённяшні дзень ёсць адзінай краінай на постсавецкай прасторы і на кантыненце ўвогуле, дзе выносіцца і прыводзяцца ў выкананне смяротныя прысуды. З гэтай прычыны Беларусь — адзіная краіна ў нашай частцы свету, якая не з'яўляецца сябрам Савета Еўропы.

Падтрымаць Любоў Кавалёву і падпісацца за тое, каб у дачыненні да яе сына Уладзіслава не было прыменена смяротнае пакаранне, можна тут: http://www.change.org/petitions/the-supreme-court-of-the-republic-of-belarus-please-save-my-son-from-the-death-penalty

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

## БЕЗ ПАЛІТЫКІ

**Эла ДЗВІНСКАЯ**

**Новая кніга публіцыста Аляксандра Тамковіча «Без палітыкі» была прэзентавана чытачам у галерэі «Ў».**




Трыццаць шэсць персонаў, сярод якіх Аляксандр Мілінкевіч, Анатоль Лябедзька, Алег Волчак, Міхаіл Чыгір, Ніна Стужынская, Аляксандр Дабравольскі і іншыя, шчыра апавядаюць пра свае захапленні ў юнацтве і ў сталыя гады.

Баскетбольныя перамогі Мілінкевіча, канькабежны спорт Гразновай, альпінісцкія шляхі Акудовіча, футбольныя турніры Лябедзькі, музычныя захапленні Стэфановіча і Дабравольскага, бурштын і сердалікі з мінералагічнай калекцыі Севярынца паказваюць іх больш аб'емна і неардынарна.

Самай чалавечнай кнігай з шэрагу апошніх выданняў назваў кнігу адзін з яе герояў — Уладзімір Ганчарык.

«Праз гутаркі і сустрэчы са мной прайшлі 300 чалавек, лёсы якіх адлюстраваны ў кнігах. У мяне ёсць на прыкмеце яшчэ як мінімум 70 асобаў, пра якіх хацелася б напісаць», — сказаў адзін з кіраўнікоў БАЖ і журналіст «НЧ» Аляксандр Тамковіч.

Падчас прэзентацыі Андрэй Хадановіч паведаміў, што за кнігу «Без палітыкі» аўтар узнагараваны прэміяй Алеся Адамовіча, заснаванай Беларускім ПЭН-цэнтрам у 1996 годзе.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

## ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

**ЭЛЬДАР — кот мары!**

Аграмадны, пухнаты, мяккі і з цудоўным характарам коцік! Дагэтуль незразумела, як яго можна было здаць у пункт адлову?

Але зараз Эльдар пад апекай валанцёраў і чакае гаспадара, няздольнага на здраду.

Коцік спакойны, ласкавы, камунікабельны! Кастрыраваны і прывучаны да латку.

Калі вы не абыякавыя да лёсу гэтага пухнатага цуда, тэлефануйце: 8-029-699-30-47 (Вольга)



## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НАЗАД НА ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ?

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Іншым часам словы кіраўніка дзяржавы выклікаюць нейкае непаразуменне. З аднаго боку, ён заклікае не вяртацца ў «ліхія 1990-я», а з іншага — не супраць, калі б мы вярнуліся на 10 гадоў у мінулае. Быццам яму невядомая і прыказка пра тое, што ў адну раку двойчы не ўвойдзеш.**

22 лістапада на нарадзе па праектах прагнозу, бюджэту і асноўных кірунках грашова-крэдытнай палітыкі на 2012 год ён выступіў супраць паўтору «шокавай тэрапіі» 1990-х гадоў. «Але прапаноўваць тую шокавую тэрапію, якую яшчэ ў 1990-я гады ўсе мы праходзілі, і на чым апякліся тады і мы, і нашы суседзі, сёння недазвольна, — цытуе дзяржаўнае агенцтва БелТА. — Калі тады ў нейкай ступені такая палітыка была даравальная, таму што знаходзіліся пад уплывам рознага кшталту заходніх фондаў і экспертаў, даверыліся ім, не разумеючы рэальных наступстваў, то зараз нельга наступаць на тыя ж граблі».

«Нельга забываць, што эканоміка не замыкаецца толькі на бізнэсе і не абараняе інтарэсы толькі камерсантаў», — заўважыў Лукашэнка. Тым жа часам, ён заявіў, што яго сур'ёзна непакоіць тое, што ўрад занадта захапіўся рынкавымі рэформамі і «спрабуе — думаю, па неразуменні, — змяняць палітыку і прагрмныя ўстаноўкі, прынятыя на чацвёртым Усебеларускім народным сходзе».

Сёння, паводле слоў Лукашэнкі, патрабуецца «глыбокі аналіз цяперашняй сітуацыі, для таго каб будаваць планы не на пяску, а на рэальнай глебе». «На жаль, — зазначыў ён, — нават беглае азнаямленне са статыстыкай паказвае, што прагноз гэтага года не будзе выкананы. І па прамысловасці, сельскай гаспадарцы, будаўніцтву жылля, і па мадэрнізацыі ёсць шмат праблем. І што найбольш трывожна — пагоршыўся дабрабыт людзей, па якіх балюча ўдарыла інфляцыя. Адкінуўшы наяўную практыку рэгулявання цэн і іншых эканамічных працэсаў, мы атрымалі негатыўныя вынікі і сур'ёзныя праблемы, для вырашэння якіх зараз трэба траціць дадатковыя намаганні і сродкі».

> Усё больш і больш узнікае ў Беларусі страйкаў, на якіх працоўныя дамагаюцца выканання сваіх патрабаванняў. Вось і на мінулым тыдні ў рэгіёнах страйкавалі даяркі

Звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Усе мы пачалі наракаць на ўрад. Але хачу, каб усе, хто сядзіць за гэтым сталом, сталі побач з урадам і прынялі на сябе долю той крытыкі, якая была яму адрасаваная. У нас урад не з'яўляецца нейкім адасобленым органам, які праводзіць тую палітыку, якая яму ўздумаецца. Усе мы датычныя да той палітыкі, якая праводзілася і праводзіцца».

Сваёй прамовай кіраўнік дзяржавы нейяк «адасобіў» сябе і ад крытыкаў, і ад урада. Але, калі ўзгадаць ягоныя словы, што ён прэзідэнт і адказвае ў Беларусі за ўсё, што ў ёй адбываецца, — як тут можна адасобіцца? Гэта ён зняў Сідорскага і Пракаповіча, гэта ён нарakaў на валютны крызіс, быццам бы яго зрабілі спекулянты і аўтааматары, гэта ён перманентна казаў, што «вось-вось, і крызіс скончыцца сам сабой». Але «само сабой» нават кацянё не нараджаецца, а валютны крызіс урэшце, без захадаў па ягонай ліквідацыі, перарос у валютна-эканамічны.

Усё больш і больш узнікае ў Беларусі страйкаў, на якіх працоўныя дамагаюцца выканання сваіх патрабаванняў. Вось і на мінулым тыдні ў рэгіёнах страйкавалі даяркі. Патрабавалі падвышэння заробка. Старшыня СВК «Хаціслаўскі», дзе гэта адбывалася, заробкі адразу ж падняў, і заявіў, што работнікам фермы проста «не паспелі паведаміць» пра новую стаўку аплаты працы. Зараз прадпрымальнікі сталічнага Чэрвеньскага рынку абвясцілі перадзабастовачны стан. І чым далей — тым больш будзе такіх выпадкаў.

Але замест таго, каб вырашаць надзённыя пытанні, нам прапануюць адысці гадоў на 10 назад.

Хто-небудзь яшчэ памятае пра «адзіную валюту»? Саюзнай дзяржавы? Пра расійскі рубель у якасці адзінага плацежнага сродку? Усе амаль забыліся. Але Лукашэнка памятае! Аляксандр Лукашэнка не выключае, што адзінай валютай у Еўразійскім саюзе стане расійскі рубель.

«Магчыма, вырулім і на расійскі рубель — калі ён будзе для ўсіх цікавы. А ў яго вельмі шмат складнікаў для таго, каб уяўляць для ўсіх цікавасць», — заявіў беларускі кіраўнік у інтэрв'ю праграме «Вести в субботу» тэлеканала «Россия» пасля завяршэння 18 лістапада ў Маскве саміту Расіі, Казахстана і Беларусі.

Паводле слоў Лукашэнкі, на сустрэчы кіраўнікоў трох дзяржаў гаворка не ішла «пра тэнге, беларускі рубель ці расійскі». «Але вельмі настойліва і, магчыма, некалькі занадта настойліва я на гэтым даўно ўжо настойваю: давайце пяройдзем у нашых разліках на нацыянальную валюту. Давайце на расійскі рубель», — заявіў беларускі кіраўнік.

Здаецца, тады былі пытанні, дзе будзе эмісійны цэнтр. Беларусь настойвала на двух: у Маскве і Мінску. Але ж Масква на такое не пагадзілася. І Пуцін выказаўся пра «мух і катлет», што надоўга сапсавала адносіны Беларусі і Расіі.

У 2012 годзе цана расійскага газу для Беларусі можа скласці крыху больш за 150 долараў за тысячу кубаметраў, а з 2013 года яго цана будзе прывязаная да ўнутрырасійскай».

Цана, якая абмяркоўваецца, на 2012 год — крыху больш за 150 долараў за тысячу кубаметраў. «Яшчэ пару тыдняў таму» абмяркоўваўся дыяпазон у 150–190 долараў, зазначыў супрацоўнік групы «Газпрам». Прагноз сярэдняй цаны ў Расіі на гэты год — каля 99 долараў без ПДК, на 2012-ты — 106–107. Які рэгіён Расіі будзе ўлічвацца ў формуле з 2013 года, крыніцы «Ведомостей» не раскрываюць, толькі ўдакладняюць, што гэта не Смаленская вобласць, на якую хацеў арыентавацца Мінск. Да названай цаны будуць дадавацца расходы «Газпрама» на транспарт, захоўванне і рэалізацыю, а ў наступныя гады — будзе рабіцца індэксацыя, напрыклад, на ўзровень інфляцыі, паведамілі крыніцы. Па сутнасці, гэта будзе новая цэнавая зона Расіі, зазначыў адзін з іх.

Нічога не нагадвае? 10 гадоў таму Расія таксама пастаўляла Беларусі газ па ўнутрырасійскаму кошту. Але ж тады мы толькі гандляваліся за «Белтрансгаз», і мытная пошліна на нафту і газ цалкам заставалася ў Беларусі. Зараз мыта ідзе ў Расію, а «Белтрансгаз» амаль прададзены.

За што яшчэ мы будзем гандлявацца?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІКАЛАЙ АЎТУХОВІЧ



Ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч у турме абвясціў галадоўку. Падставай для такога кроку стаў ціск, які адміністрацыя Івацэвіцкай калоніі аказвае на асуджанага за тое, што Аўтуховіч не ідзе на супрацоўніцтва з кіраўніцтвам папраўчай установы і дапамагае іншым асуджаным змагацца за свае правы.

16 лістапада нібыта за непадпарадкаванне Аўтуховіча змясцілі ў штрафны ізалятар. На знак пратэсту Мікалай абвясціў галадоўку.

Аўтуховіча асудзілі на 5 гадоў і 2 месяцы калоніі строгага рэжыму за знойдзеныя ў яго 5 патронаў. Першапачаткова ваўкавыскага прадпрымальніка абвінавачвалі ў падрыхтоўцы тэракту і падпалах маёмасці службовых асобаў.

### АЛЯКСЕЙ ЯНУКЕВІЧ



Партыя БНФ пачынае бестэрміновую кампанію супраць уваходжання Беларусі ў Еўразійскі эканамічны саюз. «Таксама партыя выступае супраць удзелу Беларусі ў такіх аб'яднаннях, як Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, АДКБ, ЕўраАзЭС, Мытны саюз, бо яны супярэчаць нацыянальным інтарэсам Беларусі», — заявіў лідар Партыі БНФ Аляксей Янукевіч.

У прынятай партыяй адмысловай заяве адзначаецца, што «авантурная і эканамічна непісьменная палітыка ўладаў прывяла да зневажальнай здачы часткі нацыянальнага, палітычнага і эканамічнага суверэнітэту на карысць так званых наднацыянальных інтэграцыйных органаў, цалкам кантраляваных Расіяй».

«Далейшае паглыбленне інтэграцыйных працэсаў, прадугледжанае падпісанымі 18 лістапада дакументамі, пагражае поўным знішчэннем незалежнасці нашай дзяржавы, растварэннем Беларусі ў будучыні Еўразійскім саюзе, які ў заявах часткі расійскай палітычнай эліты расцэньваецца не інакш як «вялікая дзяржава руская народа», — гаворыцца ў заяве.

Партыя БНФ лічыць, што ўваходжанне Беларусі ў Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам стала адным з галоўных складнікаў комплекснага сацыяльна-эканамічнага крызісу і масавага збяднення грамадзян у 2011 годзе. «Уваходжанне з 1 студзеня 2012 года ў Адзіную эканамічную прастору з гэтымі ж дзяржавамі непазбежна выкліча далейшае пагаршэнне эканамічнага і сацыяльнага становішча, смерць нацыянальнага бізнэсу і дэіндустрыялізацыю краіны», — адзначаецца ў заяве.

Акрамя таго, Партыя БНФ упэўненая, што ўдзел Беларусі ў еўразійскай інтэграцыі адмоўна паўплывае на перспектывы інтэграцыі краіны ў сусветную эканамічную і палітычную прастору, а таксама абмяжуе магчымасці яе ўдзелу ў агульнаеўрапейскіх праектах, такіх, як Усходняе партнёрства, што супярэчыць нацыянальным інтарэсам краіны.

### БЕРНАРД ШТАНГЭ

Галоўны трэнер беларускай футбольнай зборнай Бернард Штангэ завяршыў сваю працу ў Беларусі і вяртаецца на радзіму «з чыстым сумленнем». «На жаль, мы не змаглі выканаць задачы, пастаўленыя федэрацыяй, камандай, трэнерскім штабам і кожным асобным гульцом, для многіх з якіх гэта быў апошні шанец патрапіць на вялікі турнір. І з гэтага пункту гледжання мы расчараваныя», — цытуе словы нямецкага спецыяліста БелаПАН.

«Уся праца была цяжкай, — адзначыў Бернард Штангэ. — Самым складаным было тое, што я вырашаў задачы, звязаныя не толькі з падрыхтоўкай нацыянальнай каманды. У вялікіх федэрацыях, як у Германіі, ёсць людзі, якія адказваюць за пытанні, якімі займаўся тут я. Калі б у нашай федэрацыі было больш людзей, у мяне было б больш часу на наведванне футбольных клубаў і працу з трэнерскім штабам».

Паводле слоў Штангэ, у Беларусі шмат маладых таленавітых трэнераў, і справа федэрацыі — вырашыць, хто будзе ўзначальваць зборную. «Адзінае, вам патрэбен трэнер з харызмай і агнём, які верыць, што можна дамагчыся амаль немагчымага, — маркуе нямецкі спецыяліст. — Іспанія і Францыя (саперніці беларускай зборнай у кваліфікацыі ЧС-2014) — гэта амаль немагчымае, але патрэбныя людзі з харызмай, якія паспрабуюць гэтага дамагчыся, з новай энергіяй і сілай».



АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# КАНЕЦ ЗНАЁМАГА СВЕТУ

Сяргей НІКАЛЮК

**Не варта разглядаць хуткі фінал беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі праз прызму эсхаталогіі (сістэму рэлігійных поглядаў пра канец свету).**



Усіх нас можна павіншаваць. Вы спытаеце, з чым? У Беларусі *«закончился разбой»*. Пра гэта 15 лістапада афіцыйна абвясціў «адзіны палітык» (АП). Але і гэта яшчэ не ўсё. Зацверджаны новы дэвіз, пад якім у найбліжэйшы час давядзецца працаваць ураду. Упэўнены, што знайсці яго аналаг у найноўшай гісторыі будзе не так проста. Тым не менш, дэвіз не высмактаны з пальца і не ўзяты са столі. Ён «ад жыцця», а якое ў нас сёння жыццё — не мне распавядаць чытачам «НЧ». Увіце сабе расцяжку над галоўным праспектам Мінска і на ёй чорным па белым: *«Давайте потихонечку выруливать, хватит издеваться над людьми и наклонять их»*.

Уменне знайсці патрэбнае слова і кінуць яго ў масы — вось што адрознівае сапраўднага палітыка! Звярніце ўвагу: ніякай мітусні і спеху. Вырульваць прапануецца *«потихонечку»*, і гэта правільна. Мы 17 гадоў рухаліся ўласным курсам, арыентуючыся па вехах, расстаўленых Усебеларускімі народнымі сходамі. Ці варта пасля гэтага дзівіцца, што *«сегодня уже всех начинает трясти»*.

У паліталогіі ёсць такое паняцце — «крок навізны». Здольнасць грамадства адаптавацца да інавацый, якія сыходзяць ад улады, мае сваю мяжу (крок). Калі ўлада пачынае крочыць занадта шырока, дык грамадства можа і не паспець за ёй (узгадаем шаха Ірана з яго праграмай радыкальных рэформаў). І тады ў зазор, які ўтварыўся, скіроўваюцца падазроныя асобы з «пятай калоны» і іншых сумненых структур, актыўна падкормленых Захадам.

## Гаспадаркі без гаспадароў

У папярэдняй «Азбуцы паліталогіі» я выказаў асцярогу, што спроба ўрада рэфармаваць беларускую эканоміку натыкнецца на супраціў прадстаўнікоў «большасці», не здольнай выжыць у рынкавых умовах. Не паспеў высахнуць атрамант пад такім нетрывіяльным сцвярджэннем, як працэс супраціву, што называецца, «пайшоў». Яго ініцыяваў сам АП: *«Если вы* (чальцы ўрада) *не согласны с тем, что я говорю, давайте всех вас переведем на жизненные устои, те рельсы, по которым движется сегодня небогатая часть населения, а у нас это большинство населения. Попробуйте вы пожить в этих условиях. Вот тогда вы, видимо, поймете, что такое чистый рынок и как мы в этой ситуации должны действовать»*.

У якасці каментара не магу ў чарговы раз не працытаваць журналіста Станіслава Мініна: «Язык нашай улады ўладкаваны так, каб служыць прыладай самавыкрыцця». У 2006 годзе, збіраючыся ў трэці раз заняць прэзідэнцкае крэсла, АП паабяцаў беларусам за найбліжэйшыя пяць гадоў *«довести качество жизни наших граждан до уровня, сравнимого с западноевропейским»*. Пяць гадоў прайшло, і што мы маем? А маем мы квітнеючую краіну, у якой небагатая частка насельніцтва складае большасць.

Але рушым далей па прыступках «Азбукі паліталогіі». У жніўні 2010 года, ладзячы публічны разнос ураду, АП выкрыў прэм'ер-міністра (Сяргея Сідорскага) у яго імкненні паклапаціцца пра інтарэсы людзей: *«Я политик, я должен думать о людях, а вы должны думать об экономике и финансах. У вас людей нет. Забудьте! В экономике люди не стоят за деньгами и за тракторами. Вы голый экономист. Вы должны приходить с министром финансов ко мне и бороться за каждый рубль, за каждую копейку. И это я должен говорить, что там за ними стоят люди»*.

Адкрыем Вікіпедыю: «Эканоміка — гаспадарчая дзейнасць грамадства, а таксама сукупнасць адносін, якія складваюцца ў сістэме вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання».

Веды, што чэрпаюцца поўнай лыжкай з сусветнага павуціння *(«мировой помойки»)*, дазваляюць нам зразумець галоўную асаблівасць беларускай эканамічнай мадэлі ў яе афіцыйнай трактоўцы. Гэта гаспадарчая дзейнасць, якая не прадугледжвае наяўнасці масавага суб'екта дзейнасці, гэта сукупнасць адносін, але не аўтаномных асобаў, а залежных ад дзяржаўнай апекі ўтрыманцаў.

## Дзяржава, якая пачала бачыць

Дзве цытаты, што супярэчаць адна адной, вяртаюць нас да асноўнай праблемы беларускага грамадства — да расколу. Раскол спараджае ланцужкі «кульгавых рашэнняў». Зразумець іх прыроду нескладана. З часоў электаральнай рэвалюцыі 1994 года ўлада галоўным чынам абапіраецца на прадстаўнікоў небагатай большасці, сярод якіх пераважаюць тыя, хто пражывае ў невялікіх гарадах і ў сельскай мясцовасці, а таксама пажылыя людзі з нізкім узроўнем адукацыі. Яны здольныя «правільна» галасаваць, але не здольныя эфектыўна працаваць, таму аднабаковая апора на большасць скончылася тым, што *«всех начинает трясти»*.




Займеннік «усіх» у дадзеным выпадку вызначаецца па формуле: «большасць + меншасць».

Інфляцыйная хваля, якая накрыла Беларусь, спароджаная спробамі накарміць большасць эмісійным хлебам. Іншага хлебу ў распараджэнні ўлады не засталося: датацыйная расійская крыніца прыкметна змялела, а крэдытораў, гатовых фінансаваць мясцовыя пякарні, знайсці сёння не так проста. У сітуацыі, якая склалася, улады вымушаныя абаперціся на меншасць, што і паспрабаваў зрабіць урад, распрацоўваючы план па стабілізацыі эканомікі на 2012 год.

Перанос апоры на меншасць азначае фармаванне рынкавага асяроддзя. Вось як гэты працэс апісвае аглядальнік «*Советской Белоруссии*» Ірына Юзвак: «Дырэктыва №4 стала знакам, што дзяржава ўбачыла ў прыватным бізнэсе сур'ёзнага партнёра». Для разумення прычын, якія прымусілі дзяржаву пачаць бачыць, я звярнуся да яшчэ адной цытаты. Яе аўтар — даўні прыхільнік кіраўнічых талентаў АП, эксміністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын: «Пакуль не ўзнікаюць рэальныя праблемы, палітыкі не гатовыя прымаць рашэнні, адцягваюць іх, гуляюць у папулізм». У савецкі час з аналагічнай нагоды газета «Праўда» пісала, што «імперыялісты адцягваюць свой канец».

2011 год стаў для беларускай улады годам усведамлення рэальнасці праблем. Папулізм у маштабах краіны — задавальненне не з танных. Колькі разоў ні паўтарай «халва» («беларуская эканамічная мадэль развіцця»), у роце ад гэтага саладзей не стане. Сучасны эканамічны рост забяспечваецца за кошт прыватнай ініцыятывы. У Еўропе гэта ўсвядомілі ў другой палове XVII стагоддзя, у Беларусі — увосень бягучага года. Але не варта цешыцца. Логіка «кульгавых рашэнняў» яшчэ не раз і не два адмовіць прыватнаму бізнэсу ў праве на ролю «сур'ёзнага партнёра» дзяржавы.

Для развіцця прыватнай ініцыятывы патрэбная «моцная дзяржава», але не ў прынятым у нас сэнсе, калі практычна кожны можа быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за тое, што спраўляў малую патрэбу ў пад'ездзе. Сіла сучаснай дзяржавы вымяраецца найперш праз здольнасць забяспечыць роўнасць усіх перад законам.

Мы жывём у дзяржаве, у якой кандыдат у прэзідэнты сярод белага дня можа быць збіты «людзьмі ў чорным» у прысутнасці супрацоўнікаў ДАІ. Кандыдат у прэзідэнты — гэта ж не прадстаўнік сілавых структур, афіцыйна залічаных у Беларусі ў шэраг недатыкальных. Прывяду адпаведную цытату з дакладу на IV Усебеларускім народным сходзе: *«Я никому не позволю, чтобы хоть волосок упал с головы военного человека, милиционера, чекиста или сотрудника спецслужбы, которые худо-бедно обеспечили нам спокойную жизнь»*. Нам — гэта каму? Так і хочацца ўслед за персанажам культавага савецкага фільма папрасіць агучыць увесь спіс. Цікава, кандыдаты ў прэзідэнты ў гэтым спісе ёсць, ці іх прозвішчы занесеныя ў іншы спіс, складзены непасрэднымі начальнікамі «людзей у чорным»?

## Плюсы і мінусы канкурэнцыі

Нядаўна я сустрэў выдатнае выказванне амерыканскага сацыёлага Эмануіла Валерстэйна: «Надышоў канец знаёмага свету». Звярніце ўвагу: не канец свету як такога, пра што рэгулярна абвяшчаюць шматлікія клікушы, а менавіта знаёмага свету. Наш варыянт знаёмага свету 17 гадоў выбудоўваўся пад дыктоўку тых, хто з трох спосабаў стаўлення да жыцця (пасіўнага прыстасавання, уцёкаў і актыўнага засваення) аддаваў перавагу першаму.

Знаёмы нам свет — гэта свет, выбудаваны па вертыкалі. Такая канструкцыя паўстала не праз чыйсьці асабісты капрыз, а ў сувязі з дэфіцытам у беларусаў досведу калектыўнага салідарнага дзеяння. У патрыярхальнага калектывізму ўсходніх славян (талокі) — кароткі радыус даверу. За межы вёскі, г. зн. кругу людзей, якія ведаюць адзін аднаго асабіста, такая форма калектывізму не распаўсюджваецца. Таму напачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, калі *«власть оказалась в грязи»*, беларусы даручылі падняць яе «моцнай асобе», зняўшы тым самым з сябе адказнасць за лёс краіны, а заадно і за свой асабісты лёс.

Галоўная задача вертыкалі — пераразмеркаванне рэсурсаў з мэтай забеспячэння прымітыўнай (патрыярхальнай) роўнасці. Смяротны вораг падобнага тыпу роўнасці — канкурэнцыя. Сёння ў цэнтры ўвагі апынулася інтэграцыйная ініцыятыва расійскага прэм'ер-міністра. Звярніце ўвагу на два ўзаемавыключальныя погляды на перавагі будучых удзельнікаў Еўразійскага саюза. Калі Пуцін кажа пра магчымасці адкрытага рынка, для атрымання якіх «бізнэсу давядзецца працаваць над сваёй эфектыўнасцю, змяншаць выдаткі, укладваць рэсурсы ў мадэрнізацыю», то для АП Еўразійскі саюз — гэта вотчына дзяржаўных манаполій: *«Зачем искусственно насаждать дублирующие производства там, где спрос может быть удовлетворен с гораздо меньшими затратами и на высоком уровне качества действующими предприятиями? Разве мы не проигрываем от конкуренции друг с другом на внешних рынках? Вместо такого «самоедства» по уму надо бы создать все условия для появления на нашем пространстве мощных конкурентоспособных транснациональных корпораций и их выхода на рынки третьих стран»*.

Няўхільнасць канца знаёмага свету, у якім улада абапіраецца на неканкурэнтаздольную большасць, адчуваецца ўсё выразней. Надзеі на транснацыянальныя карпарацыі ілюзорныя. Іх узровень канкурэнтаздольнасці не можа быць вышэй узроўню канкурэнтаздольнасці грамадства і ўлады.

ІНТЭГРАЦЫЯ

# РУБЕЛЬ ПАМРЭ, СУВЕРЭНІТЭТ ТАКСАМА

Вольга ХВОІН

**Яшчэ ў красавіку кіраўнік краіны заяўляў, што ўвядзенне расійскага рубля ў якасці адзінай плацежнай валюты — «абсурд», месяц таму ён гаварыў, што як кіраўнік Беларусі не гатовы да такога кроку, а 19 лістапада паведаміў: «усё магчыма». Адзіная валюта на тэрыторыі Еўразійскага саюза для Беларусі свеціць здачай эканамічнага суверэнітэту, пасля чаго палітычная самастойнасць застаецца намінальнай.**




## Учора — не, сёння — так

Выказваючы меркаванне наконт магчымасці ўвядзення адзінай валюты ўнутры Еўразійскай эканамічнай прасторы, Лукашэнка адзначыў: «Усё магчыма, але спешка, непралічаныя варыянты могуць прывесці да таго, што сёння адбываецца ў Еўропе».

Лукашэнка сказаў, што ўжо даўно прапаноўвае перайсці ў разліках на расійскі рубель. «Давайце на расійскі рубель. Чаму разлічваючыся з вамі за сыравіну, за энерганосьбіты атрымліваем расійскі рубель, купляем долар і аддаём. Давайце пяройдзем на расійскую валюту, і сёння ваш прэзідэнт (Мядзведзеў) адназначна гэта падтрымаў. І прэзідэнт Назарбаеў таксама сказаў, што давайце хоць гандляваць у нацыянальных валютах і менш выкарыстоўваць амерыканскую валюту ў разліках, — адзначыў Лукашэнка, дадаўшы, што пасля можна будзе ўвесці разліковую адзінку. — Мы можам і да расійскага рубля прыйсці, калі ён будзе для ўсіх цікавы, у яго вельмі шмат складнікаў, каб мець цікаўнасць».

Паказальна, што яшчэ 4 лістапада, адказваючы на пытанні журналістаў, Лукашэнка заяўляў адваротнае. «Вы асабіста як грамадзянін гатовыя да таго, каб заўтра зрабілі адзіную валюту? Я як прэзідэнт не гатовы», — зазначаў Лукашэнка. Ён нагадаў, што гэтае пытанне ўжо абмяркоўвалася ў рамках Саюза Беларусі і Расіі. Паводле яго слоў, шмат было невыразнасцяў, на якія ніхто не мог адказаць. «Будуць роўныя ўмовы, мы будзем бачыць, да чаго гэта прывядзе, дык чаму б не стварыць на роўных умовах і адзіную валюту!» — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аднак ён падкрэсліў, што гэтае пытанне яшчэ падлягае абмеркаванню на ўзроўні экспертаў. «І потым, мы павінны быць перакананыя, што гэта не прывядзе да страты палітычнага суверэнітэту, што гэта не размажа, не размые нашу рэспубліку, — выказваўся Аляксандр Лукашэнка. — У гэтым не толькі мы зацікаўленыя, але і нашы партнёры».

## Нас чакае паглынанне

Што змянілася цягам менш чым аднаго месяца, і ці азначаюць апошнія выказванні, што кіраўнік Беларусі цяпер гатовы здаць частку эканамічнага суверэнітэту? Былы старшыня Нацбанку Беларусі Станіслаў Багданкевіч даволі сур'ёзна ставіцца да апошняй заявы Лукашэнкі. «Галоўная прычына ў тым, што цалкам знішчаныя масты палітычных і эканамічных адносінаў з Захадам, таму Лукашэнка здаецца на міласць Расіі, — разважае былы кіраўнік Нацыянальнага банка. — Раней ён балансаваў паміж Усходам і Захадам, а цяпер ідзе адкрыта пад сцягам Расійскай імперыі, гатовы здаць эканамічны суверэнітэт Беларусі, каб захаваць толькі свой фармальны суверэнітэт. І эканамічная палітыка аддаецца на водкуп Расіі.

З улікам падзей у ЕС цяпер яшчэ больш зразумела, што трэба захоўваць уласную валюту, пакуль не будзе цалкам нармалізаваная эканамічная палітыка. Аднак беларускія ўлады робяць адваротнае. Магчыма, гэтыя намеры звязаныя з тым, што ўрад Беларусі, Нацбанк, відаць, асэнсавана разбурылі беларускую грашовую сістэму, рубель беларускі абясцэніўся ў разы. І цяпер ім застаецца здацца больш моцнай эканоміцы Расіі».

Для дзяржавы пераход на супольную грашовую адзінку — справа не аднаго моманту, тым больш што эканомікі Беларусі і Расіі істотна адрозніваюцца. Цяпер жа і стабільнасць валют мае вялікі разрыў. У такіх умовах Расія атрымлівае проста стратную эканоміку, якую яна мусіць выцягнуць, каб увесці на тэрыторыі Беларусі расійскі рубель.

«Цяжка сказаць, колькі часу спатрэбіцца для пераходу на іншую валюту. Калі разважаць сыходзячы са здаровага сэнсу, то спачатку трэба дабіцца ўмацавання нацыянальнай валюты і толькі пасля гэтага тэхнічна можна перайсці на іншую валюту, у адваротным выпадку гэта невыгодна Расіі. Але, магчыма, дзеля паглынання Беларусі, яна гатовая пайсці на такія крок, затраціць пэўны рэсурс», — гаворыць Станіслаў Багданкевіч. Ён падкрэслівае, што ў цяперашніх умовах ніякай размовы аб парытэце быць не можа: «Пераход на расійскі рубель дазволіў бы паглынуць эканоміку Беларусі без перашкодаў. Увогуле, праблемы Беларусі не ў валюце, а ў адсталых тэхналогіях, нізкай канкурэнтаздольнасці, нізкай вытворчасці працы. Гэтыя глабальныя прычыны ніяк не вырашаюцца названым эканамічным саюзам».

## Не ўсё так гладка

Меркаванне аб тым, што Еўразійскі саюз нясе Беларусі эканамічныя выгоды, пакуль мала чым пацвярджаецца. Хіба што за саступкі ініцыятывам Крамля бліжэйшым часам паабяцалі даваць газ па танных коштах.

Расійскія «Ведомости» напісалі, што ў 2012 годзе расійскі газ можа патаннець для Беларусі амаль удвая, а з 2013 года яго кошт будзе прывязаны да ўнутрырасійскага. Кошт сыравіны будзе лічыцца па формуле, што ўлічвае кошт у адным з рэгіёнаў Расіі. Усё гэта плануецца да падпісання на ўзроўні міжурадавых пагадненняў і кантрактаў з «Газпрамам», заявілі «Ведомостям» чыноўнікі ва ўрадзе РФ і «Газпраме», знаёмыя з ходам перамоў. Цана на 2012 год абмяркоўваецца на ўзроўні крыху больш за 150 долараў за тысячу кубаметраў.

Фінансавы аналітык Сяргей Чалы да гэтых добрых намераў не раіць ставіцца як да канстанты. «Думаю, гэта ўсё ідзе пад расійскія выбары. І за нашу падтрымку Расія гатовая плаціць. Паглядзіце, нам паабяцалі рэвалюцыйную зніжку на газ на наступны год. А ў 2013 годзе быццам бы будзем разлічвацца па новаму тарыфу. Але не зразумела, чаму ў межах адзінай эканамічнай прасторы дзейнічаюць нейкія зніжкі, рознае цэнаўтварэнне для сябраў-краін гэтай АЭП», — падкрэслівае незавершанасць формы новаўтварэння Чалы.

Увогуле, атрымліваецца, што газ не такі ўжо і танны. «Зніжэнне коштаў на газ для Беларусі прывядзе да недаатрымання «Газпрамам» некалькіх мільярдаў долараў у год. «Газпрам» выкупляе рэшту акцый «Белтрасгаза» за 2,5 мільярда долараў. Узнікае пытанне: навошта? Варта памятаць, што «Газпрам» з моманту свайго стварэння з'яўляецца інструментам правядзення знешняй палітыкі Расіі, — адзначыў у часе анлайн-канферэнцыі на сайце finam.ru беларускі палітолаг і эканаміст Дзмітрый Балкунец.

«Беларусь — удзельнік інтэграцыйных пагадненняў з Расіяй і Казахстанам. Але Расія ў рамках Мытнага саюза зрабіла шэраг выключэнняў, у тым ліку па энергарэсурсах. Відавочна, калі размова ідзе пра фармаванне адзінай эканамічнай прасторы, то краіны павінны ахвяраваць нейкімі сваімі прынцыпамі і ствараць роўныя ўмовы для працы для краін-партнёраў. Напрыклад, Беларусь ахвяравала ўвазнымі пошлінамі на аўтамабілі, нягледзячы на тое, што дадзеная мера была выгодная толькі Расіі. Лічу, што калі размова ідзе аб працы краін-удзельніц у рамках адзінай эканамічнай прасторы, то краіны павінны пераходзіць на роўнадаходны прынцып цэнаўтварэння на энергарэсурсы», — патлумачыў Балкунец.

Паводле яго меркавання, магчыма, што зніжэннем коштаў на газ Расія спрабуе выратаваць беларускую эканоміку ад дэфолту. Калі кошты на газ для Беларусі будуць зніжаныя, то павелічэння коштаў на газ для насельніцтва не адбудзецца. Зніжаць кошты ўнутры краіны для насельніцтва ўрад наўрад ці будзе ў беларускіх умовах. Але ў мяне ёсць вельмі вялікія сумневы, што Расія проста так, нават нягледзячы на ўсю інтэграцыйную рыторыку і сяброўства народаў, істотна знізіць цану на газ для Беларусі і пазбавіць «Газпрам» некалькіх мільярдаў долараў.

«Тут не ўсё так гладка. Беларусь цяпер у цяжкім эканамічным крызісе. Хварэючы, краіна можа пайсці на любыя здзелкі, толькі б папраўіць сваё здароўе. Існуе варыянт, што ўзамен «Газпрам» можа атрымаць доступ да куплі некаторых беларускіх прадпрыемстваў. Хутка даведаемся, якая рэальная цана «зніжкі» і ў чым жа падвох», — падкрэслівае эканаміст.

Дырэктар Інстытута праблем глабалізацыі (Расія) Міхаіл Дзялягін гаворыць, што ў ствараемых эканамічных варунках «Расія атрымлівае магчымасць купіць многія беларускія прадпрыемствы (не толькі «Белтрансгаз») у ходзе прыватызацыі, у тым ліку і праз фармальна беларускія фірмы. Улічваючы працоўную і тэхналагічную культуру, не кажучы ўжо пра дыхтоўны менеджмент — гэта шмат, і плата адэкватная». Гэты ж момант — набыццё актываў прадпрыемстваў — Дзялягін называе ў шэрагу выгодаў, якія Расія атрымае ад арганізацыі АЭП. «Можам купіць карысныя актывы ў суседніх краінах і наладзіць вытворчасць сабе на выгаду. Грошай у Расіі шмат, а вытворчасць памерла. А ў Беларусі наадварот», — гаворыць эксперт.

## На ўзроўні дэкларацый

Вяртаючыся да магчымых выгодаў для Беларусі, варта паглядзець на статыстку знешнегандлёвага балансу цягам апошніх двух гадоў. Яна паказвае, што тавараабарот за студзень-верасень 2011 года ў працэнтах да студзеня — верасня 2010 года з усімі краінамі істотна павялічыўся. Выключэнне толькі Казахстан. Краіны СНД — 145,9%, краіны Мытнага саюза — 142,5%, Расія — 143,9%, краіны па-за СНД — 164,1%, Казахстан — 98,3%.

Паляпшэнне паказчыкаў па знешнегандлёвым сальда не ў апошнюю чаргу звязана з сёлетняй дэвальвацыяй рубля. Гэтыя працэсы ў выніку паставілі беларускіх экспарцёраў у выгодную пазіцыю, да ўсяго ў 2009 годзе ў сувязі з сусветным эканамічным крызісам знешні гандаль Беларусі моцна абваліўся, і таму статыстыка апошніх двух гадоў выглядае такой прывабнай.

Ці паспрыяе знешнегандлёваму абароту ўступленне Беларусі ў Еўразійскі саюз? — фінансавы аналітык Сяргей Чалы мяркуе, што высновы рабіць пакуль рана. «Цяпер усё на ўзроўні дэкларацый. Як і што будзе працаваць у адзінай эканамічнай прасторы, пакуль не зразумела. Усё гэта на аддаленую перспектыву», — разважае эксперт.

## КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ДАЙ ДУРНЮ ДОЛАР



**Згодна з прагнозам урада, інфляцыя ў наступным годзе не павінна перавысіць 22%. Гэта няшмат у параўнанні з бягучым годам, але нашмат болей, чым гэта бывае ў эканоміцы, якая імкнецца да стабільнасці.**

Ну чаму нам так не шанцуе! З горшага, што ўлады звычайна прагназуюць, усё збываецца, з лепшага не збываецца нічога.

Прыкладам, спецыяльнае паслабленне беларускага рубля адносна долара было зроблена, каб падвысіць экспарт і зменшыць імпарт. Інакш кажучы, каб болей зарабляць і купляць толькі тое, на што ёсць грошы. Як трапна адзначыў Андрэй Тур, каб жыць па сродках. А што ў выніку атрымалася?

Але ж дай дурню долар або нават расійскі рубель замест беларускага (у сэнсе зарабіць)… І ён імгненна губляе пачуццё рэальнасці. Не зважаючы, што мясцовы пакупнік збяднеў, бо яго набыткі дэвальвавалі, дурань пачынае перці ўсю прадукцыю на багатыя рынкі. Карацей, беларускае мяса, малако, птушку і птушыныя яйкі на злом галавы павезлі ў Расію. Як патлумачыла першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі Надзея Каткавец, на ўнутраным рынку рэалізацыя дае перапрацоўшчыкам малака ад 0 да мінус 5% рэнтабельнасці, у той час як экспарт — ад 17 да 35%. Але, на яе думку, менавіта знешняя выхазная рэнтабельнасць дапамагае вызначаць аптымальныя кошты для беларускага спажыўца. У перакладзе на звычайную мову гэта азначае: вы атрымаеце роўна столькі, колькі ў вас засталося грошай. А калі іх хапае толькі паслухаць спеў пеўняў?

Бо што такое 35% рэнтабельнасці? На гэта пытанне цікаўнаму чалавецтву некалі дакладна адказаў Карл Маркс. На яго думку, капітал пазбягае залішняга тлуму і сваркі і вызначаецца баязлівай прыродай. Гэта праўда, але не ўся праўда. «Капітал (а да яго належаць і беларускія перапрацоўшчыкі, якія атрымліваюць ільготныя эканамічныя рэсурсы за наш кошт, — К. С.) палохаецца адсутнасці прыбытку або зашмат малога прыбытку, як прырода палохаецца пустаты. Але ж калі маецца ў наяўнасці дастатковы прыбытак, капітал становіцца смелым. Забяспечце 10%, і капітал згодны на любое ўжыванне, пры 20% ён становіцца ажыўленым, пры 50%, натуральна, гатовы бегчы на злом галавы, пры 100% ён топча ўсе чалавечыя законы, пры 300% няма такога злачынства, на якое б ён не адважыўся нават пад страхам шыбеніцы. Калі тлум і сварка даюць набыткі, капітал пачынае спрыяць таму і другому. Доказы: кантрабанда і гандаль рабамі».

Хай мяне прабачаць за такую шматслоўную цытату, якую павінны ведаць усе эканамісты, але яе неабходна ўспомніць, каб дакладна адказаць на пытанне — хто атрымаў прыбыткі ад маштабнай дэвальвацыі беларускага рубля? Там, дзе было ў кішэні тры рублі, застаўся адзін. А то і не рубель, а ўсяго 10 капеек.

«Не бойся, хлопча, — казаў санітар пацыенту хірургічнага аддзялення — адрасцуць у цябе ногі… І нават хвост. Як у яшчаркі»… Той думаў: а навошта хвост? І ўсё ж пускаў носам бурбалкі ад задавальнення: калі абяцаюць, то і дадуць.

Людзей лёгка дзяліць на розныя групы паводле нейкіх прынцыповых якасцяў. Прыкладам, мужчыны і жанчыны, дурныя і разумныя, багатыя і бедныя, і гэтак далей. Зразумела, у дадзеным выпадку нас больш за ўсё цікавіць класіфікацыя, у аснову якой кладуцца грошы. Дык вось, мусіць, ці не з часоў Сакрата так пайшло, што самыя разумныя і мудрыя грошай не маюць. І наадварот. Прыкладам, Маркс, які, здаецца, ведаў пра грошы ўсё, быў чалавекам бедным. Але ён меў у прыяцелях капіталіста Энгельса, які ахвотна спансіраваў тэарэтычную працу Маркса аб практычнай неабходнасці ліквідацыі капіталістаў як сацыяльнага класа. Здаралася ў гісторыі такое, і па-ранейшаму здараецца.

Прыкладам, Лукашэнка звычайна не мае не толькі вялікага прафіту, але нават і дастатковых абаротных сродкаў. І таму пастаянна круціцца каля людзей, у якіх грошы ёсць. Хоць і не любіць такіх за метады, якімі яны ствараюць багацці. Яму даюць.

Бачыце, як нам пашэнціла. У адрозненні ад палякаў, чэхаў, літоўцаў ды іншых. Яны хоць і жывуць багацей, але ж іх эканомікі людзям не служаць, а ў нас наадварот. Напачатку 1990-х амаль усе перажылі так званую «шокавую тэрапію». Адзін раз. У Польшчы падчас рэформы Бальцэровіча, якая запусціла ў дзеянне рынкавую эканоміку, пакупніцкая здольнасць заробкаў зменшылася на 40%, а пасля грашовыя набыткі насельніцтва пайшлі ўверх. Беларусь таксама трапіла ў шок, але з нагоды неэфектыўнага лекавання. Дзесьці толькі ў 2001 годзе сярэдні заробак па краіне дасягнуў 100 долараў. Сярэдні паляк тады зарабляў ужо каля 500 долараў.

Таму насамрэч ні Польшчы, ні іншым постсацыялістычным краінам, за малым выключэннем, ніякая шокавая тэрапія не патрэбна. Дастаткова своечасовай прафілактыкі, якая забяспечваецца адпаведнымі дзяржаўнымі структурамі. У Беларусі не было ні належнага лекавання, ні прафілактыкі. Іх наша дзяржава замяняе пастаянным шакаваннем. 2009-ы год пачаўся з дэвальвацыі рубля на 20%, што балюча ўдарыла і па насельніцтву, і па бізнэсу. У наступным годзе ўрад друкаваў грошы, каб падвысіць заробкі да 500 долараў. І толькі пачалі добра жыць, як бурбалка лопнула. Адна вельмі шокавая дэвальвацыя, другая…. І інфляцыя не спыняецца. Шок, шок, шок — і ніякай табе тэрапіі.

▸ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ГАНЕБНЫ ПРЫСУД

Вольга ХВОІН

**Праваабаронца Алесь Бяляцкі асуджаны да чатырох з паловай гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці і спагнаннем сумы шкоды. Суд Першамайскага раёна Мінска палічыў даказанай віну кіраўніка праваабарончага цэнтра «Вясна» і віцэ-старшыні Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека ва ўхіленні ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры.**



Пасля вынясення прысуду юрыст «Вясны» Валянцін Стэфановіч запэўніў, што праваабарончы цэнтр будзе працягваць сваю працу.

Кіраўніца аддзелу Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Саша Кулаева заявіла, што трэба дабівацца кансалідаванай пазіцыі міжнароднай супольнасці. «Наша рэакцыя будзе моцнай, хуткай і надзвычай абуранай. Бо апроч як абсалютнай ганьбай гэты прысуд нельга назваць! Асуджаны вядучы рэгіянальны, міжнародны праваабаронца, вядомы цяпер ужо ва ўсім свеце. Відавочная расправа над праваабарончай супольнасцю, паказальны суд. І, як ужо сказаў сам Алесь, гэта не можа не нагадваць горшыя судовыя працэсы ў часы СССР, — адзначыла прадстаўніца Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека. — Патрэбная моцная рэакцыя міжнароднай супольнасці. Больш цвёрдая, больш вытрыманая і кансалідаваная, чым была дагэтуль. Неабходна адзіная і рэзкая ацэнка, не падвержаная нейкім зменам, уплывам геапалітычных аргументаў».

Жонка Алеся Бяляцкага Наталля Пінчук заўважыла, што такі прысуд быў чаканы. «Той тон, што задаваўся папярэдне ў дзяржаўных СМІ, па сутнасці не даваў магчымасці думаць аб змякчэнні прысуду. Я была да гэтага гатовая псіхалагічна», — сказала пасля выраку жонка праваабаронцы.

Прэзідэнт Еўрапейскага парламента Ежы Бузэк у сувязі з асуджэннем беларускага праваабаронцы Алеся Бяляцкага зрабіў афіцыйную заяву. «Я асуджаю вынясенне выраку, паводле якога Алесь Бяляцкі асуджаны да зняволення на чатыры з паловай гады. Еўрапейскі парламент надзвычай занепакоены ў сувязі з беспадстаўным крымінальным пераследам і асуджэннем Алеся Бяляцкага за меркаванае ўхіленне ад выплаты падаткаў у Беларусі. Еўрапейскі парламент лічыць абвінавачанні, высунутыя супраць Алеся Бяляцкага ў судзе, палітычна матываванымі і беспадстаўнымі. Мы заклікаем беларускія ўлады неадкладна і без умоў вызваліць Алеся Бяляцкага, а таксама неадкладна і без умоў вызваліць усіх палітычных зняволеных, якія яшчэ ўтрымліваюцца пад вартай, і зняць з іх усе абвінавачанні. Еўрапейскі парламент заўсёды выступае ў падтрымку беларускага народа», — гаворыцца ў афіцыйнай заяве Бузэка.

Пракурор Уладзімір Сайкоўскі прасіў суд пакараць Бяляцкага пяццю гадамі пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Ён падкрэсліў, што ўхіленне ад выплаты падаткаў з даходаў караецца ва ўсіх краінах. На яго думку, атрыманне Бяляцкім сродкаў на праваабарончую дзейнасць не вызваляе яго ад выплаты падаткаў з гэтых грошай.

Па словах адваката Дзмітрыя Лаеўскага, абвінавачанне не адпавядае нормам Крымінальнага кодэкса і парушае права на абарону: у ім не ўказаны ні час, ні месца, ні спосаб правапарушэння. Пазіцыя абвінавачання складаецца выключна з меркаванняў, незразумела, на падставе якіх звестак вызначана сума ўрону, нанесенага ў выніку ўхілення ад выплаты падаткаў. Лаеўскі звярнуў увагу на тое, што звесткі аб руху сродкаў з банкаўскіх рахункаў Бяляцкага, на чым і будуецца абвінавачанне, не афармленыя і не засведчаныя належным чынам. Будаваць абвінавачанне на такіх дакументах недапушчальна, заявіў адвакат.

На думку адваката, справа яго падабароннага расследавалася яўна неаб'ектыўна. «Абвінавачаннем устаноўлена толькі тое, што Бяляцкі адкрыў два рахункі за мяжой, на іх паступілі грошы, а ён сам іх зняў. Больш доказаў няма, у тым ліку і таго, хто і колькі пералічваў сродкаў на рахункі Бяляцкага», — заявіў абаронца Алеся Бяляцкага. Апроч таго, абвінавачанне не даказала факт паступлення сродкаў з рахункаў Бяляцкага ў Беларусь. Такім чынам, на гэтыя сродкі не можа распаўсюджвацца рэжым замежнай гуманітарнай дапамогі і, адпаведна, яны не павінны абкладацца падаткам, заявіў адвакат.

Абарона лічыць, што складу злачынства ў дзеяннях Бяляцкага няма, таму суд мусіць апраўдаць абвінавачваемага.

У апошнім слове ў судзе Алесь Бяляцкі заявіў, што ад часоў СССР нічога не змянілася ў пераследзе праваабаронцаў. «Цягам гэтых трох месяцаў я адчуў, што вярнуўся ў СССР. Толькі на нейкім іншым узроўні адбылася гэтая рэінкарнацыя», — сказаў Бяляцкі. У сваёй прамове ён выступіў супраць метадаў дзяржавы пераследаваць недзяржаўныя аб'яднанні, праваабаронцаў. Ён нагадаў, што ўсяго ўлады зачынілі каля 400 арганізацыяў, а «Вясну» пазбавілі рэгістрацыі і не вяртаюць у прававое поле нават пасля адпаведнага рашэння Камітэту па правах чалавека ААН. Да ўсяго ў 2006 годзе была ўведзеная крымінальная адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

«У 2011 годзе было арганізавана сапраўднае цкаванне «Вясны» і мяне як старшыні. У Беларусі склалася аўтарытарная ўлада, і месца для праваабаронцаў улады не бачаць. Улада пераследуе палітычных апанентаў, абмяжоўвае грамадзянскія і палітычныя правы і не дазваляе развівацца грамадзянскай супольнасці. Улада не выносіць крытыкі, пераследуе журналістаў і праваабаронцаў», — заявіў Алесь Бяляцкі.

Віцэ-прэзідэнт FIDH зазначыў, што Беларусь парушае міжнародныя абавязальніцтвы, якія ўзяла на сябе. «Навошта вы гэтую Дэкларацыю падпісвалі? Выйдзіце з ААН і АБСЕ — і ўсё будзе зразумела, дзе мы знаходзімся...» — звярнуўся да пракурора праваабаронца. Ён згадаў Узбекістан, дзе сядзяць дзясяткі праваабаронцаў, Расію, дзе на Каўказе праваабаронцаў проста забіваюць. І сітуацыю з праваабарончым рухам можна параўнаць з Беларуссю.

Бяляцкі расказаў пра статутныя мэты ПЦ «Вясна», пра дапамогу ахвярам палітычных рэпрэсіяў, кампаніі па назіранню за выбарамі, за адмену смяротнага пакарання.

«Мы маем дастаткова высокі аўтарытэт, і ўсе гэтыя прэміі — сведчанне той драматычнай сітуацыі, якая склалася ў Беларусі. Гэта міжнародныя сігналы Беларусі, што трэба нешта мяняць. ...Мы шмат у чым ратуем гонар Беларусі ў вачах міжнароднай супольнасці. ...Я адчуваю сябе абсалютна невінаватым. У 2011 годзе я мог выехаць за мяжу, але не зрабіў гэтага. Я займаюся 30 гадоў праваабарончай дзейнасцю», — завяршэнне выступу Бяляцкага прысутныя ў судовай залі сустрэлі апладысментамі.

## 30 ЛІСТАПАДА, СЕРАДА

### 1 Беларусь

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.15** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Расія).
**10.15** Серыял «Знахар». Закл. серыя.
**11.05** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія).
**12.10** Сфера інтарэсаў.
**12.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**13.00** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**13.55** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.40** Усё шляхам!
**16.10** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.55** Вострасюжэтны серыял «Замах» (Беларусь-Расія). 1-я серыя.
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія).
**18.45, 00.30** Зона Х.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Расія). Закл. серыя.
**21.00** Панарама.
**21.45, 00.45** Дзень спорту.
**22.00** Адмысловы рэпартаж АТН «Горад мары, якая ажыццявілася».
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.15** Дакументальна-гістарычны серыял «Зямля запаветная ад Іосіфа Сталіна» (Расія). 3-я серыя.

### АНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**22.20** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Асяроддзе пасялення.
**00.25** «След».
**01.10** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінսчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Вар'яцкі спецпрызн». ЗША-Вялікабрытанія, 2009 г.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял. Заключная серыя.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.
**16.50** «Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Мінշчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Камедыя «Вялікая маленькая я». Францыя-Бельгія, 2010 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажаліцца».
**23.50** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**00.45** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Спорт-кадр.
**09.35** Лірычная камедыя «Цётка Маруся» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**11.00** Кінааповесць «Паляванне на аднарога» (СССР).
**12.35** Дак. фільм «Сустрэча на Эльбе».
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**14.10** Серыял «Ты маё жыццё».
**15.15** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.50** Нянудны глобус.
**16.15** Жаночая ліга.
**16.50** Серыял «Пацалунак Сакрата».
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** «Спортлато 5 з 36».
**21.30** КЕНО.
**21.35** «Беларуская часіна».
**23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Прамая трансляцыя.

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**23.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**00.25** Навіны - Беларусь.
**00.35** «Выбары 2011. Дэбаты».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера.Серыял «Фармат А4».

### Eurosport

**10.30** Аўтаспарт. Акадэмія GT. Часопіс.
**10.45** Вось дык так!!!
**11.00, 16.15, 20.45, 02.45** Фігурнае катанне. Гран-пры «Кубак Расіі». Паказальны выступ. Масква (Расія).
**12.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 15 км. Класічны стыль (Фінляндыя).
**13.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км. Класічны стыль (Фінляндыя).
**14.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**15.15** Футбол. Часопіс.
**18.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**19.15** Live. Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальная спаборніцтвы (Швецыя).
**21.55** Абранае па серадах.
**22.05** Пола. Буэнас-Айрэс (Аргентына).
**23.05** Навіны коннага спорту.
**23.10** Гольф.
**23.40** Гольф.
**00.10** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**00.25** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.30** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.45** Спартовае вандраванне. Часопіс.
**01.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальная спаборніцтвы (Швецыя).

### Белсат tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 18 серыя.
**08.30** Два на два (тэледыскусія).
**08.55, 13.50** «Тры шалёныя нулі», серыял: 10 серыя.
**09.25, 14.20** На колах.
**09.50, 14.45** Рэпартэр.
**10.20, 15.10** Асабісты капітал.
**10.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.55** Эксперт.
**11.20** Беларусы ў Польшчы.
**11.35** «Ранча», серыял: 8 серыя.
**12.25** «Арол», серыял: 18 серыя.
**13.25** Два на два (тэледыскусія).
**15.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**15.50** Эксперт.
**16.15** Беларусы ў Польшчы.
**16.30** «Euromaxx».
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 10 серыя.
**17.25** Невядомая Беларусь: «Пастка для прэзідэнта», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**18.50** «Афганец», дак. фільм, Польшча.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** «Андрэй Такіндаг: «..апрануўшы белую кашулю..», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Маю правы.
**21.45** «Каралева Бона», тэлесерыял: 4 серыя.
**22.45** Два на два (тэледыскусія).
**23.10** Аб'ектыў.
**23.35** Гарачы каментар.

## 1 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

### 1 Беларусь

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.15** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Расія). Закл. серыя.
**10.15** Вострасюжэтны серыял «Замах» (Беларусь-Расія). 1-я серыя.
**11.05** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія).
**12.10** Зямельнае пытанне.
**12.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**13.00** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**13.55** «Здароўе». Ток-шоў.
**15.10, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** Адмысловы рэпартаж АТН «Горад мары, якая ажыццявілася».
**15.40** Зона камфорту.
**16.05** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.50** Вострасюжэтны серыял «Замах» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія).
**18.45, 00.30** Зона Х.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.45, 00.45** Дзень спорту.
**22.00** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.15** Дакументальна-гістарычны серыял «Зямля запаветная ад Іосіфа Сталіна» (Расія). 4-я серыя, заключная.

### АНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Шматсер. фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**22.20** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.25** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.55** «Зваротны адлік».
**00.25** «След».
**01.10** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінշчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Камедыя «Вялікая маленькая я». Францыя-Бельгія, 2010 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Мінշчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фантастычны фільм «Адысей і Выспа Смугі». Канада, 2008 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Страсці па культуры.
**09.45** Лірычная камедыя «Цётка Маруся» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**11.10** Рэальны свет.
**11.40** Камедыйная кінанавэла «Мядзведзь» (СССР).
**12.45** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**13.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**14.50** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Нянудны глобус.
**15.50** Жаночая ліга.
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.40** Час футболу.
**23.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**23.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**00.25** Навіны - Беларусь.
**00.35** «Выбары 2011. Дэбаты».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**20.40** Фільм «Плябан».
**22.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**22.50** «Сёння. Вынікі».
**23.15** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.

### Eurosport

**10.30, 14.45, 18.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальная спаборніцтвы. Остэрсунд (Швецыя).
**11.45, 17.00, 02.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км. Класічны стыль. Куусама (Фінляндыя).
**12.45, 16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**14.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**14.10** Лыжнае двабоорства. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсэна. Куусама (Фінляндыя).
**17.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**19.15** Live. Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальная спаборніцтвы. Остэрсунд (Швецыя).
**20.45** Вось дык так!!!
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.00** Покер. Барселона (Іспанія).

### Белсат tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Каралева Бона», тэлесерыял: 4 серыя.
**08.35** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**09.20** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 10 серыя.
**09.45** Праект «Будучыня».
**10.15** Навігатар.
**10.30** «Афганец», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**10.55** Два на два (тэледыскусія).
**11.20** Маю правы.
**11.45** «Андрэй Такіндаг: «..апрануўшы белую кашулю..», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**12.00** Невядомая Беларусь: «Пастка для прэзідэнта», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**12.35** «Каралева Бона», тэлесерыял: 4 серыя.
**13.30** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**14.20** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 10 серыя.
**14.45** Праект «Будучыня».
**15.15** Вагон.
**15.20** Маю правы.
**15.40** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**16.00** Два на два (тэледыскусія).
**16.25** «Пастка для прэзідэнта», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**17.00** «Зорны пірат», тэлесерыял: 1 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Басанож па свеце (спазнавальная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Лебядовыя гады», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**18.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.40** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 3 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Краты», дак. цыкл, 2011 г., Беларусь.
**21.35** Рэпартэр.
**22.00** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бясрэбранікі», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**23.00** «Навенькая», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**23.45** Аб'ектыў.
**00.10** Гарачы каментар.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №11 (63) (лістапад)

www.lit-bel.org www. novychas. org

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскае жыццё лістапада ..... с. 2.
«ЮБІЛЕЙ»: Анатолю ВЯРЦІНСКАМУ — 80! Новыя вершы паэта ..... с. 3.
«АСОБЫ»: Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК пра Анатоля Вярцінскага і Анатоль ТРАФІМЧЫК — пра Якуба Коласа ..... с. 4.
«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Генадзя БУРАЎКІНА ..... с. 5.
«ПРОЗА»: два аповеды Ігара СІДАРУКА ..... с. 6.
«ПАЭЗІЯ»: «Восеньскія танкі» Анатоля ІВАШЧАНКІ ..... с. 7.
«ПРОЗА»: Урывак з новага рамана «Гульня ў каханне» Алеся МАСАРЭНКІ ..... с. 8–9.
«ПЕРАКЛАД»: з анталогіі «Украінскі майдан» Эдуарда АКУЛІНА ... с. 10.
«НАРЫС»: «Прыгоды палескай тапанімікі» Аляксея ДУБРОЎСКАГА ..... с. 11.
«СПАДЧЫНА»: «Прыступкі да перакладу» Васіля САХАРЧУКА і слова Алеся КАСКО пра сябра ..... с. 12–13.
«КРЫТЫКА»: ЛеГАЛ пра 54 нумар «Дзеяслова» ..... с. 14.
«КНІГАНОША»: новыя кнігі на нашых паліцах ..... с. 15.
«КАЛЕЙДАСКОП»: падзеі замежнага літаратурнага жыцця ..... с. 16.


САЛІДАРНАСЦЬ

# ЛІСТ ДА АЛЕСЯ БЯЛЯЦКАГА

**Міхась СКОБЛА**

Дарагі Алесь!

Ужо каторы дзень ты глядзіш на сваіх блізкіх і сяброў з-за кратаў — з падканвойнай клеткі. Клетку нібы адмыслова для цябе пафарбавалі — яна таксама белая. Што ж, белы колер спрадаўна азначаў чысціню, незаплямленую годнасць. Нездарма і на сцягу нашым пераважае бель, і краіна наша застаецца ці не адзінай у свеце, у чыёй назве на першым месцы — белы колер.

З табой, белагаловым вязнем у белай клетцы, выразна кантрастуе чалавек у чорнай мантыі. Не ведаю, пра што ён думае, слухаючы — то па-беларуску, то па-расійску — пракурорска-адвакацкія пытанні і паказанні падсуднага ды сведак. Невядома, якія зробіць высновы з усяго выслуханага і прынятага да ведама. Хочацца спадзявацца, што ў судовай залі ён насамрэч хоча дашукацца праўды і не глядзіць па вечарах БТ, якое ў любым падсудным апазіцыянеэры апрыёры бачыць злачынца.

Добра, што і ты, Алесь, не глядзіш тое БТ. А вось мой сусед глядзіць. Не, ён таксама не аматар крывога тэлелюстэрка. Проста ён па прафесіі лекар-псіхіятар і любіць паўтараць сваю каронную фразу: каб паставіць дыягназ уладзе, трэба ў падрабязнасцях ведаць гісторыю яе хваробы.

Дык вось, паслухаў мой сусед некалькі бэтэшных рэпартажаў з суду над табой, спыніў мяне ў пад'ездзе і кажа: «Гэтага Бяляцкага не судзіць трэба, а ўзнагароджваць ордэнам Скарыны! За папаўненне дзяржаўнага бюджэту. Гэта ж колькі грошай чалавек змог выбіць для роднай краіны ў розных міжнародных арганізацыях! А куды яны ішлі? Пераважна на выплату мільённых штрафаў за ўдзел у розных несанкцыяваных акцыях. Значыць — у бюджэт. А з бюджэта — на заробкі настаўнікам, на ўтрыманне дзіцячых садкоў… Дык за што — судзіць?» — закончыў свой эмацыйны маналог сусед. Вось такі атрымліваецца vox populi.

Дарагі Алесь, я ведаю асабіста дзясяткі людзей, якім дапамагла твая «Вясна». А ёсць жа яшчэ сотні і тысячы, якія я не ведаю. Летась марозным снежаньскім ранкам я бачыў тваіх паплечнікаў каля будынка КДБ — яны прывозілі пакоўныя торбы для перадачы затрыманым за Плошчу… Перадачаў тых чакалі арыштанты. Але мусіла чакаць і дзяржава, паколькі перадачы тыя дазвалялі эканоміць сродкі з таго ж дзяржбюджэта — атрымаўшы падмацунак з волі, вязень мог і не прэтэндаваць на турэмную пайку.



Алесь БЯЛЯЦКІ

Дык за што дзяржава пасадзіла цябе ў жалезную клетку? Яна ж таксама мела з тваёй дзейнасці пэўную карысць.

Дарагі Алесь, мы знаёмыя ўжо дваццаць сем гадоў — з часоў Караліпчавіцкага сэмінара маладых літаратараў. І за ўвесь гэты час я ні разу не ўсумніўся ў тваёй сумленнасці, у тваёй шчырай беларускай душы. У любой беларускай справе (а не беларускімі ты не займаўся) ты быў аднachасова стырном і рухавіком, зацікаўлівалы і перацягваючы на свой бок усіх тых, хто аказваўся побач.

Так адбывалася і тады, калі разам з аднадумцамі ты распальваў першы беларускі нефармальны агмень — слынную «Майстроўню» і самвыдатаўскі часопіс «Бурачок», які паставіў на вушы ўсю прыдамалую ад недахопу працы «кантору глыбокага бурэння».

І тады, калі супольна з аднаверцамі заснаваў беларускі хрысціянскі друк — часопісы «Хрысьціянская думка» і «Вера».

І тады, калі стварыў Таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя» ды заслужана старшынюваў у ім. Да гэтай энергічнай суполкі належалі каля паўсотні маладых творцаў з усёй Беларусі…

Ты, Алесь, быў стырном і рухавіком і тады, калі ўзначаліў Літаратурны музей Максіма Багдановіча, які за тваім дырэктарствам ператварыўся ў адзін са сталічных культурных цэнтраў.

І тады, калі ўваійшоў у аргкамітэт Беларускага Народнага Фронту, які ўскалыхнуў усю Беларусь і пазначыў перад ёю шлях да незалежнасці.

І тады, калі стаў дэпутатам Мінскага гарсавета, які не толькі першым сярод дзяржустаноў узняў над сваім фасадам бел-чырвона-белы сцяг, але і зацвердзіў беларускамоўныя правілы для метрапалітэна, якія і сёння можна пабачыць у кожным вагоне.

Твой безадмоўны рухавік і надзейнае стырно прыдаліся і для новастворанага праваабарончага цэнтру «Вясна», які, нягледзячы на няспынны пераслед уладаў, існуе ўжо больш за пятнаццаць гадоў…

Калі прызнацца, Алесь, дык мяне заўсёды здзіўляла — як цябе на ўсё хапае: на грамадскія справы, на літаратурную творчасць, на сям'ю. Пішучы гэтыя радкі, я кідаю вокам на паліцу, дзе стаяць твае і падрыхтаваныя табой кнігі: «Літаратура і нацыя», «Прабежкі па беразе Жэнеўскага возера», «У капцюрох ГПУ» Францішка Аляхновіча, «З роднага загону» Андрэя Зязюлі, «Сны на чужыне» Янкі Юхнаўца, «Алаіза» Анатоля Сыса…

Ты ўсё, за што ні браўся, рабіў грунтоўна, не похапкам. Здавалася б, факсімільнае перавыданне таго ж Зязюлі не патрабавала аніякіх дадатковых вымогаў: бяры і друкуй. Каб малітоўна-змагарнае слова паэта-ксяндза дайшло да чытача. Але ў табе, Алесь, заўсёды жыла даследчыцкая жылка. І ты паехаў у гарадок Сянно, знайшоў старыя могілкі і там, сярод збуцвелых крыжоў і пахіленых агароджаў, адшукаў забытую магілу паэта, пахаванага ў далёкім 1921 годзе. І знаходка твая была раўназначная адкрыццю. Той, хто займаўся падобнымі пошукамі на старых кладах, мяне зразумее.

Дарагі Алесь, ты ведаеш гісторыю беларускай літаратуры лепш за мяне. Таму я не буду пералічваць тут прозвішчы пісьменнікаў, якія прайшлі праз камеры тае самае турмы, у якой сёння знаходзішся ты. Але адно прозвішча я ўсё ж назаву — Ларыса Геніюш. У 1949 годзе да яе на начныя допыты прыходзіў сам міністар дзяржбяспекі Цанава (Лаўрэнцій ІІ паводле чэкісцкіх святцаў), патрабаваў ад паэткі звестак пра архівы БНР. Ён выходзіў з сябе, пырскаў слінай, пагражаў расправай, але ў адказ пачуў: «Вы ж міністар на Беларусі, дык гаварэце, як тут належыць, па-беларуску!». І грозны генацвале, нічога не дамогшыся, мусіў адступіць.

Я ўспомніў пра гэта, Алесь, калі пачуў пра падобныя моўныя праблемы ў тым самым судзе, дзе цябе, як тэрарыста, пасадзілі ў клетку. Прыйшоў дахаты і перачытаў лісты Ларысы Геніюш да Міколы Ермаловіча, якія ён калісьці мне падараваў. У лісце ад 17 лютага 1971 года паэтка пісала свайму сябру-гісторыку:

«Усе суды, усе прыгаворы пачынаючы ад Кастуся Каліноўскага і яшчэ да яго мы чулі і чуем толькі на іх мове! Хлебам не кармі, а «прыемнасць» судзіць, асуджаць па-расійску пакінь! І нам прыгавор у Менску гучаў на іх мове, і гэта спадзе няхай на іх галовы! Мне толькі злосць, што нехрысты карыстаюцца маім імем як пудзілам. Прытым выдумваюць не горай самога Гебельса. А чаго толькі ні чаўпуць у мой адрас? «Хай пойдзе за імі суровы праклён / з мёртвых устаўшага Краю. / Бродзіць жа светам да сянняшніх дзён, / імя страшнае — Каін...».

Столькі гадоў мінула, а беларусы ўсё яшчэ жывуць у тым Каінавым братэрстве, і ўсё хочацца ім тых падступных братніх абдымкаў, якія аднойчы ўжо прывялі да трагедыі…

Дарагі Алесь, калі я бачу, як на тваіх руках ахоўнікі дэманстратыўна замыкаюць кайданкі, мне прыгадваецца, як аднойчы нас з Эдуардам Акуліным, Лявонам Баршчэўскім, Алесем Пашкевічам, Барысам Пятровічам і Антанінай Хатэнкай павязалі ў парку Горкага. Мы там пасля пісьменніцкага з'езда вершы чыталі і не падпарадкаваліся міліцэйскаму загаду замаўчаць і стаць на зважай. Мне тады ўпершыню ў жыцці надзелі кайданкі. Праз дзве гадзіны знялі і адпусцілі, але запясці яшчэ доўга балелі. Не ведаю, якой канфігурацыі кайданкі выкарыстоўваліся ў старажытнай Грэцыі, але меў рацыю Сакрат, па-філасофску зацеміўшы: «Кайданкі варта панасіць хоць бы дзеля таго, каб потым на поўную моц адчуць радасць вызвалення».

Вызваленне прыйдзе, Алесь. І прыйдзе хутка. Ты ж не забыўся, што ў снежні мы планавалі адзначыць 25-годдзе «Тутэйшых»?

Дарэчы, 29 кастрычніка адбылося чарговае паэтычнае свята ў Гарошкаве — на радзіме нашага незабыўнага «тутэйшаўца» Анатоля Сыса. На падворку ягонай ужоператворанай у музей хаты гучалі вершы, песні, успаміны. Гучаў і твой улюбёны сысоўскі верш: «У гэтай краіне не маю я волі, / вось воблака — сяду і ў свет палячу…». Мабыць, ты яго часта згадваеш у турэмнай камеры. Пры цяпельцы паэзіі добра пагрэцца душой. А яго можна раскласці дзе заўгодна, не патрэбныя ні дровы, ні запалкі — толькі памяць.

Трымайся, Алесь. Мы чакаем цябе на свабодзе.

4 лістапада 2011 года.

**www.svaboda.org**

СЕЦІВА

# НОВЫ «ПРАЙДЗІСВЕТ»

**Выйшаў восьмы нумар інтэрнэт-часопіса перакладной літаратуры «ПрайдзіСвет». Ён мае назву «Аўтапартрэт з люстэркамі» і прысвечаны беларускай літаратуры ва ўсіх яе разнастайных праявах.**



Аўтары выдання вырашылі як мага шырэй паглядзець на Беларусь, адлюстраваную ў творчасці беларускіх пісьменнікаў, пісьменнікаў беларускага паходжання, чыя творчасць зрабілася здабыткам іншых культураў, змясцілі пераклады айчынных аўтараў, што не пісалі і не пішуць па-беларуску, і надрукавалі замежныя пераклады беларускамоўных творцаў.

Упершыню ў «ПрайдзіСвеце» з'явілася арыгінальная творчасць: архіў нумароў часопіса «Узвышша» і беларуская паэзія паралельна з замежнымі перакладамі, аўтапераклады.

У гэтым нумары стваральнікі вырашылі адысці ад традыцыйнага падзелу на раздзелы. Тэксты, незалежна ад жанру, у якім пажадалі выказацца іх аўтары, разбітыя на раздзелы згодна з тэматычным прынцыпам.

Першая частка часопіса, «Аўтапартрэт», прысвечаная творам і перакладам шматмоўнай беларускай літаратуры на беларускую. «Збеглыя вобразы» — гэта пісьменнікі, якіх мы традыцыйна лічым замежнымі, не забываючы іх беларускага паходжання, «Дзірка ў палатне» — даследаванне мастацкіх магчымасцяў трасянкі, «Эклектычная калекцыя» — беларускія пісьменнікі, якія пісалі і працягваюць пісаць на розных мовах, «Памежныя кантрасты» — артыкулы пра падляшскую і палескую гаворкі, «Сармацкі профіль» — творы шматмоўнай беларускай літаратуры XVI–XVIII стагоддзя, «Рамантычны эскіз» — XIX стагоддзе, «Габрэйскі фон» — творы ідышамоўнай літаратуры Беларусі і пра Беларусь, «Усходняя вязь» — колькі словаў пра спадчыну беларускіх татараў.

Другая частка нумара — «Люстэркі» — змяшчае пераклады з беларускай на іншыя мовы: англійскую, нямецкую, расійскую, польскую, шведскую, чэшскую, літоўскую, грузінскую і іншыя.

Сярод цікавостак нумара — майстар-клас з вядомым польскім перакладчыкам Адамам Паморскім, інтэрв'ю з амбасадарам Швецыі ў Беларусі Стэфанам Эрыксанам, пераклад класічнай сатыры «Прамова Мялешкі» на трасянку, арыгінальныя вершы беларуска-амерыканскай паэткі Вальжыны Морт, інтэрв'ю з аўтарам праекта «Песні філаматаў і філарэтаў» Аляксеем Жбанавым (разам з запісамі песняў, выкананых у арыгіналах і перакладах з польскай і ідыш), новыя пераклады на расійскую мову паэзіі Уладзіміра Караткевіча і многае іншае.

Наступны, дзявяты, нумар часопіса будзе прысвечаны дэтэктыўнай літаратуры.

**Рэдакцыя інтэрнэт-часопіса «ПрайдзіСвет»**

САЮЗ

# САЛІДАРНАСЦЬ РАСІЙСКАГА ПЭН-ЦЭНТРА

**Грамадска-палітычная сітуацыя ў Беларусі пагаршаецца дзень за днём. Пра тое гаворыцца ў заяве Расійскага ПЭН-цэнтра аб сітуацыі ў Беларусі.**

«Мы неаднаразова выяўлялі сваю занепакоенасць з нагоды парушэння правоў чалавека ў Беларусі, неаднаразова пратэставалі супраць пераследаў нашых калегаў, пісьменнікаў і журналістаў Уладзіміра Някляева, Паўла Севярынца, Аляксандра Фядуты, Зміцера Бандарэнкі, Ірыны Халіп ды іншых. Сёння мы павінны заявіць, што грамадская і палітычная сітуацыя ў гэтай краіне рэзка пагаршаецца літаральна дзень за днём. А лёс нашых калегаў — пісьменнікаў, журналістаў, дзеячаў мастацтва, усіх нязгодных з рэпрэсіўнай палітыкай Лукашэнкі — выклікае ўсё большую і большую трывогу», — гаворыцца ў заяве.

Як стала вядома, адзначаецца ў дакуменце, 3 кастрычніка ў Беларусі былі прынятыя папраўкі ў шэраг законаў, «якія жорстка ўзмацняюць рэпрэсіі супраць грамадскіх арганізацый і асоб, што выказваюць нязгоду з палітыкай Лукашэнкі». Таксама апублікаваны праект закона аб КДБ, у якім, як адзначаюць у заяве, «супрацоўнікам КДБ законам дазваляецца ўжыванне фізічнага ўздзеяння аж да выкарыстання «баявых прыёмаў барацьбы». Таксама праектам закона «дазволена без санкцыі суда ўрывацца ў жытло грамадзян пры адным толькі падазрэнні, што там адбываецца нешта непажаданае ўладам», падкрэсліваецца ў заяве. «З асобай жорсткасцю дыктатарскі рэжым рэагуе на якую б то ні было фінансавую дзейнасць апазіцыйных сіл. Як у горшыя гады савецкага таталітарызму, цяпер у Беларусі арыштаваны і чакае суда арганізатар фонду дапамогі палітвязням (Цэнтр «Вясна») Аляксандр Бяляцкі».

У заяве падкрэсліваецца, што ўсе згаданыя рэпрэсіўныя нававядзенні робяць «немагчымай або вельмі рызыкоўнай (у прамым сэнсе: людзі рызыкуюць жыццём) дзейнасць грамадскіх арганізацый — і сярод іх дзейнасць нашых калегаў».

Члены Расійскага ПЭН-цэнтра выказваюць салідарнасць беларускім творцам, а таксама заклікаюць калегаў па міжнародным ПЭН-руху «падзяліць трывогу з нагоды падзей у Беларусі і далучыцца да пратэстаў».

Заяву падпісалі Андрэй Бітаў, Аляксей Сіманаў, Юна Морыц, Леў Цімафееў, Людміла Уліцкая, Барыс Яўсееў, Віктар Ерафееў, Кастусь Кедраў, Вадзім Рабіновіч, Вячаслаў П'ецух.

**Таццяна Каравянкова, БелаПАН**

# ПРЭМІЯ ШВЕДСКАГА ПЭН-ЦЭНТРА

**Уладзімір Някляеў стаў лаўрэатам прэміі шведскага ПЭН-цэнтра, але паехаць у Швецыю не змог.**

Як гаворыцца ў паведамленні цэнтра, сёлета прэмію Курта Тухольскага вырашана прысудзіць «беларускаму аўтару і грамадскаму дзеячу Уладзіміру Някляеву, які праявіў сябе як выдатны паэт і сапраўдны змагар за свабоду слова». «Дагэтуль Някляеў пакутуе ад наступстваў такога жорсткага абыходжання і звярнуўся па выязную візу ў Швецыю, дзе ён змог бы атрымаць спецыялізаваную дапамогу. Падчас гэтага візіту ён планаваў узяць удзел у цырымоніі ўручэння прэміі Тухольскага, якая прайшла ў Стакгольме», — гаворыцца ў паведамленні.

«Цяпер мы атрымалі інфармацыю, што Беларусь адмовіла Някляеву ў магчымасці паехаць у Швецыю. Прычына ў тым, што ён знаходзіцца пад так званым дамашнім арыштам, гэта значыць яму забаронена пакідаць Мінск». Цырымонія ўзнагароджання адбылася ў зале Дома культуры Стакгольма 15 лістапада ў рамках праграмы Дня зняволеных пісьменнікаў.

Нагадаем, 20 мая суд Фрунзенскага раёна Мінска прызнаў Уладзіміра Някляева вінаватым па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх) і вырак да двух гадоў пазбаўлення волі з адтэрмінoўкай выканання прыгавору на два гады. У. Някляеў павінен рэгулярна адзначацца ў міліцыі і знаходзіцца дома штодзённа з 20.00 да 6.00.

9 верасня суд Ленінскага раёна Мінска наклаў на асуджанага паэта дадатковыя абмежаванні пры адбыцці пакарання. У. Някляеву, у прыватнасці, забаронена выступаць арганізатарам або ўдзельнікам масавых шэсцяў, дэманстрацый, пікетаў і іншых масавых мерапрыемстваў; ён не можа выязджаць за межы Мінска без пісьмовага дазволу праваахоўных органаў і пакідаць межы Беларусі да заканчэння тэрміну пакарання.

**Ул. інф.**

MEMORIA

# ПАМЁР АНАТОЛЬ БЕЛЫ

**14 лістапада спачыў у вечнасці вядомы грамадскі дзеяч, сябар Беларускага саюза мастакоў і Саюза беларускіх пісьменнікаў Анатоль Белы.**

Анатоль Белы вядомы прадстаўнікам як моладзевых арганізацый, так і сябрам розных палітычных партый. Неаднаразова ён рабіў самаробныя призы, якія ўручаліся пераможцам конкурсаў і лаўрэатам прэміі ў галіне абароны незалежнасці і суверэнітэта краіны.

Анатоль Белы зрабіў некалькі скульптурных кампазіцый дзеля ўшанавання памяці знакавых асоб у гісторыі Беларусі.

Пахаванне Анатоля Белага адбылося 17 лістапада ў Старых Дарогах, дзе знаходзіцца дом Белага і заснаваны ім музей.



Анатоль Белы каля свайго дома-музея

ФЭСТ

# «ЛІТАРАТУРНЫЯ ДАЖЫНКІ 2011»

**13 лістапада ў старажытным мястэчку Крэва адбыўся першы камерны паэтычна-музычны рэгіянальны фэст «Літаратурныя дажынкі — 2011».**

На вуліцы — лістапад. Самы час збіраць ураджай і на літаратурнай ніве. З тае нагоды 13 лістапада ў кавярні старажытнага мястэчка Крэва ініцыятыва «Твой Фэст», сайт Krevo.by пры падтрымцы кампаніі «Будзьма беларусамі» і беларускага ПЭН-цэнтра падвялі папярэднія вынікі літаратурнага года і зладзілі камерны паэтычна-музычны фэст, на якім узнагародзілі пераможцу ТОП-10 найураджайных пісьменнікаў года (па версіі чытачоў). Ім стаў малады празаік Віктар Рамандаў са Светлагорска. Віктар набраў 300 галасоў з 1000 прагаласавалых, вялікую падтрымку яму аказалі прыхільнікі-землякі. Віктар прыехаў на выступ не адзін, а з групай падтрымкі.

Беларускія музыкі і літаратары адмыслова на фэст прыехалі з Менска. У святкаванні прынялі ўдзел выканаўцы Зміцер Вайцюшкевіч, Алесь Камоцкі, Андрэй Мельнікаў, Раман Абрамчук і гурт «BosaeSonca». Літаратурную частку прадставілі Міхась Скобла, Валерыя Кустава, Віталь Рыжкоў і Анка Упала. Пад час вечарыны ўзяў слова выкладнік гарадзенскага ўніверсітэта, вядомы перакладчык тэкстаў сучасных беларускіх аўтараў на нямецкую мову Андрэ Бём. Свае вершы зачытаў сваяк Уладзіміра Някляева Іван Магер, на чыім падворку напярэдадні імпрэзы маладыя літаратарамі разам з гаспадарамі маёнтка пасадзілі маладу дубочак — Дуб Паэзіі, які склаў добрую кампанію Літаратурнай Ігрушыне, што з'явілася ў мястэчку на падворку сям'і Магераў крыху раней — гэтым летам, 4 чэрвеня 2011 года.

Іван Магер, уладальнік маёнтка, адзначыў: на маладым дубочку з цягам часу з'явяцца залатыя жалуды — а на літаратурнай ніве маладыя паэты, што прынясуць у беларускую культуру і літаратуру дабрыню і цеплыню.

Як і назва фэста, так і призы пераможцам галасаванак былі падабраныя з гумарам. Да слова, падарункамі для ўсіх выступоўцаў сталі слоікі з сочывам, зробленыя з пладоў паэтычнага дрэва адмыслова да «Літаратурных дажынак», што сталася сімвалічным. Не засталіся без прыемных сюрпрызаў і слухачы — яны атрымалі призы ад кампаніі «Будзьма беларусамі», прыняўшы ўдзел у вясёлых літаратурных конкурсах.

На сустрэчы прысутнічалі не толькі карэнныя жыхары Крэва, але і госці з Менска, Смаргоні, Гародні, Мядзеля. А яшчэ — з Нямеччыны і Туркменістана. Таму фэст набыў статус не толькі рэгіянальнага, але і амаль міжнароднага.

Вядоўца і суарганізатарка фэста паэтка Валярына мяркуе, што «Літаратурныя дажынкі» стануць штогадовым літаратурна-музычным святам, якое будзе ладзіцца менавіта ў рэгіёнах, каб прынесці беларускае слова і беларускую песню менавіта ў тыя гарады і мястэчкі Беларусі, дзе іх найболей не стае.

▶ ВЕРШЫ

# «ЗМІРАЮЦЬ МРОІ, САМ ЖЫВУ»

18 лістапада споўнілася 80 гадоў вядомаму беларускаму паэту, публіцысту, грамадскаму і дзяржаўнаму дзеячу, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Беларусі, сябру Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў Анатолю ВЯРЦІНСКАМУ.

Пра яго напісана шмат — і, як пра сапраўдны талент, напісана таксама таленавіта. І найбольш — найрэдкая з'ява — ягонымі калегамі. «У Анатоля Вярцінскага натуральны талент, — адзначыў нядаўна ў «Дзеяслове» Леанід Галубовіч. — Ён не падганяў яго ні пад класічную традыцыю большыні нашых вершатворцаў, не выштукоўваў фармальных наватарскіх метадаў уласнай версіфікацыі. Ён проста час ад часу прагаворваўся, як прагаворваецца сама прырода сваімі з'явамі — сонцам, снегам, навальніцай…». А вось як бачыцца юбіляр паэту Алесю Разанаву (колішняя «Крынічанская» публікацыя): «Анатоль Вярцінскі з'явіўся ў беларускай паэзіі як выключэнне з правіла, як альтэрнатыва тагачаснай беларускай паэзіі. Парадыгма яго творчасці настолькі не супадала з агульнапрынятай, што ствараліся ўражанне: усе пішуць удоўжкі, а ён упоперак, усе ўмеюць пісаць ці, прынамсі, стараюцца ўмець, а ён не ўмее і не хавае свайго няўмення. Аднак у гэтага няўмення быў почырк з'яві…». «Паэт не гуляе ў вечнае. Ён супадаў і супадае з часам — і, здараецца, надае часу прыкметы… Так ствараецца прастора прысутнасці. Яна здабываецца не кожным, яна — творчае дзеянне», — канстатуе ў той жа сваёй «Крыніцы» Уладзімір Някляеў. «Эстэтычныя драпіны» расчуў у вершах Анатоля Вярцінскага эстэт Леанід Дранько-Майсюк (яго «Крынічанскае» эсэ паўтараецца на наступнай старонцы гэтага нумара). Падобныя вершаспевы ў гонар сённяшняга юбіляра можна доўжыць і доўжыць…

«Літаратурная Беларусь» і Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў сардэчна жадаюць славутаму юбіляру і далейшых высокіх нябёсных ідэалаў, здароўя і крывіцкай няскорнасці!

А сённяшні падарунак ад Анатоля Ільіча — яго новыя вершы.



**Анатоль ВЯРЦІНСКІ**

## Жыву!

*…Такі вось загаловак.
На міг спыняецца аловак:
не можа вызначыць ніяк,
які далей паставіць знак.
Ну, гэты самы знак графічны.
Ці то шматкроп'е, ці то клічнік?..
Пра што ідзецца? Рэч у тым,
што ўраз праз эмацыйны ўздым
акрыла раптам прасвятленне,
і ўявіўся, на здзіўленне,
нібы разгорнуты сувой,
табе ўвесь шлях жыццёвы твой.
Выснова — думка ў галаву
прыйшла, як адкрыццё: «Жыву!».
Так, факту гэтаму здзівіўся…
Даўным-даўно, брат, нарадзіўся,
на свет з'явіўся, а жывеш
і нават пішаш гэты верш?
А быць магла ж інакшай доля.
Гаркавая была спатоля
на працягу ўсіх зім і лет.
Не вельмі быў зычлівы свет.
Была вайна, быць мог забіты,
мог быць забіты і забыты,
на тыя звезены клады,
дзе ціха спяць тваe дзяды.
Адолеў тое ліхалецце, —
жыву на гэтым белым свеце.
Губляў шмат родзічаў сваіх, —
жылі-былі, жыву без іх.
Не уяўляў жыццё без маці,
шчаслівы быў у роднай хаце.
Матулю пахаваў сваю,
а сам жыву, сам існую.
Меў мару — мрою запаветную
пра будучыню нашу светлую,
натхнёна наяву і ў снах
узводзіў камунізма гмах.
Нямашка камунізма тога,
Сацыялізма развітога…
Што ж засталося наяву?
Змiраюць мроі, сам жыву.
Ці мала яшчэ пра што марылі.
Ды падпільноўвалі аварыі
на гэтай самай на «стезе».
І ў іхнім ліку — дэ-тэ-эз.
Пацвердзяць Скобла і Акулін,
як іх аўто ляцелі кулем,
як мы ляцелі пад адхон
з бядою наўздагон, на скон.
Усе жывыя, дзякуй Богу.
Жыву, збіраюся ў дарогу.
Адмета ўрокаў тых усіх —
мы тут жа забываем іх.
Жыву! Не факт, што лепшым чынам,
магчыма, быў не лепшым сынам,
не лепшы, мабыць, муж і брат.
Сам ці здаволены? Наўрад.
Ды вось — самому на здзіўленне —
жыву і кожны новы дзень я,
ягоную сінь-сіняву
страчаю думкаю: «Жыву!»*

**Лістапад 2011 г.**

## Жыццё як выпрабаванне

*Жыццё — выпрабаванне?
Ну так, ну так, сябры.
Не проста шчыраванне
ад зары да зары,
не проста існаванне
ад ранняй да позняй пары.*

*Жыццё — выпрабаванне.
Кім? Чым? І дзеля чаго?
Так, слушнае пытанне.
Адказваю на яго.*

*Выпрабаванне — удачай.
Выпрабаванне — бядой.
Выпрабаванне — нястачай
і найлепшай ядой.*

*Выпрабаванне — болем,
які засмучае і гне.
Выпрабаванне — няволяй,
тым болей — воляй, але.*

*Выпрабаванне — уладай
і пакорай тупой.
Выпрабаванне — здрадай
таго, хто быў з табой.*

*Крыўды, неміласэрнасць,
Спакусы і гвалт… І таму
выпрабаванне — на вернасць
праўдзе, сумленню свайму.*

*Вынесеш выпрабаванне,
здасі той і іншы іспыт, —
і дасца табе трыванне
годна сыйсці ў нябыт.*

**2011 г.**

## Ці спетая наша песня?

*Jezcze Polska nie zginiela…
Ще не вмерла Україна…
І жыве на свеце белым
Беларусь, мая краіна.*

*Вось такія гучаць гімны,
Так пяюць браты-суседзі.
А што — мусілі б і згінуць
на зямным на гэтым свеце?
І не жыць ніколі болей?
Па якой такой прычыне?
Па чужой, вядома ж, волі,
па драпежніцкай, злачыннай?*

*Бралі пернікам і сілаю,
і ахвяр было бязмерна.
Ды і Польшча не загінула,
і Ўкраіна не памерла.*

*І жыве мая Айчына.
Як жыве — другая справа.
Як? Заможна ці нішчымна?
Яна — край ці ўжо дзяржава?
Ці народ, ці люд тутэйшы,
чыя хата — усё з краю,
а наверсе — брат старэйшы:
за малодшым назірае?*

*Рытарычныя пытанні.
Раздарожжа — гістарычнае.
І асіліць яго ў стане
толькі воля гераічная.*

*Будуць воля ды «Пагоня»,
ды паходня палаць ясна, —
і не згінем мы сягоння,
ну а заўтра жыцьмем шчасна.*

**2011 г.**

## Наконт хомо сапіенс

*Якія мы падобныя
і якія мы розныя!
Якія мы добрыя
і якія злосныя!*

*Якія мы разумныя
і якія бязглуздыя!
Якія мы сумныя
і якія шустрыя!*

*Якія мы крылатыя
і якія бяскрылыя!
Якія мы заўзятыя
і якія панылыя!*

*Пафас і іронія,
зло і дабро прасветлае…
Вось такая гармонія,
вось такая сіметрыя.*

*То любім і ашчаджаем,
то губім адзін аднога.
Ды голасна сцвярджаем,
што ўсе ходзім пад Богам.*

*Каб так сапраўды хадзілі,
гэтак глядзелі на рэчы, —
то быў бы напраўду адзіны
род наш чалавечы.*

**Лістапад 2011 г.**

## Вечная квецень

*Убачыў, як квітнее сад,
і адарваць не мог пагляд.
Нібы глядзеў упершыню
на гэткую харашыню.
Нібы сам пачынаўся з ёй,
з вясновай гэтай навізной.
Здавалася такое штосьць:
не прамінула маладосць,
якім ты быў, такі і ёсць,
з табою вёсны твае ўсе —
усе ва ўсёй сваёй красе.
Што той узрост, тыя гады,
калі вось так цвітуць сады!
Напраўду, рэч не ў тым зусім,
пражыта колькі лет і зім.
А ў тым, што зноў квітнее сад,
як шмат гадоў таму назад.
А ў тым, што зноў квітнее сад,
і што святлее твой пагляд.
Што потым, як і пры жыцці,
сады ва ўсю будуць цвісці —
вось так якраз і ў той жа час…
І ў гэтым будзе штосьць ад нас,
ад нашых веснавых надзей
ды ад святла нашых вачэй…*

**2011 г.**

## З КНІГІ «АСОБНЫЯ РАДКІ»

### Ці бедная наша мова

*Смутак. Самота. Сумота.
Нэндза. Маркота. Журбота.
Журба. Нуда. Туга…
Бедная мова? Га?*

* * *

*Стары. Старэча. Старычына…
Гэта — калі стары мужчына.
А як жанчына — старая карга.
Бедная мова наша? Га?*

### Новая эпоха

*Пасля цара Гароха
настала другая эпоха.
Апошнія сталі першымі.
Злачынныя сталі законнымі.
А тыя, што былі пешымі,
сталі раптам коннымі.*

### Што тут скажаш

*Арышты. Допыты.Ператрусы…
Так і жывеце, беларусы?
Якія ўсё ж непакоюць клопаты?
Ператрусы. Арышты. Допыты…
Дык што рабіць, спадары-таварышы?
Допыты.Ператрусы. Арышты…*

### Наспелае пытанне

*Як нам быць са старэйшым братам? —
хваткім такім, такім амбітным?
Раней ён нас абкладаў матам,
а цяпер яшчэ абкладае і мытам.*

**2009–2011 гг.**

ПОСТАЦЬ

# ЭСТЭТЫЧНАЯ ДРАПІНА

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

**Я чуў (і, мусіць, не толькі я), што паэтычны стыль АНАТОЛЯ ВЯРЦІНСКАГА вельмі падобны на гучанне сапсаванай пласцінкі.**

Параўнанне злое, але даволі дакладнае, бо, чытаючы Вярцінскага, немагчыма не заўважыць, як літаральна ў кожным вершы і паэме іголка сінтаксісу «западае», трапляе ў своеасаблівую шчылінку, і мелодыя пачынае паўтарацца.

Праўда, у паэта ёсць творы (напрыклад, цудоўны верш «Паўднёвае ўражанне»), у якіх вершаваная мелодыя ўнікае відавочных паўтораў, але ўсё адно адчуваецца, што асноўныя словы і гэтых твораў нібыта азіраюцца назад, нібыта хочуць вярнуцца на вусны аўтару.

Паэт свядома ўводзіць у тэксты таўталагічныя канструкцыі.

Гэтым ён прыкметна збядняе сваю лексіку, аднак жа дасягае значнага эфекту — яго вершы робяцца адразу ж пазнавальнымі.

Адзін з асноўных творчых клопатаў паэта — не выкасоўваць аднасэнсавыя словы і выразы, а натхнёна з радка ў радок паўтараць іх — да сказанага дадаваць сказанае, да ўбачанага ўбачанае.

Напрыклад, шырока выкарыстоўваць дзеяслоўныя паўторы («Ноччу заплакала дзіця. Заплакала, загаманіла нема...», «Бачу ў мінуту азарэння: падаюць вашы тры вымярэнні. Падаюць вашы сцены і столі...», «Я фільм глядзеў. Там — Спартака распялі. Распялі ноччу, калі ў Рыме спалі...» і г.д.); анафары (у якасці прыкладу цалкам можа паслужыць верш «Дзівак чалавек», і не толькі ён); прыслоўныя паўторы («Рана ці позна, позна ці рана высахнуць слёзы, загоіцца рана. Рана ці позна... Рана ці позна, позна ці рана суровая помста спасцігне тырана. Рана ці позна...», «Доўга не трацілі ўдовы надзей, доўга чакалі маці дзяцей...», «... і сталі цягнуць, гнуць сталі вяршыню. Цягнулі сілком, цягнулі сілом» і г.д.); паўторы назоўнікаў у звязку з дзеясловамі («Бурбоны вяртаюцца ў Парыж, на трон вяртаюцца Бурбоны...», «Цётка плакала па мужу, цётка плакала па дзецях, цётка плакала па людзях...» і г.д.).

Шчыра кажучы, усіх паўтораў у Вярцінскага не злічыць.

Мусіць, ён адзіны ў свеце (на Беларусі дык дакладна што адзіны) паэт паўтораў.

Але што цікава, Вярцінскага нельга папракнуць у аднастайнасці — з яго збедненай лексікі ўвесь час вырастаюць новыя сэнсы.

У лепшай сваёй паэме «Дажынкі» — творы, невялікім па аб'ёме — паэт шмат разоў (часам, здаецца, аж занадта) называе імя галоўнай гераіні.

Але як яно, гэта імя, кожны раз па-новаму гучыць!

Колькі ў ім прачытваецца вобразаў: Аксіння — жняя, Аксіння — руплівіца, Аксіння — калгасная парабчанка, Аксіння — цярплівіца, Аксіння — гаспадыня, Аксіння — маці, Аксіння — жонка, Аксіння — пакутніца, Аксіння — святая...

Варта нагадаць літаратурным пачаткоўцам, што паўторы, не асветленыя такімі сэнсамі-вобразамі, змястоўнымі сімваламі, стамляюць, знішчаюць мастацтва.

Часам мне здаецца, што Вярцінскі дзейнічае, як рэжысёр, які не выкідвае ніводнага кадра, манціруе ўсе адзнятыя дублі.

Не ведаю, ці карысная такая ашчаднасць для кіно.

Для паэзіі ж Вярцінскага — карысная.

Ашчаднасць Вярцінскага выяўляецца і ў тым, што ён адносіцца да паэтаў, калі так можна сказаць, аграфічных — тых паэтаў, якія мала пішуць.

Ва ўсякім разе, не кожны дзень.

Упэўнены, складанне вершаў кожны дзень разбурае паэзію.

Паэт павінен умець маўчаць.

Стомлены рыфмаванымі кіламетрамі сучасных беларускіх вершапісцаў, я ўдзячны Вярцінскаму за яго маўчанне.

Яно — творча-спрыяльнае, і цень ад яго ляжыць на стылі паэта.

І калі сапраўды стыль Вярцінскага — сапсаваная пласцінка, то на гэтай пласцінцы кожная драпіна мае эстэтычную вартасць.

Пісаць пад Вярцінскага немагчыма, бо яго пісьмо надта бачнае, надта няўклюднае ў сваёй індывідуальнасці і надта нязручнае для вучнёўскага перайманія.

З гэтай прычыны ў Вярцінскага няма і не будзе эпігонаў, імітатараў.

Можна імітаваць змест яго твораў (змест, дарэчы, не такі ўжо й складаны), але немагчыма (каб ніхто не заўважыў!) імітаваць ягонае пісьмо.

**(«Крыніца», 1994 г.)**

**Анатолю Вярцінскаму — ганароваму старшыні таварыства «Беларусь-Кітай» і колішняму сябру такіх жа таварыстваў пры Доме дружбы «Беларусь–Латвія» і «Беларусь-Балгарыя» — на Дзень яго нараджэння.**

## Не аддамо…

Сяргей ПАНІЗНІК

*Любіў і летам і ў зіму*
*Ён з Юрмалай вітацца.*
*Латыш — Вярцінскі! І таму*
*Не аддамо кітайцам.*

*На чарнаморскую карму*
*Ўзбіраўся за загарам.*
*Братушкам стаў ён... І таму*
*Не аддамо баўгарам.*

*Амерыканскую гурму*
*Глушыў сірэнай творца.*
*Крывіч — Вярцінскі! І таму*
*Не аддамо нью-йоркцам.*

*Ён ваяўнічую сурму*
*Ўздымае там, дзе звяга.*
*Ваяр — Вярцінскі! І таму*
*Не аддамо яцвягам.*

*Высокі ідэал яму*
*Прыйшоў калісь наяве.*
*Паэт — Вярцінскі! І таму*
*Заўжды з усімі намі!*

## Замест віншавальнай паштоўкі

Лілія ДЗЯМЕШКА,
прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

*Помню, цесная стала хата,*
*Нізкай вельмі здалася столь,*
*Як ступіў на парог госцем нашым*
*Паважаны паэт Анатоль.*

*Мне жыццё уяўлецца полем,*
*Пад якім небасхіл, а не столь…*
*Я здымаю з паліцы Ваш зборнік,*
*Дарагі мой паэт Анатоль.*

*Мы ніколі не трацім надзею,*
*Што ўзрасце лёсу нашага столь.*
*Я жадаю дабра і натхнення*
*Вам, Вярцінскі, паэт Анатоль!*

ПАЗІЦЫЯ

# «ЁН ЖА — ПОМНІК»

Анатоль ТРАФІМЧЫК

**…4 верасня краіна адзначыла Дзень беларускага пісьменства.**

Настала чарга невялічкага мястэчка Ганцавічы стаць ягонай «сталіцай». Выдатна, што дзяржаўнае кіраўніцтва трымае ў полі зроку не толькі сталіцу і найбольшыя гарады, але і глухую правінцыю, якой з'яўляецца Ганцавіцкі раён. Многія мясціны ў раёне ў XX стагоддзі сталі літаратурнымі — адзначаны нараджэннем адораных Боскім талентам майстроў слова. Перадусім варта выдзеліць Васіля Праскурава, Івана Кірэйчыка, Міхася Рудкоўскага, Уладзіміра Марука, Алеся Каско, Віктара Гардзея, Алеся Каждуба. Менавіта ім абавязаны горад гонарам стаць сталіцай маштабнага рэспубліканскага свята.

Адным з канцэптуальных момантаў мінулага святочнага дзейства стала адкрыццё помніка вялікаму беларускаму паэту Якубу Коласу. Бюст з выявай маладога Канстанціна Міцкевіча ўстаноўлены ў канцы Алеі пісьменства невялікага ўтульнага гарадка. Логіка ў выбары стварэння памятнай мясціны нібыта абсалютная: Якуб Колас у дваццацігадовым узросце пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі прыехаў настаўнічаць у вёску Люсіна, якая сёння ўваходзіць у склад Ганцавіцкага раёна. У другой палове XX стагоддзя склалася традыцыя пісаць пра тое, што будучы народны паэт настаўнічаў на Ганцаўшчыне. Аўтары артыкулаў — ад раённых газет да навуковых зборнікаў — не задумваючыся ставілі побач псеўданім паэта і назву рэгіёна, таму публікацыі часта так і называліся — «Якуб Колас і Ганцаўшчына». Іх паток не заканчваецца і сёння.

Аднак логіка аказваецца падманнай, створанай шляхам падмены паняццяў. У выніку выяўляецца непісьменнасць падыходу да справы ўвекавечання памяці выбітных дзеячаў айчыннай культуры і літаратуры. Фармалізм, адсутнасць мінімуму ўдумлівасці, хаця б нейкай аналітычнай глыбіні, а самае галоўнае — ведання творчасці Якуба Коласа.



Здымак Якуба Коласа напрыканцы навучання ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, напярэдадні ад'езду на першае месца працы ў Люсіна

1. Ганцаўшчына як рэгіён склалася штучна і зусім нядаўна — у сярэдзіне XX стагоддзя.

2. Сам Якуб Колас падчас працы ў Люсіне лічыў, што ён жыве і працуе на Піншчыне.

Аб усім — па парадку.

Да Другой сусветнай вайны такога геаграфічнага паняцця, як Ганцаўшчына, не было. Чыгуначная станцыя Ганцавічы, якая дала імпульс развіццю аднайменнага мястэчка, у часы настаўнічання Якуба Коласа (1902–1904 гг.) размяшчалася на тэрыторыі Круговіцкай воласці Слуцкага павета. Статус раённага цэнтра Ганцавічы атрымліваюць толькі ў 1940 годзе пасля ўключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР. У перыяд нямецкай акупацыі яго зрабілі ўвогуле абласной сталіцай. Тыя часы сталі падмуркамі для фарміравання паняцця Ганцаўшчына. У межах Ганцавіцкага раёна сабраны розныя кавалкі тэрыторыі з пункту гледжання іх культуры. Асабліва выразнае адрозненне бачыцца паміж паўднёвай часткай раёна, якая належыць да палескай субкультуры, і паўночнай, якая цягацее да сярэднебеларускай субкультурнай паласы. Каб гэта праверыць, варта звярнуць увагу на адрозненне гаворкі жыхароў вёсак: дыялекты ад Любашава да Чудзіна маюць падабенства з літаратурнай беларускай мовай — у адрозненне ад выразна палескіх Раздзялавічаў, Макава, Ліпска... Нават незнаёмаму з дыялекталогіяй чалавеку лёгка вызначыць, да якой часткі раёна належыць той ці іншы жыхар. Прычым гэта размежаванне датычыцца не толькі культурнага, але і гаспадарча-эканамічнага аспекту, а таксама прыроднага. Як інфармуе артыкул Вікіпедыі, паўночная частка Ганцавіцкага раёна адносіцца да Баранавіцка-Ганцавіцкага агракліматычнага раёна, паўднёвая — да Пінскага. Тое ж і адносна глебаў, частка якіх — паўночная ўскраіна — адносіцца да Гродзенска-Ваўкавыска-Слонімскага аграглебавага падраёна (у адрозненне ад большай па велічыні паўднёвай часткі раёна, глебы якой тоесныя з пінскімі і лунінецкімі).

Якуб Колас пра згаданы падзел ведаў і канкрэтна яго ўсведамляў. Выразна тое прасочваецца па аповесці «У палескай глушы», падзеі якой многія лакалізуюць на так званай Ганцаўшчыне. Але ж — дамо слова аўтару, які, як мы ведаем, з'яўляецца прататыпам галоўнага героя Андрэя Лабановіча. Малады цельшынскі настаўнік вырашыў праведаць свайго старэйшага таварыша і калегу Максіма Турсевіча, які працаваў перад прыходам Лабановіча ў цельшынскай школцы, а затым перавёўся ў Любашава (вёска побач з Ганцавічамі). Варта заўважыць, што гэты пасаж меў месца ў рэчаіснасці. Галоўнае — тое, што абодва выдатна ведалі мясцовасць — як цельшынскае наваколле, так і любашаўскае. Як жа яны суадносілі тыя мікрарэгіёны? Цытуем:

«Лабановіч слухаў сябра, згаджаўся з ім, як бы Турсевіч выказваў яго ўласныя думкі. Разам з гэтым і нейкае засмучэнне закрадалася яму ў душу.

— Ведаеш, брат, — сказаў ён. — Вельмі добра хоць зрэдку сустракацца з жывым чалавекам, пагаманіць, адвесці душу. А то жывеш у глушы, дзе жывога слова не пачуеш, жывеш адзін. <...> І вось цяпер, калі я крыху адышоўся ад свайго Цельшына і зірнуў на яго збоку, то гэта глуш, што цікавіла мяне спярша, пачынае здавацца варожаю і наводзіць на мяне нейкае засмучэнне, як бы я ў ёй або яна ва мне чуем непрыязь. Чым болей жыву там, тым больш пачуваю, што затрымацца там на доўгі час у мяне не хопіць сіл.

<...>

Турсевіч, залажыўшы за спіну рукі, хадзіў ад сцяны да сцяны і таксама аб чымсьці думаў.

— Так, брат, там цяжка. Па сабе ведаю, якая там глуш, — прамовіў Турсевіч. — Вось ты вазьмі: якія-небудзь дваццаць вёрст раздзяляе нашы месцы, а якая розніца! Тут зусім іншае: не той выгляд прыроды. Мы заўтра пройдземся, паглядзім... Ніяк, брат, няможна раўняць Случчыны з Піншчынаю. І дзеці ў школе не тыя. У іх больш сардэчнасці, больш, ведаеш, гэтай чалавечнасці, а твае палешукі — проста звяркі».

(Збор твораў, Мінск, 2011, Т. 13, с. 78–79, 84–85.)

Якуб Колас выразна аддзяляе Ганцавічы — якой-ніякой цывілізацыі — ад Люсіна — відавочнай палескай глушы. Дарэчы, падчас настаўнічання К. Міцкевіча (сапраўднае прозвішча паэта) у Люсіне яшчэ Якуба Коласа (бадай, усім вядома, што гэта творчы псеўданім) не было, бо не было такога псеўданіма, як, зрэшты, і іншых, бо малады талент толькі спрабаваў сваё пяро. Ну не мог у саменькім пачатку XX ст. той, каго яшчэ няма (Якуб Колас), быць у тым месцы, якога таксама яшчэ няма — на Ганцаўшчыне!

Рэзюмуючы, сцвярджаю: Якуб Колас на Ганцаўшчыне не настаўнічаў. Яго лёс звязаны з Піншчынай, якой пісьменнік прысвяціў шмат вершаваных і празаічных радкоў. Канечне, вялікі Песняр ушанаваны ў Пінску і Пінкавічах. Але, як ні дзіўна, яго помніка ці хаця б бюста ў тых мясцінах... няма!

ВЕРШЫ

# ПАМЯЦЬ НЯДРЭМНАЯ

Генадзь БУРАЎКІН



***

*З гаманкіх сталічных станцый*
*У мурожны кут глухі*
*Цягне зноў і зноў*
*Вяртацца*
*Праз гады*
*І праз шляхі,*
*Каб знаёмы водар жытні*
*Удыхнуць у хаце зноў*
*І знайсці свае сцяжынкі*
*Між замшэлых валуноў,*
*На рыпучы ганак выйсці,*
*Згледзець бусла ў вышыні*
*І заціхнуць,*
*Як калісьці,*
*У дрымотнай цішыні,*
*І глядзець,*
*Як ля адрыны —*
*Не забылася яшчэ —*
*Слуп нястомны камарыны*
*Апантана мак таўчэ,*
*І адчуць,*
*Што не дарэмна*
*На вятрах чужых дарог*
*Ты*
*Для памяці нядрэмнай*
*Патаемна ўсё зберог…*

***

*Ну што паробіш,*
*Не магу іначай —*
*Не слухаючы мудрых засцярог,*
*Я зноў хачу*
*Прайсці сцягой юначай,*
*Адрынуўшы наезджанасць дарог.*

*Мяне туды ўсё кліча сэрца,*
*Быццам*
*Яно жыве там з даўняе пары*
*І я ні заблудзіцца,*
*Ні згубіцца*
*Не здолею ў сасновым гушчары.*

*Я ведаю:*
*Рачулка наша гіне,*
*Палянкі загубіліся ў быллі…*
*Быў іншы час.*
*Былі мы ўсе другімі*
*І дрэвы невысокімі былі.*

*І, можа,*
*З новай яваю сваяцтва*
*Я сумнаю душою не прыму,*
*А ўсё ж хачу*
*Вярнуцца ў свет юнацтва,*
*Хоць толкам і не ведаю,*
*Чаму…*

***

*Праплывае месяц лодкаю*
*Над разлівамі расы.*
*А жыццё —*
*Яно кароткае,*
*Як дабаўкі не прасі.*

*Як шчасліва ні галёкай*
*На сцяжынках між атаў,*
*Адспяваў сваё салоўка,*
*Адзвінеў,*
*Адшчабятаў.*

*Як вяртання ні выпрошвай,*
*Падганяе зноў і зноў*
*Цёплы вецер жытняй пожні,*
*Горкі водар палыноў…*

***

*Вы гэтулькі чакалі іх*
*І зблізку,*
*І здаля,*
*Іх профілі чаканілі*
*На новых медалях.*
*Вы іх прыйсці прасілі*
*Ва ўладу на пастой.*
*Вы верылі іх сіле*
*І спрытнасці крутой.*

*І вось яны*
*Нахрапам*
*Пасады занялі.*
*І стала бачна раптам*
*Што ўсе яны —*
*Нулі,*
*Што ў іх усё разлічана:*
*І клёк,*
*І благадаць,*
*Ды толькі за аблічамі*
*Асобаў не відаць,*
*Ды толькі справядлівасці*
*У іх зусім няма.*
*І вам з-пад іх не вылезці.*
*І шчасце сніць —*
*Дарма.*

*За золата прымаеце*
*Дзяшовенькую медзь…*
*Ну што ж,*
*Вы тое маеце,*
*Што так хацелі мець…*

***

*Пазбавіўшыся ад цароў,*
*Займелі мы такую ўладу,*
*Што прызначае нам сяброў*
*І вызначае нам пасаду.*

*Дыктуе правілы свае.*
*Каб не было ні ў кога лішку,*
*Усім наедак раздае:*
*Каму — чарпак,*
*А каму — лыжку.*

*Ніхто не трэба ёй,*
*Апроч*
*Тых,*
*Што з клыкастымі лычамі.*
*Нібы астрожнік,*
*Дзень і ноч*
*Стаіць нядрэмна за плячамі.*

*І марыць,*
*Каб усе*
*Сп'яна*
*Ляжалі перад ёю плазам…*
*А вы лічылі,*
*Што яна*
*Сыйшла ў нябыт*
*З царамі разам…*

***

*Няпраўда,*
*Што імгненна паміраюць*
*Бязгрэшнікі ў намоленай цішы.*
*Анёлы смерці*
*Доўга падбіраюць*
*Свой ключ*
*Да іх асуджанай душы.*

*Даюць спаўна спазнаць*
*Людскія мукі,*
*Бяссілле крыўды*
*І адчай трывог,*
*А потым*
*Ціха іх вядуць за рукі*
*Па той,*
*Апошняй з іх зямных дарог.*

*З аблокаў*
*Дазваляюць азірацца*
*На дзедаў крыж,*
*На матчына вакно,*
*На хмельнае шчасліваe юнацтва*
*І на сяброў,*
*Што здрадзілі даўно.*

*З плячэй здымаюць*
*Іхні скарб сабраны,*
*Сціраюць пыл,*
*Нязмыты пры жыцці,*
*І ў райскі сад,*
*Што за высокай брамай,*
*Толькі пасля ўжо*
*Клічуць увайсці…*

***

*Хто з дудой,*
*Хто з нябеснаю маннай,*
*Хто з тутэйшых,*
*А хто з чужакоў —*
*Колькі зведалі мы іх,*
*Падманных*
*І нахрапістых важакоў!*

*Як яны нам спявалі асанну,*
*Як кавалі для нас медалі,*
*Толькі б мы,*
*Неразумныя,*
*Самі*
*Ім жаданую ўладу далі!*

*Не даваў ім суцішыцца*
*Верад*
*Абяцанкі пустыя нізаць.*
*Нам кляліся павесці наперад,*
*Самі ж праглі вярнуцца назад.*

*І цяпер*
*На глухіх раздарожжах*
*Нерашуча глядзім з-пад рукі*
*І ніяк разабрацца не можам,*
*Нас куды завялі важакі…*

***

*Ах, палітычныя паяцы!*
*Ах, чынавенскія карчы!*
*Усё вам хочацца смяяцца.*
*Усё вам здзеквацца карціць.*

*З трыбун высокіх*
*І са сцэны*
*Вы пырскаеце ўсмак слінай,*
*Нібы ў вас досвед неацэнны*
*І справядлівасць за спінай.*

*Усіх, хто вам не даспадобы,*
*Гатовы спляжыць вы датла.*
*Абы заўжды было вам добра*
*І чарка поўная была.*

*А як вы кпіце на нарадзе:*
*Які запал,*
*Які напор!*
*І дзіўна аж,*
*Што ў заняпадзе*
*Сатыра ў нас да гэтых пор…*

***

*Над вячэрняй цішай хмызнякоў,*
*Над дрымотнай апусцелай шырай*
*Прашумела чарада шпакоў,*
*Што сабраліся ў далёкі вырай.*

*Іх пакліча ўранні шлях цяжкі*
*І не грэе ўжо мурожны выган,*
*Дзе стаяць панурыя стажкі*
*І блішчыць ракі халодны выгін.*

*Каля весніц лісця намяло.*
*І я ў шэры змрок гляджу нясмела…*
*Вось і лета позняе маё*
*Лёгкімі крыламі адшумела…*

***

*О, прысады мінскія,*
*Балюстрады нізкія,*
*Кветнікі з цюльпанамі,*
*Лаўкі пад каштанамі.*

*Там ішлі мы поначы,*
*Ласкай сэрца поўнячы,*
*Дзелячыся з ценямі*
*Снамі-летуценнямі.*

*Там маўчаць апоўначы,*
*Нашы клятвы помнячы,*
*Над вадою віснучы,*
*Вербы каля Свіслачы.*

***

*Духата,*
*Як спрут,*
*Сціскае сэрца,*
*Блытае і плавіць думкі ўсе.*
*І краплісты дождж,*
*Што з неба сеецца,*
*Ні на міг палёгкі не нясе.*

*Сціхлі птушкі.*
*Апусцілі лозы*
*Лісце перагрэтае ў раку.*
*Нават камары*
*І тыя млосна*
*Раптам пахаваліся ў цяньку.*

*І ўжо ў зморы бачыцца,*
*Як дзіва,*
*Што да сонца*
*Ў бляклай сіняве*
*Немінуча,*
*Грозна*
*І маўкліва*
*Хмара навальнічная плыве.*

***

*Спяшаюся дарогай торнай*
*Да хат,*
*Прымоўклых між прысад,*
*І радуюся,*
*Як прасторна*
*Мне расхінуўся далягляд.*

*Плывуць ужо*
*Пад небам чыстым*
*У край далёкі жураўлі.*
*І так лагодна і ўрачыста*
*Спакой пануе на зямлі.*

*Жнівом падстрыжаныя нівы*
*Яшчэ змаркотнелі не ўсе.*
*І ветрык,*
*Лёгкі і гуллівы,*
*Мне ўслед саломінку нясе…*

***

*Вось нарэшце ўжо зіма адужала*
*Мокрую, расхрыстаную восень.*
*І дыхнула з неба*
*Колкай сцюжаю.*
*І ў вазах*
*Званчэй скрыгочуць восі.*

*Зранку*
*Праяўляюцца на вокнах*
*Першыя марозныя узоры.*
*Кроплі зледзянелыя*
*На вольхах*
*Свецяцца,*
*Як выстылыя зоры…*

АПОВЕДЫ

# РАЗНАРАДКА

Ігар СІДАРУК

## Маска

Сярожка Вечарок быў з прыбабахам.

З канкрэтным. Хоць, бывала, мікіціў так, што іншаму — толькі здзівіцца. І аднойчы Сярожка знайшоў... спецназаўскі рыштунак. Вы не паверыце, але менавіта так. Старонкі афіцыйнай хронікі глыбакадумна замоўчваюць, якім чынам казённая, выдаваемая па ўсіх строгіх прадпісаннях, амуніцыя трапіла на адзінокую лавачку ў гарадскім парку. Аднак дурнаваценькі Вечарок натрапіў на яе менавіта тут.

— О, бо! Ласты, маска, аўтаматы! — задаволена пусціў пузыра ён, падграбаючы гэта ўсё з лавачкі. Хоць, ясная рэч, ніякіх ластаў ды аўтаматаў там не было. А вось маска, а яшчэ хабэшны камбез, на таўшчэзнай падэшце чаравікі, гумовы дручок, кайданкі ды нейкая нараменная торбачка там былі дакладна.

І што думаеце? Сярожка гэта ўсё хутка схамячыў ды пашнураваў дахаты? Каб жа так. Мо тады і не здарылася б усяго таго, што здарылася ў наступныя паўгадзіны.

Хоць ён спачатку і напраўдзе даволі хутка падабраў усё. Але потым, пусціўшы чарговага пузыра ды паўтараючы як цвёрдую мантру «Ласты, маска, аўтаматы!», пашкандыбаў зусім не дахаты, а ў бліжэйшы зараснік голага бэзу.

І выйшаў адтуль Вечарок... ужо не мясцовым жыхарочкам, відавочна бахнуты пыльным мехам, а, лічыце, сапраўдным спецназаўцам. Такі ўвесь камуфляжысты, класны, падцягнуты. Раз-пораз паляпваючы гумовым дручком, заціснутым у правай руцэ, па далоні левай. Хіба вочы яговыя неяк дзіўна блішчэлі скрозь вузкія прарэзы чорнай маскі, але хто ж мог пад маскаю дужа бачыць той ненармальны бляск?!

— Стаяць, маць! — яшчэ здаля зароў Сярожка на хударлявага чалавека, які паказаўся на паркавай сцяжыне. — А ну стой, дзе сказалі, быдлячы яйкадаў!

Мужчына спалохана прыпыніўся. Азірнуўся па баках, угледзеўся перад сабой. На дарожцы паказаўся яшчэ адзін мужчына, — таксама спыніўся. Абодва, не ўбачыўшы болей нікога, акром чалавека ў камуфляжы, пераглянуліся ды спачатку павольна, а потым усё болей шпарка прадоўжылі рух.

— Я сказаў! — здзівіўшыся (а можа і не) такой нахабнячае смеласці, уладна гарлаў Вечарок. — Стаяць, маць у рыла! Імем закона і ўлады правіцельства! За парушэнне абшчэственных праў і каманды буду біць на гаўно, мудзілы!

Мудзілы, аднак, і не думалі спыняцца.

Наадварот, яны нават паскорылі хаду. Ані не зважаючы на рыкі, крыкі й мацюжэнствы чалавека ў казённае вопратцы. Яны імкліва набліжаліся да яго, і нават у няяркіх апошніх промнях вераснёвага сонца было бачна, як іхнія твары гэтак жа імкліва наліваюцца чырванню.

Сярожка між тым ужо рэзка размахваў перад сабою направаналева дручком:

— Я вашы сучыя зяпы зараз на юху скурвячу! У роты пойдзеце, арыштанцкія паскуд...

Апошняе слова так і не здолела ўбачыць белы свет. Паколькі яго з усяе моцы заляпіў назад у Сярожкаў рот адзін з мужыкоў. Адразу пад маскаю з рассечанай губы цвыркнула юха, толькі Вечарок гэтага пакуль не разумеў.

— Закрый сваю халяву! Закрый сваю халяву! — малаціў і малаціў яму па твары той, хто першым урэзаў па зубах. Другі не адставаў таксама: з усяго разбегу ўпароў нагою Сярожку ў пах. Адскочыў, разбегся, удубасіў яшчэ, потым яшчэ. Прычым на нагах у яго былі зусім не лёгкія чаравікі, а цяжэзныя боты. Рабочая вопратка, словам.

Сярожка пераламаўся напалам, і першы мужчына выхапіў з яговых рук гумовы дручок.

— Мы табе быдла пакажам, морда спецназаўская! Зараз мы з тваіх яйцаў баўтушку згатуем, свіння! — ён так і цэліў патрапіць дручком Вечарку спаміж ног, а другі ўжо ахаджваў сваімі цяжэзнымі ботамі яму твар.

— Ну! Ха!.. Ну! Ха!.. Аха!.. — нарэшце, гакаючы, раскрыў рот і гэты, увесь час толькі моўчкі малоцячы Сярожку нагамі. — Да ўлады дарваўся, сволач?! Папаўтэ з круасанамі жарэш, законны выкармак?!.. Гэта не ты нас на гаўно будзеш біць, гэта мы цябе ўласным тваім з крывёй напалам карміць будзем! Га!.. — усё гакаў і гакаў, міжволі спрабуючы падладавацца цэлкія ўдары ботаў пад рытм сваіх словаў другі.

— А то каго вы тут?.. — падляцеў раптам да іх нейкі рабаваты маладзён.

— Ды спецназаўца... Па парку нечага адзін сноўдаўся. Ляжаць, сволач! Разборкамі яшчэ пагражаў!.. — на момант адарваўся, а потым зноў з усёй адмашкі ўперыў дручком у твар Сярожку першы мужык. З-пад чорнай маскі, з-пад якой і без таго ўжо цурчэла чырвоная юха, кроў лінула струмянямі.

— Адзін, кажаш? — хіжа скрывіўся маладзён, імгненна закотваючы рукавы сваёй заношанай курткачкі. — Во, поскудзь пагонная! Дайце ж і я! Дайце ж і я генеральскую познамку яму пакіну! — і ў наступны міг гумовы дручок ужо апынуўся ў яговых руках і стаў рэзка апускацца на галаў, рэбры, спіну прыдурачнага Сярожыка. — Гэй! Усе сюды! Спецназаўца мачыць!

І, нібыта і праўда, ледзь не пад кожным кустом, ледзь не за кожным дрэвам хаваліся тыя, хто толькі й чакаў такой каманды: яшчэ праз якую хвілю чалавека ў камуфляжы апрацоўвала цэлы натоўп. Ужо ніхто не крычаў: малацілі, білі, крывавілі моўчкі. З нялюдскай жорсткасцю, безразважнасцю ды раз'ятранасцю. Не крычаў і сам Вечарок. Прышпілены халоднымі кайданкамі да лавачкі, каб нікуды не збег (куды ён мог збегчы з пераламанымі ўжо ледзь не ўсімі косткамі?!), ён адно ціха енчыў, з кожнай хвіляй усё цішэй і цішэй...

А яго ўсё білі, раз'юшана, чым толькі можна, страшна. Білі да той пары, пакуль крывавае, бязвольнае месіва не аціхла, не замоўчала.

— Хлопцы, досыць! Здаецца, усё. Конча... — матнуў рукою той самы мужчына, якога першым спрабаваў спыніць на алейцы пераапрануты ў «спецназаўскае» Вечарок.

Людзі стаялі, горача дыхалі, у многіх трэсліся рукі. Нейкая бабулька, якая невядомым чынам патрапіла ў натоўп, на «злёце» махнула сумачкай і раптам давалі слушна прамовіла:

— Сыночкі! Вы хоць гляньце, каго да чарговага звання прадставілі...

Нехта з мужчын, крыху марудзячы, схіліўся над нерухомым целам, пацягнуў маску з прарэзамі. Адкрыўся збіты, страшны, скрываўлены твар. На перабіты лоб упала першая кропля халоднага восеньскага дажджу.

І тут самы блізкі ад трупа раптам злосна вылаяўся:

— Тваю маць! Сярожку Вечарка замачылі... От жа ёлупень!

Натоўп моўчкі стаяў над мястачковым дуралеем. Усе яго ведалі. І таму ўсеагульная, знішчальная злосць не аціхала, не разбівалася, а наадварот — расла, крэпла, уздымалася шалёнымі бурунамі. Яна... брала ў палон, працінала, захоплівала ўсіх, і супрацьстаяць ёй было цяжка, немагчыма, надрыўна. Твары, не гледзячы на тое, што халодны восеньскі дождж з кожнай хвіляй мацнеў, усё болей наліваліся гэтай злосцю, чырванню, немінучым наканаваннем. Ніхто ўжо не мог стаяць. Рукі пацягнуліся да апалых сукоў, нехта выломваў доўгую галіну, хтосьці выкаваўраў камянюкі з тратуарнае брусчаткі.

Натоўп зарухаўся, завіраваў, над галовамі ўдалячынь паляцелі неўразумелыя, рэзкія крыкі.

— Трымаць шыхт! Трымаць шыхт! — толькі й можна было разабраць некага, хто хоць як спрабаваў прыдаць парадку няўклюднай людской хадзе.

— А мы што трымаем, дзядзька Мірон?..

Людзі валілі мачыць. За спінамі ў чорным парку сек дрэвы халодны дождж і страшна крычалі вароны.

> Натоўп зарухаўся, завіраваў, над галовамі ўдалячынь паляцелі неўразумелыя, рэзкія крыкі.
> — Трымаць шыхт! Трымаць шыхт!



Ігар Сідарук

## Разнарадка

— Прыйшла чарговая разнарадка... — старшой на нейкі час задумаўся. — Трэба вырашаць, хто гэтым разам...

Мы маўчалі. Сапраўды, сітуацыя выглядала складанай. Усе з нашага невялічкага калектыву ўжо там былі.

— Можа, Пятро?.. — урэшце страпянуўся старшой. — Як вы глядзіце?

— Пятро? — азвалася першай Марыя. — Можна было б... Але ўспомніце, якія каленцы ён там мінулым разам выкідваў. Нават сорамна было слухаць, як потым распавядалі.

— А ты? Незамужняя, дзеці не плачуць, — старшой утаропіўся ў Марыю.

— Я? Ды мне і тут мужчынскай увагі хапае. Там, можа, і цікавей, але колькі можна: мінулым разам Анютку замяніла, ёй новую фрызуру было шкада...

— А Макей? — падаўся наперад Лявон. — Ён, здаецца, мужык цвярозы, цярплівы. Ніколі не скардзіцца і за дваіх калі трэба цягне...

— Дык цягне, — уставіла сваю рэпліку ўжо Анютка. — Але зразумейце і яго: з хворымі рукамі не вельмі лапатай намахаешся. А яшчэ ж пагрузка-разгрузка...

— Давайце тады Тодара, — падаў са свайго кутка рэпліку франтаваты Серж. — Успомніце, гэта дзякуючы яму нам мінулым разам падзяку абвясцілі.

Толькі не мог і Тодар. Паколькі раптам ні з якой такой прычыны надумаў ажаніцца — то не маглі ж мы яму сапсаваць такое маленькае свята.

Урэшце, каторы раз перабраўшы амаль усіх ззаду наперад і спераду назад, грамада неяк падазрона сцішылася. А потым усе разам рашуча павярнуліся да мяне.

— А Ігарок? Ты ж таксама там быў?

— Быў... — неахвотна адказаў я.

— І як?

— Нармальна. Як заўсёды.

— Дык што? Можа, і гэтым разам? — старшой дапытліва глядзеў на мяне. Не трэба было быць вялікім празорцам, каб здагадацца, што ён чакае толькі станоўчага адказу.

Але і мне, вось так адразу, нічога з гэтага не выгадаўшы, таксама не хацелася згаджацца. Таму як мог трымаў паўзу. Усе напружана чакалі, нібы здранцвелі.

— Ладна, — урэшце як бы нехаць вымавіў я, паглядзеўшы ва ўпор на старшога. — Але толькі адна ўмова.

— Якая?

— Калі вярнуся, каб маё месца перасунулі да вакна. І каб там стаяў поўны заварнік свежай гарбаты.

— Добра, усё будзе! — старшой адразу з бачнай палёгкаю правёў тыльным бокам далоні па ілбе, нібы складаная задача вырашылася сама сабою. — Мы не толькі табе поўны заварнік потым паставім, мы табе нават на дарогу таго-сяго збяром!

— Ну а як жа! А то!.. Яшчэ не было такога, каб сваіх без нічога пасылалі!..

Усе адразу весела загаманілі, зарухаліся. Нехта паляпваў мяне па плячы, хтосьці спрабаваў распавесці надзвіва смешную, як яму здавалася, показку, нехта звыкла і хутка збіраў тое-сёе ў маленькі паходны заплечнік. Моўчкі паназіраўшы за ўсім гэтым, я толькі крыху ніякавата ўсміхнуўся і выйшаў вонкі.

За вузкім лазам зямлянкі валіць моцны снег. Я шчыльней захінаю сабачую скуру ў сябе на грудзях, паколькі да лагера не маленькі шлях — кіламетраў дзесяць ці нават дванаццаць. Можна, канешне, паспрабаваць не пайсці, збочыць, убіцца ў цёмны лес. Аднак усё гэта будзе абсалютна дарэмным: сцяжына густа абсажана нізкарослымі дрэўцамі, па якіх перакінуты нябачны, аднак гэтак жа густа абмазаны смертазабойчай атрутаю калючы дрот, а на кожнай сасне паабал сцежкі дый па ўсім лесе сядзяць нападатове лучнікі, і іхнія скуры куды цяплейшыя за маю старэнькую, зашмальцаваную ды з немаленькімі дзюркамі, сабачую.

Таму я толькі перакідваю з аднаго пляча на другое ашчадна сабраны грамадой заплечнік ды прыспешваю хаду. Урэшце, калі хутчэй дабяруся туды — тым хутчэй уволю пап'ю потым свежай гарбаты.

Няхай і заваранай на мінулагодніх, але з такім прыемным пахноццем, зёлках.

ВЕРШЫ

# ВОСЕНЬСКІЯ ТАНКІ

Анатоль ІВАШЧАНКА



Фота Валерыя Куставай

## чалавек сядае ў туарэг

*чалавек сядае ў туарэг*
*запускае плаўна рухавік*
*ён цяпер глядзіць на свет паўзверх*
*танаваных шыбінаў сваіх*

*чалавек сядзіць у туарэгу*
*і ужо праз лічаныя хвілі*
*раптам падаецца чалавеку*
*быццам рухавік аўтамабіля*

*з помпай і сістэмай клапаноў*
*не тасол па патрубках ганяе*
*а па колах круціць зноў і зноў*
*кроў жывую. так — жывую кроў!*

*і не патрубкі зусім, а капіляры*
*у жалезным чэраве пульсуюць*
*чалавек здымае акуляры*
*чалавек сябе не кантралюе*

*ён дрыжыць, не могучы пацэліць*
*пальцамі вільготнымі у кнопку*
*каб адсунуць шкло. па кволым целе*
*прабягае новая дрыготка*

*чалавека ў туарэгу йрве*
*проста на шыкоўную аздобу*
*на стырно і скураны фатэль*
*а ўнутры, ў прамасленых вантробах*
*трохлітровы рухавік раве*

*чалавек сядзіць у туарэгу*
*туарэг сядзіць у чалавеку*

## ***

*Калі мы разам — у нас маразм.*
*Рыгор Барадулін*

*Калі мы разам, —*
*у нас маразм.*
*Калі нас трое, —*
*няма настрою.*
*Як нас чацвёра, —*
*наогул гора.*
*Калі пяцёра, —*
*я не ў гуморы.*
*Як мы ў шасцёх, —*
*то ўсё нам пох.*
*Як нас сямёра, —*
*па горла мора.*
*А як васьмёра, –*
*раблюся хворы.*
*Як дзевяць нас, —*
*саўсім атас...*

*І гэтак далей —*
*народ ёсць зграяй.*

## маЛітва

*Калі ўдача цябе пакіне,*
*і жана дарагая, і дочкі,*
*за гарой застанецца Вільня,*
*за гарою прачнешся адноўчы...*
*Тацяна Сапач*

*за вокнамі мулкі вечар*
*і стома сядае на плечы*
*і снежаньская халадэча*
*і ў сэрцы зеўрыць пустэча*

*далонь на касцельных парэнчах*
*пад лаваю нечыя рэчы*
*і чысты позірк хлапечы*
*і свечы*
*свечы трапечуць*

*ля гэтых старэнькіх парэнчаў*
*ты раптам ціха укленчыш*
*у сэрцы зіма й халадэча*
*вусны бязгучна шэпчуць*

*«О, Літва, — мая малітва,*
*О, Вільня, — мая багіня,*
*О, Вільня, — мая вайна…*
*Тут кажуць Вільнюс і Мінскас,*
*тут Вітаўтас і Гедымінас*
*і ў барасах танны гінэс*
*Ты, Вільня, — мая віна?»*

*(зрабіўшы па барасах шпацыр*
*у свеце інакшым убачыў*
*усё і крыху перайначыў*
*паэт свайго верша фінал)*

*о, Вільня, — мая багіня*
*ты, Рыга, — мая вярыга,*
*Заслаўе — маё зласлоўе*
*Стакгольм — мой адвечны боль*

*Гародня глядзіць гаротна*
*у Вільні не рохкаюць свінні*
*за Мінскас мы ставім мінус*
*паўзе пакрысе мяжа*
*у Мінску я маю прапіску*
*у Менску — мая душа*

## краіна сэканд-хэнду

*Гэта краіна паўночы без сну...*
*Дзмітры Плакс*

*бэушныя машыны*
*бяздушныя жанчыны*
*бэтэшныя навіны*
*гэбэшная краіна*

*бэушныя жанчыны*
*бяздушныя машыны*
*гэбэшныя навіны*
*бэтэшная краіна*

*бэушная краіна*
*бяздушныя навіны*
*ну і г.д.*

## верш несвабоды

*1.*
*баюся пісаць каб не быць перапошчаным*
*баюся казаць каб не быць цытаваным*
*баюся выходзіць з дому*
*каб не быць развіртуаленым*
*баюся ўключаць зомбаскрыню*
*каб не пабачыць сябе*
*сярод ахвяраў этнічных чыстак*

*пабойваюся здымаць слухаўку*
*каб не пачуць пра хваробу чарговае*
*каляжанкі*
*якую трэба замяніць*
*каб засеяць разумнае-добрае-вечнае*
*у засераныя душы і затраханыя мазгі*
*дарагіх маіх цехнароў*

*баюся прыводзіць дзетак*
*у дзіцячы садок*
*каб увечары*
*не пабачыць у іх вачох*
*жалобу ручных звяркоў*

*2.*
*мыю посуд каб супакоіцца*
*калі вольныя рукі*
*калі зусім сплінова*
*сядаю за верлібр*
*ды я луплю іх ледзь не штодня*
*гэтыя вершы несвабоды*
*(добра што ў галаве)*
*калі шалёная сучка зверху*
*спускае на маіх дзяцей*
*свайго сабаку*
*калі штурмуюць амбасады*
*тыя хто ніколі не чуў*
*(даруйце, рыфма)*
*пра Курапаты*
*калі нацыянальны гонар*
*ёсць суцэльным хорарам*
*і знакамітыя міты*
*адно дзеля мітынгаў*
*калі абвяшчаецца чарговая бяздарная*
*перамога Потнага Джэка*
*калі ў позірках*
*нават самых лепшых*
*бачу сыты супакой*
*сыты супакой*
*тупы супакой*
*калі…*
*…*
*хрышчу паветра*
*хрышчу тэлескрыню*
*заўжды перахрышчваю*
*галоўкі дзетак*
*перад сном*
*хтосьці скажа, што ад майго праваслаўя*
*добра патыхае забабонамі…*
*хай так*
*хай так*
*high-tech*

**верасень 2010 г.**

## два ў адным

*бы змяя назапашвае яд*
*я захоўваю гукі і пахі*
*назапашваю новыя смакі*
*бы змяя — назапашваю я…*

*бы пчала што збірае пылок*
*абліпаю старымі цытатамі*
*прыкладаю да рулі сціло*
*і страляю радкамі кудлатымі*

*а бывае —*
*так хочацца проста кагосьці абняць*
*а бывае —*
*гатовы дарыць свае скарбы направа-налева*
*і гатовы ляцець,*
*але мушу нязрушна стаяць*
*і маўчаць праглынуўшы і закаркаваўшы*
*пачуцці*
*і словы*
*і спевы*

*я — змяя*
*час скідаць састарэлую скуру*
*я — пчала*
*час счышчаць закарэлы пылок*
*пажыццёвы студэнт*
*у зацягнутым пошуку гуру*
*два ў адным*
*ідыёт ды гулец*
*(каб у рыфму — «ігрок»)*

## восеньскія танкі

*нічыйны малліннік ля дарогі*
*канец верасня*
*усё лета аб'ядаліся, закатвалі...*
*цяпер жа —*
*немагчыма накаштавацца*

## ***

*кнігу, што дасталася ў спадчыну,*
*паклаў у кішэнь*
*гаспадар яе даўно спачыў*
*ён руплівa збіраў сваю вялізную бібліятэку*
*не дарма?..*

## ***

*вільготныя капелюшы*
*гномаў-чырвонагаловікаў*
*паказваю дачцэ ў высокай траве*
*а яна плача:*
*чаму не я іх знайшла!..*

## ***

*над бярэзнікам дзе мы блукаем*
*таварняк вязе вагоны*
*расфарбаваныя стракатымі графіці*
*яшчэ вышэй паўзуць цяжкія*
*восеньскія танкі*

## ***

*томік ісікавы такубоку*
*так і не дастаў*
*з кішэні*
*захоплены пошукам*
*і нашто браў?*

## ***

*вяртаючыся з узлеску*
*сустракаем трох кабет рознага веку*
*у розных месцах*
*але падобных рыхтык дачка маці і бабуля*
*быццам з босхаўскіх палотнаў яны сышлі*
*ў мае радкі*

## ***

*восень.*
*час засушваць пачуцці*
*укладаючы іх гербарыем*
*між старонак*
*старое кнігі*

**верасень 2011 г.**

ФРАГМЕНТЫ

# ДЗЯЎЧАТКІ

## УРЫВАК З РАМАНА «ГУЛЬНЯ Ў КАХАННЕ»

Алесь МАСАРЭНКА



Адэса. Дом творчасці. Жыву ў пакойчыку-келлі. Усё было б няблага, каб не ляпалі час ад часу дзверы — насупраць жаночая прыбіральня.

Зайшлі да мяне ў пакой дзяўчаты. Студэнткі. Недзе паблізу тут, у прыадэсі, цыбулю ўбіраюць. Загарэлыя. У лёгкіх спадніčках і белых, акурат парусінавых лёльках. Грудзі вольныя, без ліфчыкаў. Колькі разоў бачыў іх на пляжы. Учора, калі праходзілі міма, спыніліся, і адна з іх, асадзістая, з крутой попкай і зграбнымі ножкамі, заўважыла: «О, девочки, нашла! Как раз по мне пузанчик, — рагатнула, нахілілася і паклала мне на жывот цукерку. — Угощайся. Поднимает потенцию. Можешь сейчас скушать, а лучше — перед сном».

І вось гэтая, што пачаствавала цукеркай, першай павіталася і, падалося, больш чым зацікаўлена спытала:

— Вы из Минска? — Той раз не «выкала», а тут нечага ветлівай стала, рахманай.

— Адтуль.

— Слышала, у вас там свободно в продаже мутоновые шубы. Я оставлю вам свой адрес, и вы мне купите шубу.

— І ўсяго толькі? — здзіўлена рагатнуў я. — Ды за ваш адрас нават старэнькі кажух ніхто не ўступіць.

Трэцяя пасміхнулася і патлумачыла:

— Вы Галине шубу справите, она приедет и в знак благодарности останется с вами навсегда... Помешена на мутоне.

— Прабачце, бабра бачыў, норку, ваўка, лісу, барсука, а з мутонам не давялося сустрэцца. Гэта што за звер такі?.. — Я спрабаваў разыграць з сябе прастафілю — знарок не перайшоў на расійскую мову, і дзяўчаткі, здаецца, паверылі не столькі ў маю дрымучую недасведчанасць, як у закаранелага нацыянала — моўчкі выпырхнулі з пакоя і са смехам рынуліся ў процілеглую «ўстанову».

Жывуць яны недзе паблізу ў спартыўным лагеры. Шкада, я так і не спытаў, якім відам спорту захапляюцца. Але, чым бы не займаліся, толькі ж яшчэ і працуюць, нейкі заробак будзе. Мартын Усвятка казаў, што нібыта сераду і суботу — аддаюць трэніроўкам, у нядзелю — вольныя, адпачываюць, а ўсе астатнія дні — занятыя на ўборцы цыбулі.

Дзяўчаткі й мяне бадай заінтрыгавалі. Усвятка, вунь, сямейны, а так смакотна паглядвае на іх вабныя станікі, аблізваецца.

Ды нечага ж, во, паскакухі — з чаго б гэта? — зазірнулі й збеглі, нават дзверы не прычынілі як след, і мне відаць грудок іх заплечнікаў, чую іх прыглушаныя галаскі й посмех з прыбіральні. На пляжы былі, бо сёння нядзеля, іх вольны дзень. Мяне там не ўбачылі, то зазірнулі праверыць: ці не з'ехаў куды на экскурсію. Якія руплівіцы — няйнакш узялі на прыцэл!

Я да сняданку трохі пазагараў, паплаваў — і за стол. Мартын Усвятка з сямействам матануў у Севастопаль. Звычайна экскурсанты вяртаюцца недзе вечарам.

Маладая манашка, якая жыве ў такім жа акрайнім, як і ў мяне, пакойчыку, але насупроць мужчынскай прыбіральні ў другім канцы калідора і працуе ў гэтым драўляным аднапавярховым корпусе прыбіральшчыцай, чутно было, прыбягала паўшчуваць дзяўчатак, каб лішне не буянілі. Заклікала іх паводзіць сябе прыстойна.

Я тое-сёе чуў з яе заклікаў:

— И ради бога — не курите!.. Писатели работают, а вы ржёте на весь коридор, ругаетесь... Справили нужду — и вон, чтобы духу вашего тут не было!

Вызверылася на парушальніц ужо не толькі цішыні й расійская белетрыстка Варвара Акломіна. Аказваецца, дзяўчаткі абмылак збэйхалі, і ёй не было чым рукі намыліць. Бач, не магла пачакаць, ухапілася няўцерпа ў прыбіральню і знайшла прычыну для крыку: паквапілася на казённы кавалак мыла. Нібы свайго не мае... Пажылая дама. Прыехала з расійскай глыбінкі, піша ў асноўным уначы, а ў светлы час спіць.

Перапала ад гэтай зубастай фурыі колькі дзён таму і мне — не абмінуў яе ўвагі. Праўда, тут я сам вінаваты. Яна спрабавала падсунуць машынапіс сваёй аповесці, каб прачытаў і, вядома ж, пахваліў. А я, бойтух, як бы няўдумна, з ходу ляпнуў, што расійскую мову зусім слаба ведаю, Талстога і Гогаля чытаў у перакладзе на беларускую. Мала гэтага — назваў яе па-свойску, проста Акімаўнай, без Варвары. І яна, бы перагрэты самавар, нечакана пырснула бурклівым кіпнем: «Я, молодой человек, — Варвара Акимовна. Не забывайте. Вы ещё под столом во весь рост ходили, в штанишки писали, а я уже свой первый роман издала. Так-то!».

Нажыў сабе ворага. Ды яшчэ за адным сталом сядзім, насупроць. Во, хоць куды ў іншае месца перабірайся! Але ж — цярплю, стаў цішэй за ваду, ніжэй за траву: сёрбаю ціха, без цмокаў і шамкання, адно каб паказаць гэтай драпежніцы, што і я культурны. Міжволі падумалася, што Валянцін Пікуль, пэўна, таму і не ездзіць па ялтах ды адэсах, каб не бачыць такіх вось арыгіналак з пяром у падхвосці.

Бадай адразу, як толькі спадарыня Акломіна замкнулася на ключ, дзверы ў маім пакойчыку расхлiснуліся наўшыр і прагучаў ласкава-прыемны галасок бялянкі:

— Можно?

— Калі ласка! — выгукнуў я наўздзіў весела, чаго сам ад сябе не чакаў.

Яна зайшла першаю і кінула свой заплечнік у куток, ля парога. Следам, як маладыя гускі, ускочылі й дзве сяброўкі яе, пакідаўшы заплечнікі туды ж сама.

— Га-га-гы-га-го... Мы — снова к вам! — не адразу, але ўсё ж вылавіў сэнс з іх гогату.

І вось гэтая, таравітая на цукеркі, папрасіла, каб адшкадаваў ёй цыгарэтку.

Я лена аднекнуўся:

— Прабачце, Галя, не палю.

— А вы сходите в главный корпус и попросите у того дядьки, с которым на пляже бываете, на его дочерей пялитесь... Мне самой неудобно у него просить.

— А ў мяне — прыгна?

— О, вы — не ровня ему. Вас можно в мужья брать, — пасміхаецца Галіна-бялянка, даволі кідкая, прыгожая, адно вочы трохy як кашэчыя — жоўтыя абадкі наўкол зрэнак, і як нешта жывёльнае ў іх пракідваецца, нейкая не дужа каб і празмерная жарсць з прымешкам настырнасці.

Дзве яе напарніцы — сярэдняй красы, праўда, вочы ў аднае і другой нечага ўтомныя, як не даспалі дзеўкі, і я, калі б которая з іх папрасіла легчы ў мой ложак, гатоў бы й пашкадаваць небараку. Адно не гэтую настыру з абаяльна-грозкаю попкай (во, зацыкліўся!).

— Так вы, молодой человек, может быть, и водку не пьете? — спытала адна з «утомных», станістая, у ружовым сарафанчыку з белымі фальбонамі й такім жа раменьчыкам, што, здавалася, аж занадта сціскаў гожую, бадай асіную, талію; пакінуўшы сандалікі на падлозе, яна ўвішна скочыла на ложак, што мяне больш уразіла, чым здзівіла: «Гэта ж прачытала мае думкі!».

**Валянцін Пікуль, пэўна, таму і не ездзіць па ялтах ды адэсах, каб не бачыць такіх вось арыгіналак з пяром у падхвосці**

Я адклаў асадку і выйшаў з-за стала. Нахіліўся над ёй і як не ў самае вушка шапнуў:

— Чаму ж — гарэлку ў добрай кампаніі папіваю. Хоць і не так часта, як хацелася б. — І знарок паўтарыўся, ужо гучней: — Толькі ў добрай кампаніі.

— А мы — как, разве не подходим? — падала галасок трэцяя з іх; пры гэтым яе востры пагляд балюча кальнуў мяне ў левае надброўе — аж сляза нагарнулася. — Мне показалось, что без нашей компании вам сегодня никак нельзя.

«Ведзьмы нейкія: адна паглядам коліць, другая думкі чытае». І я паспяшаўся з адказам:

— Так, кампанія гарная — у сне не прысніш такой! — І далей — як мага ветлівей запрасіў: — Сядайце, красуні, дзе каму зручней. — З посмехам дадаў толькі што прыдуманае: — Жанчына ў госці йдзе і за пазухай два шчасці нясе. У келлі маёй — бачыце? — аж пасвятлела!.. — Гляджу на бялянку, бо нешта ж і яна мусіць учыніць — у насцярозе, усё роўна як чакае зручны момант для нападу. Каб выбіць з яе галавы дурное (можа, і прыемнае для мяне: жаночая душа — акіян!), знарок ласкава звяртаюся да яе непасрэдна: — Калі я кавай пачастую — вы не суп...рацьー? — Нечага спатыкнуўся на слове і адчуў, што ласкавы тон майго голасу атрымаўся бадай штучным, няшчырым — як адчапное сказаў, знароч, каб менавіта яна, закапёршчыца, зразумела, што няма ў мяне ахвоты цацкацца тут з нейкімі блудзёнамі, дагадзваць: з чым прыйшлі, з тым, маўляў, і пойдзеце. Каб не падумала так — паспяшаўся ўнесці яснасць, патлумачыў: — Тут хоць і Дом творчасці, а кавай нясмачнай пояць.

— Нам бы ваша кухня! — не пагадзілася закапёршчыца. — Мы на жареный лук с салом уже глядеть не можем. А на компот из сухофруктов — тем более.

— За каву — дзякуй, з ахвотай накінемся, — сказала тая, што чытае думкі, па-беларуску. — Распушчальная?

— Молатая. Натуральная.

— А мне распушчальная падабаецца.

— Ой, Тоня, сама ты — распушчальная! — махнула рукой бялянка. — Какая же ты филологиня, если коверкаешь слова?

— Сама — такая же! — зласліва лыпнула вачыма Тоня Утомная (во, празвішча само легла на душу, то і няхай, пакуль сапраўднае не ўведаю) і павалілася спіною на ложак, выгукнула: — Исподлобья — в три слова пишешь, грамотейка.

Ад здзіву я ажно плячыма цепнуў і запытальна глянуў на бялянку. Яна патупіла вочы й адступілася ўбок.

— Не лайцеся, дзяўчаткі, — сказаў я прымірэнча і спытаў Утомную:

— Ты — беларуска?

— Так.

— А дзе жывеш?

— Мае бацькі нядаўна з Магілёва ў Кішынёў пераехалі. Тата — вайсковец.

— Чую, мову добра ведаеш.

— Мама — настаўніца, скончыла філфак, беларускае аддзяленне.

— Во!.. Я таксама скончыў філфак. І таксама беларускае аддзяленне. Дык мы тут, як я зразумеў, — усе філолагі?

— Мы — студэнты Кішынёўскага ўніверсітэта. Філолагі, трэці курс. — Тося не хавала радасці, што аказалася зямлячкай.

Але ж і мне выраз «распушчальная кава» не да ўпадобы, ржа слых, бо няма ў ім і блізка беларускасці, таму без нейкага там утою сказаў:

— Ведаеш, зямлячка, а кава няхай усё ж будзе растварымай.

Што гэта? Бялянка (але ж і пахватная кабыліца!) падскочыла і чмокнула ў шчаку — мяне аж падкінула, бы ад улёку.

— Слышала, зазнайка?!. — узнёсла галёкнула і тоўхнула Тоню ў плячук. — Ишь, улеглась!

— Не трогай меня, командёрша! — Тоня павярнулася на бок і заплюшчыла вочы, сцішылася.

Я сказаў да бялянкі:

— Сядай, Галіна, за стол, бяры асадку і ліст паперы — напішаш мне ўсяго адно слоўца.

— Только по-русски... И не какое там, бульбашское! — сказала і слухмяна ўселася за стол. — Ну, говори, учитель. Подопытный кролик на всё готов!

Я падумаў: «Няблага трымаецца!». І прадыктаваў:

— Вполоборота.

— Что-что?.. — насцярожылася яна.

Сакурсніцы, падалося, запаволілі дых, як знямелі. Тоня не варухнецца. І гэтая, з калючым паглядам каторая, бачу, пільна навухрылася і чакае.

Галіна хмыкнула, кінула асадку на стол і сказала:

— Учитель, я лучше отдамся тебе... Пусть они пишут. Идет? — Выйшла з-за стала і падступілася да акна.

— Згода, — сказаў я і адзначыў: «А носік — прыгожы, маленькі. Такія дзяўчаткі шчырыя і ўлюбчывыя». Пажартаваў: — Але спачатку кавай пачастую, а вы мне ў наступны раз смажонікаў з цыбулі прынясеце, бо раскашаваць няма ўжо з чаго — грошы ў першыя дні распусціў, цяпер на бабáх сяджу.

— На бáбах звычайна ляжаць, — падсекла мяне беларусачка — яна памяняла позу: сядзела на ложку, як турчанка, падкурчыўшы ногі.

— Чаму ж — можна і седма... У мяне з табой атрымалася б.

— Фу, грубиян! — сказала тая, што выкрасае паглядам слёзы.. — Вы неиначе в Индии были... — дапытліва глянула на мяне і ўселася за стол, узяла асадку, напісала свой дамашні адрас і тут жа агучыла: — Кишинёв, улица Когульская, 11, Вероника Чопра. — Пасміхнулася — прыязная ўсмешка, чаруе. Дадала: — Вдруг заболеешь мной — позовешь, я приеду и вылечу. Эти две — задушат в объятиях, не доверяйся им.

— Вярнуся дзвору, зраблю калаўроцік і — чакай тэлеграму, — запэўніў я.

— Что ещё за коло в ротик?.. — надзьмулася яна і разгублена паглядзела на дзяўчат. — К кому мы пришли?.. Циник! — Акругліла вочы. — Или я ослышалась, да?

— Он сказал: класці ў роцік, — пасміхнулася беларуска. — На минет намекает.

І Вераніка як бы супакоілася, удакладніла:

— Всё правильно: где секс — там и минет. — Брыдзь з яе твару сышла. — Не без того.

— Беларуска падманула цябе, — сказаў я. — Калаўроцік — гэта вороток...

— А при чём тут вороток? — здзіўлёна спытала Вераніка, і дзюбчык яе носа ўскінуўся ўверх.

— Сама ж згадала Індыю, а пра калаўроцік не ведаеш.

— На Храме любви подзалетела, что ли?

— Так. Там ёсць такі прыём: калаўроцік.

Тоня падышла да стала, выхапіла ў Веранікі асадку і на чыстым аркушы няспешна бадай што выдрукавала свой адрас: «Кішынёў, вул. Чэхава, 9, кв. 2. Антаніна Тырля». Склала аркуш напалам, сунула ў папку з рукапісам і нечага раптам зарадавалася:

— Ой, дзеўкі!.. Мы думалі, што ён — паэт, аж не — празаік. — Узяла верхні аркуш, паднесла блізка да вачэй (у-у, блізарукая!), прачытала: — «Адам Лясота. Сонечны лівень. Раман». Стала насупроць мяне, паківала пальцам і зазначыла: — Не веру, што галадаеш… Празаікі любяць паесці. І гэты ваш, што на Марыйку запаў, лабацік, і выпіць не промах. Ён з сям'ёй у галоўным корпусе. Параіў узяць яго раман у бібліятэцы. Марыйка пайшла, і ёй там сказалі, каб паказала пісьменніцкі білет ці хаця б пуцёўку. А ў яе — ні білета, ні пуцёўкі...

— Гэта чаму ж ён на Марыйку запаў, а не на цябе, зямлячку? — спытаў я дзеля таго, каб нешта спытаць. — Яна — што: прыгажэйшая за цябе?

— Марыйка таксама піша. Друкуецца на старонках універсітэцкага альманаха. Я чула, як чытала яму свой верш. Ён хваліў яе, а жонка злавалася.

— Гэты лабацік — вядомы пісьменнік, Мартын Усвятка, — назваў я прозвішча земляка. — Раманы яго перакладзены не толькі на расійскую мову, але і ўкраінскую… Эх, дзяўчаты, дарма без Марыі прыйшлі. Яна і тут нешта сваё прачытала б. Я працую ў маладзёжнай газеце, вяду аддзел паэзіі й прозы — мог бы надрукаваць.

— Сёння Марыю заахламоніў ваш калега — сперш у рэстаран звадзіў, а цяпер яны… — Тоня перайшла на стоены шэпт, — у гатэлі.

— Нічога не разумею, — сказаў я. — На свае вочы бачыў, як адразу пасля сняданку дружнае сямейства паехала ў Севастопаль на экскурсію. Вернуцца вечарам.

— Ды не, класік кансульте Марыйку... Першы паверх, пяты нумар, люкс.

— Зямлячка, не выдумляй абы-што! — я ледзь нагой не прытупнуў.

— Светыш — о-о! — дзеўка хітрая, — казала далей Тося. — Яна збірае фактуру для сэкс-рамана. Знарок спакушае мужыкоў… Піша толькі аб перажытым. А выдумляе ўсякія там тэкставыя стыкоўкі ды зрэдку пейзаж. Астатняе — голая праўда.

Галя:

— Штору, как мы и договорились, сдвинула в сторону, и я что-то видела...

— А канкрэтней можна? — ад пачутага мае рэбры сталі чапляцца адно за другое.

Галя, скіраваўшы на мяне кашэчыя зенкі, наўспрам, не стыдаючыся, сказала:

— Она раздела его...

Тося:

— Ды гавары ўжо, Галька, не запінайся: ну мы ж — не якія там дзеці… Божа мой! Сама ў трусіках, без ліфчыка. А з яго ўсё зняла — голы, як бэц...

Галя:

— Да ну их!.. Сама говори.

— Ну, я... калі падступілася да акна, тут жа і ўбачыла, як ён ёй грудзі цалаваў і на пупок перакінуўся... А ўжо калі заклаў яе пярэвяслы сабе за плечы й ніжэй пабраўся, Марыйка ўхапілася аберуч за яго галаву, за вушы, ды ўхіліцца ўжо не змагла: ён так крутнуў яе, так кінуў на пасцель, што аж тварам у падушку зарылася. А сам — наверх, падбіў ёй калені пад жывот, сагнуў. Левай рукой голаў хіліць уніз, а правай, бачу, трусікі — шах-шах, параваў... Марыйка віляе попай, выкручваецца. Але не крычыць.

Вераніка ўселася ў крэсліца, брыкнула нагамі й сказала:

— А я камень держу!.. Мы уговорились, что как закричит, подаст команду — разбиваем окно, спасаем Марийку.

Тося:

— Сучка!.. Не закрычала. Упала ў жарсць, забыла на ўгавор... Улагодзіла яго так, як цёлка бугая, пасля на спіну легла і ногі раскавезіла... Ён згорбіўся, як вусень, і давай валасатым задам бліскаць... Мяне занудзіла, і я — фу! — зблявала. Нечага дрыжу ўся, калачуся. Тут — чую: «Вам дрэнна?..». Мужычы голас. Спалохалася — глядзь! А дзяўчат маіх няма побач. Перада мной — мужчына, праўда, не голы, адзеты, прычапураны. Падваконне ў блявоціне. Мне сорамна. Аж бягуць мае дзяўчаты з вядром і анучкай. Гэта яны сказалі вахцёру, і ён кінуўся мяне ратаваць.

Галя:

— Вы извините... Пришли вот, всякой всячины наговорили... Может, и зря.

— Не зря!.. — рэзка паднялася з крэсліца «ўтомная» з асінай таліяй, то бок Вераніка. — Мы предупредили человека! Марийке экзотика нужна, на эротике помешалась. Она завтра же, если не сегодня вечерком, начнёт и вас охмурять... То знайте, Адам: экспериментирует, чтобы затем в роман вплести кульбиты свои.

Як мог, я знарочліва спахмурнеў (шкада, не бачыў свой твар) і спытаў:

— Дзяўчаткі, а я хіба не творца? — апусціў голаў, гляджу спадылба. — Мне ж таксама пра нешта трэба пісаць — з пальца ўсё не высмакчыш. — І адпусціўся — зарагатаў, прыгаворваючы: — Пацеха!.. Ну і ну!.. Лажануўся Мартын, нарваўся-такі... Бач, Марыйка нізрынула Усвятку ў экстаз!.. Кажаце, пупок цалаваў? О-о, натхніўся! Гэта ж — новы раман! Во, я тут — паўмесяца ўжо, але і дзвюццаці старонак не напісаў. — І жартам, выстарчыўшы ўказальны палец правай, як не клюнуў ім у плячук зямлячкі. — Спадарыня, я хацеў бы ведаць, як вашага бацьку завуць — майго будучага цесця?

Тоня аж уміхнулася — апусціла вочкі долу і неўтароп сказала:

— Па-бацьку я — Віктараўна... — Пасміхнулася і дадала: — І больш не выкайце са мной. Я не хачу аддаляцца, а надаварот... І тады мой тата абавязкова стане тваім цесцем. — Павісла ў мяне на шыі й выгукнула: — Адам, кавы хачу!.. З каўбаскай. Раніцай бачыла цябе ў краме — нечага смачнага накупляў. Кончык пяцірублёвай сервелаткі тырчаў з пакета.

— Хм... У такім разе — будзь гаспадыняй. Пакуль я гатую каву, ты робіш бутэрброды.

— О'кей! — Яна тут жа, як не ўподбег, хіснулася да халадзільніка, малога, які стаяў на кутнім століку. Агучыла назву: — «Марозка». — Адчыніла дзверцу, падзівілася і гукнула да дзяўчат: — Чуеце?!. Бутэлька каньяка «Кішынёў» — наш, родненькі! — масла, батон, памідоры...

Мусіў прыглядзецца да Антаніны як след. Але ж і зіркатая, не якая там недарэка. І само, без прынукі падумалася: «Пабярэшся з такой — будзе кішэні патрошыць, усё ўпільнуе і ў свой кашалёк утахціць. З такіх руплівіц — самыя разумныя жонкі й дужа сварлівыя. Увагу любяць, кветкі... Падобна, не шлюшка, хаця — наўрад каб цнатлівая. З хопу-галопу не аддасца, але прывучыць можна... Каб толькі не з'ехала». Спытаў:



— Дзяўчаты, цыбулі яшчэ многа няўбранай?

— Недели на две хватит, — сказала Галя. — Да у них здесь и арбузов гектара четыре, если не больше.

Тоня:

— Выберу самачку і табе прынясу — паласуешся, натхненне прыйдзе — і земляка абгоніш, — голасна рагатнула. — Пасля Марыйкі ён і радка больш не напіша. От, слова даю!

— Думаеш, яго творчая жарсць на Марыйку перакінецца? — пажартаваў я.

— Абавязкова!

— І дарма. Няхай бы не замаўкаў... Яго той-сёй з крытыкаў хваліць. Асабліва адзін маскоўскі, прыкормлены.

***

Зайшла Акломіна, павіталася і дадала:

— С твоего позволения — закрою фортку. Покупалась... У нас тут и хорошо, что общий душ. Зашла, вижу — занято. А ноги-то видны... Коврик, вижу, не общий, свой. Чистёха белорус, хвалю. Ты никак из Минска вещицу привёз?

— Ды што вы — тут купіў, на рынку.

— Видела твою книгу в библиотеке. Знаю переводчика — старикашка известный. Но перевод авторизованный. И он позволил вмешаться в его творческое эго?

— Слаба пераклаў... Мне давялося паляпшаць тэкст.

— А ты по-русски со мной говори.

— Я разве не по-русски?

— Нет, ты — по-своему... Прочла я твою книгу. Вот и пришла сказать, чтобы не строил из себя попугайчика... Не скрою, тебя на примету взяла ещё в день приезда.

— Это зачем?

— Взяла — и всё. Знать, приглянулся. Бабе — закон не писан... И в корпус этот попросилась, и в столовой с тобой за один стол села.

— Ну вот... А на меня накинулись, что вас просто Варварой назвал.

— Конечно, я старше за тебя всего на какие-то семнадцать лет. Но я — не дешёвка, чтобы, толком не зная меня, начинали со мной ловеласничать. Да, я живу одна. Замужем не была. Того, кого любила всем сердцем, ночью забрали и увели. Прямо от меня. Следили за ним. Даже и сегодня не знаю, кто и куда увёл. Он журналист был...

— Извините, Варвара Акимовна, если я чем-то обидел вас.

— Не извиняйся, я всё понимаю... И вот, пришла поплакаться у мужика на грудях. И забоялась вдруг: авось не поймёт? А ты и вправду холодно встретил, чужаком прикинулся... Однако — странно: ну ляжем мы в постель, станем ублажать друг друга, а говорить будем на разных языках? Не по-славянски как-то. — Пацягнулася, аж стала на пальчыкі, як балерына, і зачыніла фортку. — Сегодня ветер с моря, холодно. — Яна была ў квятастым халаце і чырвоных, на босую нагу, тапках-гамашах. — Завчерась у тебя студенточка была... Долго ты её не отпускал, поил, кормил. И потом она мылась, твоим полотенцем и грудки, и куньку вытирала. Фигурка, правда, ладненькая... И как раз хохолок намачулила, в пене весь, и моет, моет. Да, соблазнил девку, хорош кобель.

— Вы это к чему, Варвара Акимовна?

— А к тому, что я — прошляпила тебя. Ждала, пока всё само собой станется. Ан не сталось... Ты замазался. А вдруг подцепил гонорейку? Молодые — такие: вчерась одному дала, сегодня — другому... Да ладно, я — доктор, и знаешь — уролог. — Акломіна пахмурылася і — патрабавальна: — Чего стоишь? Снимай штаны — посмотрю, что у тебя там, не капает? — і шумна рассмяялася.

— Вроде нет... — і я ўжо сам пайшоў у наступ: — А дзе гарантыя, што ад вас якую-небудзь малочніцу на займею?

— Коль о молочнице знаешь, то явно с неряхой переспал. Впрочем — писателю всё надо знать. Но не обязательно всеми болезнями переболеть. Мы учимся на опыте других. Так-то, дорогой. — Блізка падышла, і на мяне дыхнула надта прыемным пахам — духі, пэўна ж, французскія, і яна не пашкадавала іх: акропіла не толькі завушша, як звычайна робяць жанчыны, але грунтоўна «надушыла» бадай і свае дзве напаўрасплеценыя русыя коскі, што ляжалі наперадзе, споверх даволі выразных, дарма што і пад халатам, грудзей.

— Пажартавалі й хопіць... Вы ўжо даруйце мне, калі што не так сказаў.

— К тебе дама пришла — и вся раскрылась... Не думай, что это легко мне было сделать.

— Не думаю, бо ўсе мае думкі ўпрочкі збеглі.

— Угощай, чем богат. А нет — ко мне пойдём. На сегодня хватит работать — отдыхаем! — Зноў пасміхнулася і як усё роўна апраўдвацца пачала: — Тебе купаться вздумалось. Тут меня и взорвало: «Ага, белорус, значит, студенточку ждёт. Ну, коль он такой чистёха, то и я к нему чистенькой заявлюсь!», — Падышла і бадай выцягла мяне з-за стала (дужая — каня на скаку з капытоў саб'е!), штурхнула на ложак. Нішто сабе жарты!

І ў гэты момант пачуўся ціхі постук у дзверы. Яны былі не замкнёныя. Першай кінулася адчыняць Варвала Акімаўна. Спытала:

— Кто?!.

Тоня, пачуўшы жаночы голас, дала кулакамі так у дзверы, што дападная запытанка, атрымаўшы моцны ўдар па лабаціне, ледзь не ўпала — хапілася рукамі за голаў і сакавіта мацюкнулася:

— А ибуктвоюмать!.. — і выбегла ў калідор.

Такую «мілую» карцінку, прызнацца, давялося бачыць мне ўпершыню. Тоня ваяўніча спытала:

— Што гэтай ведзьме трэба ад цябе?

— Хацела, каб я аповесць ейную прачытаў.

— І ўсяго толькі?

— А ты што падумала?

— Яна падглядвала за мной... Можа, якая лесбіянка?

— Не думаю...

ВЕРШЫ

# ШЧЭ ПАЖЫВЕМ У СКРАДЗЕНАЙ АЙЧЫНЕ...

## (З АНТАЛОГІІ «УКРАІНСКІ МАЙДАН»)

### Валадзімір ЗАБАШТАНСКІ

*(1940–2001)*

***Бітва з каменем***

*Вяртаўся з кар'еру дадому*
*У робе ад пылу белай,*
*Нёс цяжкую ношку стомы*
*На гнуткім і дужым целе.*

*Шлях п'яна звіваўся ў полі,*
*Скрыпелі дубы ля хаты.*
*Тым вечарам, як ніколі,*
*Хацелася спаць упасці.*

*А пальцы ж у кроў пабіты,*
*І ныюць мазолі глуха.*
*Імша малатка й граніта*
*Гучала ўсю ноч ля вуха.*

*Заснуў — як у Лету кануў,*
*З цяжкімі, як сталь, рукамі.*
*І снілася: заўтра ўстане*
*І пераможа камень.*

### Барыс ЧЫП

*(нар. у 1946 г.)*

***Лось***

*У малінавым звонкім ранку*
*Зіхацелі слязінкі рос,*
*Да сасны прытуліўшыся ранаю,*
*Паміраў крутарогі лось.*

*Яму ў вочы ляцелі кедры,*
*Біў у вуха птушыны піск,*
*А хлапец у спарттыўных кедах*
*Вочы звузіў, нібыта рысь.*

*Дзеля славы ці для забавы...*
*Стрэльбу ўчора хлапец купіў.*
*Першы стрэл — і нябёсы ўпалі,*
*І разліўся ля ног блакіт.*

*Лось канаў у нясцерпных муках,*
*Капытамі світанак грэб.*
*А скрозь муку дрыжэлі рукі,*
*Што учора трымалі хлеб.*

### Багдан ЧАПУРКА

*(нар. у 1949 г.)*

***Песня песняў***

*Цнатлівае слова маўчацьме на дне.*
*Буслы адляцелі. Не дыхае неба.*
*Памёр сіні конік. Туман адсінеў.*
*І маці заплакала ў скібачцы хлеба.*

*Нікога й нічога ў самотнай душы.*
*Не стала натхнення у прыцемку хаты.*
*Стаміліся вершы выцягваць баршчы*
*За вушы апенькаў — выспеўваць рулады.*

*Згатую вячэру. Павекі зляплю.*
*І неба, што ўпала, засею агнямі.*
*Усё, што пяшчотна ў сусвеце люблю,*
*Усё, што даўно ўжо за намі, за намі...*

### Віктар БАРАНАЎ

*(нар. у 1950 г.)*

* * *

*А як бы вам, цётка, з калгасу*
*«Наказ Ільіча»*
*заміж гектару буракоавага плану —*
*ды засень густую ад пальмавых шат*
*на пляжным беразе цёплага акіяну;*
*ды шэзлонг (вы й слова такога не чулі), ды*
*купальнік-бікіні заміж плісавай «лабуды»;*
*а косы каб вашы зрудзелі*
*ад марской вады...*
*Што было б тады?*

*І каб не вы да поўначы таўкліся ў двары*
*(звары, паднясі, прыбяры, дагадзі ўсім*
*паспець...),*
*і каб рана-раненька, на досвітку, на зары*
*усмешлівы негр вам каву падаў у пасцель*
*і чытаў з газет, пакуль вы кавуеце*
*ў смак,*
*як паром затануў, як у полі загніў бурак.*
*Ну, а вы б смуткавалі з чужой бяды.*
*Што было б тады?*

*А ўвечары, пасля адведзін сталіцы,*
*накупіўшы ўсяго для мужа, сябе і ма-*
*лечы,*
*Вы не ўпалі б зняможана у падушку ніц-*
*ма,*
*А прыйшлі б адпачыць на мой паэтычны*
*вечар.*
*Вы сядзелі б у зале і думалі: Не,*
*Ніхто так не піша , як Байран*
*або Манэ...»*
*Вы ўяўляеце, цётка, што было б тады?*
*Цётка, цётка! А якія ж вашы гады...*

### Галіна КІРПА

*(нар. у 1950 г.)*

* * *

*Душа цяпер — як рэчка ў ледастоі.*
*І кожны спогад — як забыты міф.*
*Ніхто не прыйдзе і не загаворыць,*
*ну хіба што — біблейская Юдзіф.*

*Душа бы нітка — тонка, дык і рвецца.*
*І кожны спогад — каменем на дне.*
*Ніхто не гляне і не пасміхнецца,*
*хіба што кветка, што цвіце у сне.*

*Душа — бы лета бабіна — блукае.*
*Пакуль снягамі шлях не занясе...*
*А сум, бы смерць, у вочы зазірае,*
*І паражнеюць вочы пакрысе.*

### Анатоль КІЧЫНЬСКІ

*(нар. у 1950 г.)*

* * *

*Ціша.*
*Не кроны — кароны.*
*Свята зімы ў сасняках.*
*Жомчугам крыл вароны*
*Ззяюць на белых снягах.*

*Нетры высвечвае іней,*
*Бы ў чорна-белым кіно,*
*Свеціцца промнямі ліній*
*Памяць, а ў ёй — адно:*

*Тонкі, як звон патрона,*
*Зграі сабачай брэх.*
*Белай*
*маланкай*
*варона*
*падае ў чорны снег.*

### Таццяна ЯКАВЕНКА

*(нар. у 1954 г.)*

***Гогаль піша «Тараса Бульбу»***

*Балтыйскі вецер снег калыша.*
*Над Пецярбургам дзень патух.*
*А Гогаль піша. Гогаль піша*
*Пра Запарожскай Сечы дух.*
*Канае гордая Ўкраіна,*
*Абклала край ярмом зіма...*
*Драпежны воблік Кацярыны*
*Паўстаў над ёю, як чума.*
*Здавалася б — ужо навекі*
*Забыта. Спіць пад палыном.*
*А Гогаль піша. І ад ветру*
*Хавае свечку пад крысом.*
*А Гогаль піша.*
*Піша Гогаль.*
*На свечцы свеціцца сляза.*
*Народа сіла, праўда, воля*
*Скрозь душы мёртвыя ўзышла.*

### Ігар РЫМАРУК

*(1958–2008)*

***Начная рака***

*Азіраешся, як на свіст,*
*ты на кожны пагляд і подых.*
*Металёвы, цяжкі падаліст*
*асядае на вымытых сходах.*
*Ты ступаеш на мост.*
*Ты прыйшоў да начной ракі.*
*Ты йшчэ верыш у водную цемень,*
*добры дух — і табе неўцямкі,*
*скуль з'яўляюцца цені.*

*Абвядзі сябе колам! — за міг*
*кожны подых і погляд звяне,*
*і рака заскрыпіць,*
*і падымецца вечка туману,*
*і узнікне над водамі панна –*
*не з далёкіх сталіц...*
*Кропля белая з рванае раны!*
*Рассыпаюцца чорныя косы!..*
*Той жа страх? Калі словы пачуеш такія? —*
*«падыміце мяне, нябёсы!»*
*Ці паднімеш,*
*уцякаючы прэч нацянькі?*
*Дыбам — мост у разбуджанай пене!..*
*За ракою крычаць цягнікі,*
*а не трэція пеўні.*

### Вікторыя КЛІМЯНТОЎСКАЯ

*(нар. у 1961 г.)*

* * *

*А, магчыма, мы — толькі пчолы?*
*Наша доля ў аблозе вех.*
*Што не можна — таго ніколі.*
*Што захочацца — тое грэх.*

*Адабраная кімсьці ява.*
*Наша мройлівасць — атавізм.*
*Нам не нудна і не цікава,*
*Што нам джала і што нам віск.*

*Мы не ведаем, што будуем –*
*Наша слава — бяздумны лёт.*
*Не пытаем, каго гадуем –*
*Наша справа — у сотах мёд.*

*Жыць без волі, сыйсці без болю.*
*Крылы ангелаў — з яснаты.*
*А калі мы — усё ж не пчолы,*
*Што тады?*

### Ігар ПАЎЛЮК

*(нар. у 1967 г.)*

* * *

*Ты не прыходзь, мой час доўгачаканы.*
*Чаканне ёсць. А восені няма.*
*Душы даніну я сплачу паўстаннем.*
*А потым — цела ў шнарах і дымах.*

*Мы вучні смерці. А жыццё нам — свята.*
*А я любю вас, людзі, нібы брат.*
*О як я перад вамі вінаваты!*
*Нібыта перад Госпадам — Пілат.*

*Легенд эпоха — ты йшчэ не мінула.*
*Мой родны лес — ты мой дзіцячы лёс.*
*Мая душа згадала і ўздыхнула,*
*згубіўшы знічку ў пазухах бяроз.*

*І ты, і вы... Люблю, каго не знаю...*
*Мінае ўсё. Мінае. Пустата.*
*Лагодны вецер лірыку гартае.*
*Глядзіць бабуля юная з вакна.*
*Гарачы цень. Я ведаў вішню белай.*
*І тут сябры.*
*Любілі і пілі.*
*Так ёсць ужо...*

*Каб шабля не ржавела —*
*Зрабі ты яе з воску*
*І спалі.*

### Аляксандр ЯРАВЫ

*(нар. у 1970 г.)*

* * *

*...Шчэ пажывем у скрадзенай Айчыне.*
*Бо край — не наш. І грэх на ім — не наш.*
*Шчэ пасмакуем на вар'яцкай трызне*
*Віно бязвер'я з харалужных чаш.*
*Шчэ пажывем. Шчэ трохі паўміраем.*
*І так мінаем.*
*Цені нашых крыл*
*Прыкмеціць хто над звар'яцелым краем?*
*Бязвокі змрок. І неба зіхаціць*
*Не нам, не нам.*
*І болем непадкупным*
*Мы ўмерзнуць мусім у прадонны глей,*
*Каб даў Гасподзь не нам —*
*дык хоць наступным*
*Знайсці ў сабе украдзеныя сябе.*
*Мы паслізнуліся на выстылым карнізе,*
*Не давяршыўшы дум... На строме сноў.*
*Бо час — не наш.*
*Таму на ўласнай трызне*
*Мы п'ем віно з уласных чарапоў...*

### Аляксей БІК

*(нар. у 1980 г.)*

* * *

*Я Вас прыдумаў так, як захацеў...*
*Самота нема грукала мне ў скроні,*
*Сціскаліся у роспачы далоні,*
*Гайдаўся свет у кронах чорных дрэў...*

*І сыпаліся зоркі на чало,*
*Рэальнасць пачыналася з падману...*
*Я не настаў... Я так і не настану,*
*Бо Вас няма й ніколі не было.*

*Я вас сабе прыдумаў проста так...*
*Каму якая да таго ёсць справа?*
*Я вас люблю. А вы мяне — таксама.*
*Я вас — да смерці. Вы мяне — ніяк.*

### Антаніна ЦІМЧАНКА

*(нар. у 1988 г.)*

* * *

*Я хацела б табе прысніцца*
*(я змаркоцілася ў бязцеб'і),*
*каб у рукі, ды не сініцай,*
*жаўруком каб, але не ў небе?*

*Сцежка сцелена-перасцелена,*
*а вакол ні адной душы…*
*Божа, дзе яно, Божа, дзе яно,*
*Божа, дзе яно? — адкажы.*

### Ярына ЧАРНЯК

*(нар. у 1990 г.)*

* * *

*Ніхто не верны Украіне*
*так, як Слова.*
*Ніхто не верны Украіне*
*так, як Песня.*
*Ніхто не мае права гаварыць,*
*што Украіны няма на карце.*
*Ніхто не мае права зневажаць:*
*мы Украіны*
*пакуль не варты…*

**Пераклаў з украінскай Эдуард АКУЛІН**

ВЕРСІІ

# ПРЫГОДЫ ПАЛЕСКАЙ ТАПАНІМІКІ

Аляксей ДУБРОЎСКІ

**Тапаніміка як ніякая іншая навука прыадчыняе загадку нашых вельмі далёкіх прашчураў. Зробім спробу прабрацца ў балота за яго прыгодамі...**

Менавіта балоты са шматлікімі рэкамі і азёрамі дапамаглі палешукам дажыць да сённяшняга дня. Свет старажытнага чалавека быў простым. Увесь космас «круціўся» поруч. Багі жылі ў суседнім лесе і рацэ, душы продкаў сыходзілі ў найбліжэйшае возера або крыніцу, целы іх былі пахаваныя ў склепе пярэдняга пакоя, а чэрапы — у Чырвоным куце хаты. На Дзяды пакідалі ім ежу на стале... Усё жыццё язычнікаў ішло на рэлігійным, містычным фоне, дзе складана было падзяліць Яву, Неба, Дунай і Лесьну. Два апошнія паняткі звязаныя з замагільным светам і душамі памерлых.

З паўднёвага боку да Пінска падыходзіць раўчук Ступа, з XVI стагоддзя канал. У далёкім дзяцінстве бабуля прымушала мяне ў ступе таўчы збожжа на крупы. Маё пакаленне добра ведае, што такое ступа. Аднак у вельмі далёкія часы людзі назву навакольнаму свету проста так не давалі. Яны мелі заўсёды нейкае сэнсавае і ахоўнае прызначэнне. Год ахвяраваў я на вызначэнне слова Ступа, і мае пошукі ўвянчаліся поспехам. За словам адкрываўся ланцужок значэнняў ад часоў прыходу да нас першых індаеўрапейцаў да чырвонаармейскіх будзёнавак. Першапачаткова ступай называлі буддзійцы невялікі сферычны купал для захоўвання рэліквій і тэкстаў законаў. Нешта падобнае ёсць у сінагогах — біма. Калі гэты народ 5000 гадоў назад пачаў перамяшчацца з поўдня да нас, то, натуральна, «ішоў» са сваімі багамі і звычаямі. Дайшлі да нашых балот, знайшлі прыгожае месца на высокім беразе безназоўнага раўчука, збудавалі ступу-капліцу, дзе захоўвалі свае «скрыжалі», а рэчку назвалі Ступай або Святой. Цікава, што кумранскія летапісы з тэкстамі з Бібліі захоўваюцца ў Ерусаліме ў адмыслова пабудаваным музеі ў выглядзе сферы-ступы. Такі ж выгляд маюць купалы хрысціянскіх цэркваў візантыйскага стылю. «Кіпы» ў Кракаўскіх габрэяў мелі таксама выгляд ступы і потым падчас грамадзянскай вайны ў Расіі перайшлі ў форму галаўных убораў — будзёнавак. Неверагодна, але факт: мы з падобнымі галаўнымі ўборамі ходзім цяпер у лазню...

Мы знойдзем яшчэ і іншыя значэнні «няпростага» слова ступа: пасудзіна для падрыхтоўкі святога напоя... Такі выгляд паўсферы мы бачым у галаўным уборы ў кіеўскіх князёў — гэта юдэйскі шлем ад сефардскай скрыпкі для захоўвання Торы. Нядаўна па тэлебачанні паказвалі Тыбет — і на ўскраіне вёскі стаялі Ступы. Якую ролю яны выконвалі для паселішча, мы ўжо можам здагадацца, але могуць служыць і магільняй. Думаю, толькі адно гэтае слова ў назове непрыкметнага раўчука дае масу цікавага матэрыялу пра людзей, якія пражывалі тут у вельмі далёкія часы...

Раз'язджаючы па Палессі, чаго мы толькі не сустрэнем! Ёсць і Біблейская гара Харыў на беразе Ясельды ў Пружанскім раёне. На ёй раскінулася вёска Харзва, сінонім Сіная. Вёска Харомск Столінскага раёна размясцілася на месцы невялікіх капліцаў — харомаў на былым свяцілішчы язычнікаў. Вёска Вялесніца ў Пінскім раёне з'явілася на месцы збору душаў памерлых — вялісаў. На рацэ Струмень, якая падыходзіла да Пінска (цяпер носіць назву Прыпяць) людзі ўшаноўвалі каменных багоў, і ў пісьмовых крыніцах за XIX стагоддзе гэта пацвярджаецца. На беразе стаялі два каменныя крыжы. Адзін я знайшоў каля Турава з вывай твара бога.

Спынімся на беразе возера Пяшчанага ў вёсцы Одрыжын Іванаўскага раёна — ды ўявім, як язычнікі ўпрыгожвалі галінкамі ды кветкамі «одр» — ложа для крэмацыі нябожчыка. Рабілася гэта заўсёды ля вады. Не будзем палохацца, калі спынімся каля вёсачкі Вілы Іванаўскага раёна. Побач размясцілася вёсачка Каролін, правільней было б «Каралін», што азначае падвойнае сховішча бога сонца Ра. Месца гэта ў першай палове XVI стагоддзя належыла сям'і Дастаеўскіх, былі яны тады яшчэ Ірцішчэвічамі.

Смерць (вал) сабе людзі знаходзілі каля вёскі Валішча Пінскага раёна скрай велізарнага балота. Гэта магло быць месца рытуальнай смерці, або па старасці, калі чалавек станавіўся клопатам для племя — пасля 60-і гадоў. Запраўлялі гэтай справай кавалі (каве — забойства), і назваў такіх па Палессі шмат, дзе жыў і праводзіў рытуальныя забойствы каваль. У гэтым слове ёсць яшчэ «аль» — святы, што пацвярджае «няпростае» значэнне гэтага. Напрыклад, кельты (іх далёкія продкі жылі і на нашай палескай зямлі, носьбіты зарубінецкай культуры, 2000 гадоў назад) вельмі шанавалі багіню Кавенціну...

Плывучы па Прыпяці на ўсход у вусце Гарыні, сустрэнем назоў урочышча Нырча. Таксама незвычайнае слова, азначае «ныра» вежу, вялікі слуп, а ў паганскія часы імі былі драўляныя ідалы. Месца было стратэгічным на стыку вялікіх рэк, і людзі спыняліся, каб пакланіцца багам, прынесці ім ахвяры.

На рацэ Моства (па мясцоваму Моўства) у Столінскім раёне можна паплакацца, бо слова гэта азначае галасіць, плакаць на «мосце», за якім пачынаецца іншы свет. Назва ракі азначае мост у свет мёртвых... У Лунінецкім раёне ёсць вёска Кажан Гарадок. У сучаснай інтэрпрэтацыі вам яго назву звяжуць з рамеснікамі па апрацоўцы скур-«кож», але, я думаю, яно ідзе ад слова «кожан» — настаяцель язычніцкай капліцы з ідалам. З замагільным светам звязаны Манькавічы каля Століна. Мані — багі замагільнага свету, прывіды, ды і сам Столін азначае месца святога сховішча, можа, бога Горыня. «Каве» — азначала не толькі забіваць, але і шабаш ведзьмаў. Рака Гарынь робіць стромкую завесу і падыходзіць ушчыльную да парка і ўзвышша, дзе і праходзілі язычніцкія ігрышчы, або шабашы, тагасветных сілаў.

Зусім нядаўна мы даведаліся, што культура штрыхавой керамікі, што займала цэнтральную і паўночную частку краіны, а на Палессі зарубінецкая, далі пачатак кельцкаму, а потым заходнім народам, а Палессе дасягала яшчэ паморская культура, і было гэта 2500 гадоў назад. Што ж ад яе засталося ў нас? Назва Брэст ідзе ад старажытнапрускага «браст» — брод, а што далей на ўсход? У Столінскім раёне, як нідзе, на кожным кроку сустракаеш найстаражытную тапаніміку. Тут і багі Хорс і Тор (Тур), племянныя жывёлы-абярэгі: Лісы і Арлы, а вакол Альманскіх балотаў, якія носяць агульную назву Мерлін, і зусім, можа, захоўваецца даўніна яшчэ з каменнага веку. У апошнія гады кельцкага чараўніка Мерліна па тэлебачанні ўспамінаюць часта. Большасць вельмі старых слоў складаюцца з двух або трох каранёў. Так і Мерлін цалкам адпавядае старажытнаму азначэнню: «мер» — смерць, а «лін» — сховішча. Гэтыя балоты, найбольшыя ў Еўропе, і сёння ўтойваюць у сабе шмат таямніцаў і небяспек, тым больш, што на яго месцы з 1962-га 45 гадоў гадоў дзейнічаў ваенны палігон, а Мярлінскія хутары ў сувязі з гэтым былі выселеныя. Гэтае балота разам з лясамі па астравах займае не меней 95000 гектараў. Вакол іх рассыпана кола вёсак з архаічнымі назовамі: Альманы, Хатамель, Любер (цяпер Рубель), Альпень, Вялемічы, Рамель, Мачуль, Цярэблічы, Аздамічы, Кароцічы, Храпунь (выселеная), Рубрынь (выселеная), Столін, Манькавічы, Бярозна (Беражное), Колкі (выселеная), Альшаны, Радзілавічы. Усярэдзіне масіва ёсць урочышчы: Каменнае, Люцецкае, Вілля, Хомішча, Убога, Любухна, Некрэм, Чырвонае, Ляда, Валасень, Магілкі, Кадзільнікі, Капішча, Вялесніцкае, Калода, Слупец, Купліішча, Волат, Драян, Пагібель, Лешкаў, Копча, Неўле, Любатынь. Усе яны нясуць у сабе паганскія карані. Да прыкладу — Кароцічы. «Кара» — плач па памерлых. Вёска размешчаная на беразе ракі Моства, а яна, як ужо згадвалася, азначае мост у іншы свет. Або два ўрочышчы Каменнае і Люцецкае, гэта адно і тое ж. У гэтых урочышчах стаялі каменныя ідалы. Паколькі гэтая тэрыторыя «безкаменная», іх — крыжы, знакі сонца — сюды, верагодна, прывезлі. Вельмі цікавы «Хатамель». «Хат» — азначае зіхацець. У тыя часы такой уласцівасцю валодалі толькі багі, што і пацвярджае канчатак слова «ель». У кіламетры ад вёскі археолагі выявілі і раскапалі старажытныя гарадзішча і паселішча з акропалем. Гэта высокае месца ў пойме Гарыні. Гарадзішча ўяўляе сабой невялікую штучную круглую гару, абнесеную ровам. Да VII-га стагоддзя выкарыстоўвалася яно як жыллё, потым тры стагоддзі — як свяцілішча. У X-м стагоддзі людзі адтуль сышлі, магчыма, бліжэй да Прыпяці, на месца цяперашняга Давыд Гарадка. Адкрытыя культуры ў гэтым месцы адносяцца да зарубінецкай, пражскай і Лука-Райкавецкай.



Рака Ступа



Гара Багоў

...Палессе выключна цікавае для разумення гісторыі насельнікаў, якія тут жылі. Можна зрабіць і спробу даць паходжанне ў цэлым назову Палессе. Гэта спецыфічны край, дзе прыродныя ўмовы не давалі магчымасці займацца земляробствам — толькі жывёлагадоўляй і рыбалоўствам. «Палес» — бог пашаў. У гэтым слове ёсць і яшчэ адно «адценне»: поліс — слуп. Пад слупамі разумелі выключна ідалаў, значыць, гэта яшчэ краіна ідалаў і духаў.

Вельмі цяжка было разабрацца з назвай ракі Піна. Я схіляюся да кельцкага (а кельты тут праходзілі і жылі): «пін» — узвышша, і «pinus» — хвоя. На Палессі заселеныя тэрыторыі на 62% занятыя хвояй. Раку сярод хваёвых выспаў-узвышшаў і назвалі Пінай.

У кельцкай мове мы знойдзем шмат знаёмых слоў: Белен — адзін з галоўных багоў кельтаў, а ў Драгічынскім раёне ёсць вёска Белін, з коранем «белы» наогул шмат паселішчаў... Друіды — жрацы, чарадзеі, ведзьмакі, якія жылі па беларускіх рэках Друя і Друць; Дзіс, Дзіт — багі падземнага свету, звязаныя з рэкамі Дзісной у Віцебскай вобласці і Дзітвой у Гарадзенскай...

Нават гэтыя прыклады паказваюць, наколькі тапаніміка можа служыць скарбніцай шматлікіх захапляльных гісторый!

Кароткі экскурс у свет далёкіх продкаў і прывідаў, рытуалаў і свяцілішчаў часова прыпынім, каб даць магчымасць чытачам самім прачуць таямніцы, якія дагэтуль хаваюць палескія балоты і лясы...

ЛЕКТОРЫЙ

# ДАЛУЧАНАСЦЬ ДА СПОВЕДЗЯЎ НЕЧУЖЫХ

## ВАСІЛЬ САХАРЧУК — ПЕРАКЛАДЧЫК

Алесь КАСКО

**Ходзіць між намі, берасцейцамі, і сябрамі-валынянамі літпоказка. «Адзін з маіх вершаў Васіль Сахарчук пераклаў так, што ягоны варыянт мне спадабаўся больш, чым арыгінал», — ухвальна выказаўся аднойчы Іван Чарнецкі. Мы падхапілі: «І ты, Іване, потым пераклаў наадварот — з беларускай на ўкраінскую?..»**



Алесь КАСКО

У гэтым жарце праўда толькі ў тым, што да перакладаў Сахарчук ставіўся з усёй адказнасцю. Аднак у яго ні разу не ўзнікала памкнення пераўзысці ў майстэрстве арыгінальнага аўтара, што, урэшце, таксама ўваходзіць у разуменне адказнасці. Не падражаў ён і перакладчыкам, вольным стылізаваць верш «пад сябе» ці аж на сотню радкоў павялічваць паэму, а то і дапісваць цэлы раздзел да яе. «Я спрычыняюся да аўтарскіх споведзяў, — казаў калісьці Васіль, — пранікаюся імі, але не забываю, што гэта ўсё-такі іх споведзі, нечужыя мне, ды — іх».

Ягоны слушны прынцып — чым менш «выстаўлязь» сябе, а як мага паўней і дакладней падаць свайму чытачу таго ці іншага замежнага паэта…

Станаўленне Сахарчука-перакладчыка пачалося ў гады яго вучобы на філфаку БДУ (1970–1975 гг.). Акурат — з вывучэння балгарскай мовы і знаёмства з балгарскай літаратурай; у яго перакладных паэтычных твораў з яе непараўнана больш, чым з якой-небудзь іншай. Далучанасць да балгарыстыкі, чаму ў немалой ступені спрыяў універсітэцкі настаўнік і старэйшы сябар Ніл Гілевіч, абудзіла цягу паэта да перакладчыцкай дзейнасці наогул. Спачатку на ўзроўні асобных твораў асобных аўтараў. Штуршком да працы нярэдка быў звычайны рэдакцыйны заказ; гэтак, напрыклад, у альманаху «Братэрства» з'явіліся перакладзеныя ім для творчага конкурсу «Веснавая навальніца» Ф.Цютчава і «Ветразь» М.Лермантава, у часопісе «Крыніца» — некалькі вершаў В.Стуса як штрыхі да аўтарскага партрэта. Але ўжо з гэтых імёнаў відно, што выбар не зусім выпадковы (паэт, урэшце, мог бы ад заказу адмовіцца). Той, для каго пераклады — не асноўны «хлеб», бярэцца найперш за блізкі яму верш блізкага паэта, што і назіраем у Васіля Сахарчука. Глыбінёй паэтычных перажыванняў і пластычнасцю формы прывабілі яго вершы балгараў А.Далчава, Х.Радзеўскага, Т.Клісурава ды іншых, рускіх Д.Самойлава і Ю.Левітанскага, украінцаў І.Чарнецкага і В.Гэя… Яны ў той ці іншай ступені рабіліся «сааўтарамі» творчасці самога В.Сахарчука, асабліва ў апошні яе перыяд — перыяд напружаных пошукаў, яскрава адлюстраваных у выніковым, пасмяротным зборніку (у тым ліку і выбраных перакладаў) «Мой вечны бор». Самы адметны, наватарскі твор тут — «Споведзь самотніка», прамоўленая аўтарам ад імя фізічна адсутнага сябра (адсюль нечаканы жанр — вершанемы). Узнікненню аўтарскай ідэі і яе арыгінальнаму ўвасабленню далі імпульс сумна-іранічныя радкі сучаснага балгарскага майстра асацыятыўнай мініяцюры З.Кісёва:

*Надыдзе дзень,*
*калі я скончу свой верш.*
*Усё ў ім будзе строга і прыгожа –*
*ні слоў, ні гукаў…*
*…чысты няспісаны аркуш,*
*можа, гэта і ёсць*
*мой самы завершаны верш!*

Іранізм Васілём Сахарчуком пераўтвораны ў трагізм, а чыстыя аркушы, перакладзеныя ім «з мовы ветру на мову людзей», сталі лістамі з таго свету. Як выявіў лёс — і яго асабістымі лістамі.

Зусім не выпадкова ў спадчыне Сахарчука-перакладчыка аказаўся самы знакаміты верш Э.По «Крук» з яго містычным рэфрэнам-заклякцем «nevermor», літаральна — «ніколі больш», такім загадкавым, што многія іншыя перакладчыкі пакінулі гэтае слова без адпаведніка. І сам вобраз крука-крумкача, і ўся мастацкая тканіна твора настолькі непаўторныя, што робяць верш фактычна неперадавальным, прынамсі — у адным якім-небудзь варыянце-перакладзе. Нездарма расійскія складальнікі зборнікаў паэзіі Э.По не абмяжоўваюцца перакладам М.Зянкевіча, на іх думку найбольш дасканалым, а падмацоўваюць яго сямю-васьмю варыянтамі іншых перастваральнікаў верша на расійскую мову — В.Брусава, К.Бальманта, Д.МераЖкоўскага і г.д. Словам, ніводзін з варыянтаў не «кананізуюць».



У анталогію паэзіі свету ў беларускіх перакладах «Галасы з-за небакраю» (2008) уключаны толькі адзін пераклад «Крука» («Крумкача») — Алега Мінкіна. Ягоны варыянт складальнік анталогіі Міхась Скобла лічыць хрэстаматыйным, і выключна з-за гэтай прычыны пераклад В.Сахарчука апынуўся па-за кнігай. Як і ў нядаўна выдадзеным «беларускамоўным» зборніку твораў Э. По «Маска чырвонае смерці», у якім падаюцца два пераклады «Крумкача» — А.Мінкіна і А.Хадановіча. Шкада, што В.Сахарчук і тут застаўся забытым, — шкада, бо ва ўрон усё гэта найбольш поўнаму ўспрыняццю твора геніяльнага амерыканца і праяўленню магчымасцей беларускага паэтычнага слова.

Пераклад Васіля Сахарчука, як мне здаецца, не без выдаткаў у перадачы арыгінала, дзе ўсё з'яўляецца глыбока змястоўным: чаргаванне рэфрэнаў (не адно «nevermor»), сугучнасць імя Лінор з магічным словам-заклякцем, няроўнаскладовасць радкоў, рытмічныя перабівы, анафары, гукапіс і многае іншае. Аднак галоўнага перакладчык дасягнуў: захаваў безумоўны прынцып Эдгара По — прынцып адзінства ўражання, які дазваляе трымаць чытача ў напружанні ад першых да апошніх радкоў. І адпаведнік магічнаму англійскаму «nevermor» прымальны — «і ўсё на тым», да таго ж узмоцнены, пачынаючы з восьмай страфы верша, не менш катэгарычным «нізашто»:

*…«Госць мой, пеклам блаславёны,*
*як цябе ў садах Плутона,*
*царстве змрочным і глухім,*
*клічуць цені?» І ён каркнуў*
*змрочным голасам глухім:*
*«Нізашто!» — і ўсё на тым.*

Якні прывабліваліВ.Сахарчука вершы на англійскай мове, якую ён таксама някепска засвоіў, іначай — такое яшчэ адно ягонае правіла — не браўся б перакладаць з яе, паэт застаўся адданым на ўсё жыццё юнацка-студэнцкаму захапленню. Роднасныя душы па-за межамі айчыннай паэзіі ён шукаў найперш сярод балгарскіх аўтараў. Гэта было як бы наканавана. «Ды ты і з выгляду падобны да балгарына!» — не аднойчы жартавалі сябры і пацвярджалі іншы раз памежнікі, з якімі Васіль сустракаўся ў часе вандровак менавіта ў Балгарыю.

«Сваіх» паэтаў ён знайшоў у асобах двух рамантыкаў і сімвалістаў П.Яварава і Д.Дэбелянава, пераклады з якіх давёў да аб'ёму кніжак. Паэтаў супярэчлівых і трагічных, як само памежжа XIX–XX стагоддзяў. Што пераЖыў у гэты перыяд балгарскі народ? Рашучую барацьбу супраць турэцкіх каланізатараў, абвяшчэнне незалежнасці і тут жа — дзве Балканскія вайны, тэрытарыяльныя страты, расчараванне ў саюзніках і, у значнай ступені, ва ўласных сілах… Крах патрыятычнай надзеі Пеё Яварава, аднаго са змагароў за свабоду, стаў прычынай таго, што ён «адвярнуў позірк ад навакольнага свету — скіраваў яго ў сябе, каб убачыць сябе, абцяжаранага спадчынным праклёнцем» (Г.Мілеў) .

Ад надзеі да смутку і пакутлівага роздуму над светам і жыццём ішоў таксама Дзімча Дэбелянаў. Ягонае расчараванне крытыкі звязваюць перш за ўсё з расчараваннем урбаністычнага «пакалення, якое прыйшло з правінцыі ў Сафію, прагна ўдыхнула паветра культуры і раптам страціла ўчарашнюю непасрэднасць» (П.Зараў). Аднак жа, як і Яварава, яго глыбока трывожыць гістарычная доля роднага краю — «краю пакут і ярма». І на фронт Першай сусветнай вайны паэт ідзе добраахвотнікам не толькі дзеля ўцёкаў ад «тлуму зямнога».

Іх, духоўна і творча блізкіх паэтаў, яднаюць і неаднаразовыя трагедыі ў інтымным жыцці — то маральныя, то фізічныя страты сваіх каханых, і ранняя гібель іх саміх, якую кожны прадчуваў. Прадчуванні фатальна спраўдзіліся: П.Яварў скончыў зямны шлях самагубствам — у 36, Д.Дэбелянаў сустрэў смерць на фронце — у 29…

Сімвалізм — з'ява шматгранная, яна не ўмяшчаецца ў рамкі нейкай дактрыны, застылай тэорыі. У яго выдатных балгарскіх прадстаўнікоў сімвал рэдка калі замяняў вобраз рэальнага свету, якім бы гэты свет ні быў чужым і непрымальным, песімізм і ўпадніцтва не выключалі жадання «трапіць да радасці на свята жыццёвага бязмежжа» (П.Яварў) і веры ў часіну «вялікага смутку па радасці светлай» (Д.Дэбелянаў). Антыномы — рэальнасць і сон, мара і ілюзія, свята і цемра — былі для іх тымі вытокамі і складнікамі, што нарадзілі такія шэдэўры, як «Армяне» або «Смерць» Яварава, «Ахвярапрынашэнне» або «Ціхая перамога» Дэбелянава. Яны, як і многія іншыя вершы, у скарбонцы еўрапейскай паэзіі, у тым ліку ў беларускіх перакладах, дзякуючы галоўным чынам В.Сахарчуку.

Бадай, ніхто так не пранікае розумам і сэрцам у верш, не «абмацвае» яго да костачкі (да коскі), як перакладчык. Для гэтага трэба дасканала, да нюансаў ведаць мову арыгінала, успрымаць напісанае на ёй у кантэксце ўсёй творчасці паэта, ягонага лёсу і быць адразу ў трох іпастасях — і чытачом, і крытыкам, і аўтарам (сааўтарам). Сярод тых, хто імкнуўся і імкнецца да такога ідэалу, нямала айчынных перакладчыкаў. Імя Васіля Сахарчука — у іх шэрагу.



ЛЕКТОРЫЙ

# ПРЫСТУПКІ ДА ПЕРАКЛАДУ

Васіль САХАРЧУК

**Што такое пераклад? Узнаўленне духу твора сродкамі роднай мовы. Разбурэнне твора […] дзеля яго перастварэння. Перасяленне твора ў іншую моўную стыхію. Новабудоўля. Значыць, перакладчык — таленавіты майстра, які па-мастацку, віртуозна валодае ўсімі будаўнічымі спецыяльнасцямі? Так і не зусім так, ён не проста будаўнік, а творца, які будуе новы дом паводле гатовага праекта, бо перавезці будынак не дазваляе моўная мяжа.**

Праца перакладчыка знешне сапраўды нагадвае працу будаўніка. Адзін бярэ бервяно за бервяном, другі — слова за словам. Толькі адзін працуе рукамі і галавой, другі — сэрцам і розумам. Аснова іх дзейнасці, безумоўна, — сумленныя адносіны да працы, павага да аўтара — твора — праекта, абавязак перад аўтарам — чытачом — навасёлам.

З чаго пачынаецца пераклад таго ці іншага аўтара, маю на ўвазе перш за ўсё паэта, паколькі я перакладаю толькі паэзію? З ведання (вывучэння) не толькі яго творчасці і ідэйна-мастацкіх пошукаў, яго лёсу, жыцця, але і літаратуры, да якой гэты паэт належыць. З захаплення гэтай літаратурай, з любові [да] яе, бо толькі любоў нараджае творцу, з ясна акрэсленых пазіцый (ідэйна-мастацкіх) перакладчыка, яго прафесійнай падрыхтоўкі, нарэшце. Гэта, так сказаць, падмурак, зруб яго творчай дзейнасці, без гэтага нельга брацца за пераклад. […] У гэтым я пераканаўся на ўласным вопыце. Падрыхтаваў некалькі падборак балгарскай паэзіі для «Даляглядаў», а перакладаю ўвогуле з канца 1980 года, раней да перакладаў не звяртаўся.

«Даляглядаў-83» надрукавалі 10 вершаў Хрыста Радзеўскага. Гэта быў, па сутнасці, пачатак, хаця ў друку і да гэтага часу з'яўляліся падборкі балгарскіх паэтаў. Перакладамі Х.Радзеўскага я цяпер не задаволены, бо дрэнна ведаў творчасць паэта, а балгарскую літаратуру — павярхоўна.

Для «Даляглядаў-84» падрыхтаваў некалькі вершаў Пеё Яварава. Чым больш чытаў пра яго, тым больш шліфаваў вершы. Гэтая работа працягваецца і цяпер — рыхтую кнігу перакладаў паэта «Апалавы пярсцёнак», якая стаіць у выдавецкім плане на 1987г. (Зборнік «Апалавы пярсцёнак» выйшаў у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1988г. — Рэд.). Менавіта з Яварава пачалося вывучэнне балгарскай літаратуры. Боцеў, а потым Явараў і Венгераў аказалі найбольш уплыў на далейшае развіццё яе. Паэт пазнаецца ў агульным кантэксце духоўнай і рэвалюцыйнай дзейнасці народа, яго гісторыі і культуры. Дарэчы, і цяпер некаторыя вершы яго выклікаюць сумненне, асабліва «Две хубави очи» (у перакладзе — «Вочы-прамяні»). Прыняў чацвёрты варыянт перакладу гэтага верша і адчуваю, што ён не ўдаўся.

П.Явараў — выключна музычны паэт. Трэба ўзірацца і ўслухоўвацца не проста ў кожны радок — у кожнае слова, у кожны гук. Дый увогуле гэта павінна быць адным з прынцыпаў перакладу. Узірацца, услухоўвацца ў слова, у гук, каб спасцігнуць дух твора і ўзнавіць яго. Безумоўна, пры перакладзе нешта і траціцца, але страты дапускаюцца дзеля ўзнаўлення духу, менавіта духу твора.

Значыць, такі пераклад пачынаецца з захаплення перакладчыка. Без гэтага яму нельга садзіцца за свой рабочы стол.

Першай прыступкай да ўзнаўлення твора, які захапіў перакладчыка, і ён проста не можа, а то і не мае права не перакласці […], становіцца высвятленне месца гэтага твора ў творчасці паэта, яго значэння для літаратуры ўвогуле, а затым высвятленне нюансаў тэксту і падтэксту. Словам, пачынаецца даследчыцкая дзейнасць перакладчыка.

Другой […] прыступкай — аналіз формы, суадносін паміж радкамі, словамі, гукамі.

Трэцяй — узнаўленне твора ў роднай мове, якую ён [перакладчык], заўважым, павінен ведаць дасканала.

Чацвёртай — параўнанне ўзноўленага твора з арыгіналам, што павінна весці да стварэння варыяцый радкоў, строф, а то і ўсяго верша.

Пятай — выбар варыянта, які найбольш адпавядае арыгіналу, і шліфоўка яго.

Асаблівасць перакладчыцкай дзейнасці заключаецца ў тым, што яна дапускае існаванне некалькіх твораў, узноўленых новымі майстрамі. Не дзеля канкурэнцыі, вядома, а дзеля дакладнай перадачы арыгінала, яго духу, што становіцца галоўным няпісаным законам перакладчыка. […]

Шмат спрэчак вядзецца пра падрадкоўнік. Існаванне яго звязана з тым, ведае ці не перакладчык мову арыгінала. Аднак і ў тым і ў другім выпадку падрадкоўнік робіцца — альбо на паперы, альбо ў свядомасці, у памяці. Лепш у памяці — гэта спрыяе больш жывому, творчаму падыходу да твора і ўзнаўленню яго. Па сутнасці, падрадкоўнік — справа перакладчыка. Але мастацкі твор — кветка, якая павінна заўсёды цвісці. Гербарый — самае непрадугледжанае сховішча для яе. Засушаную ружу можна пакласці ў гербарый, каб успамінаць яе водар. Арыгінал з пачатку да канца трэба трымаць, як ружу, якую ты разам з зямлёй рашыў падарыць каханай. Кветак з гербарыя каханыя не прымаюць, дый іх сорамна дарыць. Чытачу патрэбны жывыя, а не засушаныя перакладныя творы. Ён гэта заўсёды гаворыць адкрыта, за што заслугоўвае павагі і любові.

Прыступкі, пра якія я згадаў, зразумела, умоўнасць. Але гэтыя моманты існуюць у перакладчыцкай дзейнасці. Колькі б ні было гэтых прыступак да твора, які пераходзіць у іншую моўную стыхію і застаецца ў ёй на старонках газет, часопісаў, кніг, — іх перакладчык не зможа пераадолець без любові да чытача, без адказнасці перад ім. Чытач перакладчыка любіць загадзя, хаця можа не заўсёды цікавіцца яго імем. І на гэта ёсць свае прычыны. Адна з іх заключаецца ў тым, што пра перакладчыкаў і іх кнігі мала пішуць.

Перакладчык адказны тройчы, бо ўвасабляе тры асобы; ён пасрэднік паміж аўтарам перакладнога твора і чытачом. Аўтар і чытач сустракаюцца ў ім — безумоўна, у асобе, таленавітым творцы, працавітым і сумленным чалавеку са сваім поглядам на свет і літаратуру



Чытач перакладчыка любіць загадзя, хаця можа не заўсёды цікавіцца яго імем. І на гэта ёсць свае прычыны




І ўсё-такі што такое пераклад? Параўнаў перакладчыка з будаўніком і задумаўся. З вясковым цеслем, напрыклад, усё зразумела. Скажам, паставіў ён дом у Брэсцкай вобласці, а з часам абставіны вымусілі яго пераязджаць у Мінскую. Разабраў ён яго, пранумараваў бярвенні, пагрузіў і перавёз на новае месца жыхарства. Неўзабаве з гатовага будаўнічага матэрыялу паставіў той жа дом. Нешта, вядома, страціў, але гэта сутнасці не змяніла.

Перакладчык таксама разбурае твор, але не для таго, каб перавозіць у іншую моўную стыхію, а для таго, каб вывучыць яго ідэйна-мастацкую і вобразную структуру, карацей кажучы, каб на аснове гатовага праекта знайсці свае сродкі — гатовых не мае — і адбудаваць, узнавіць яго роднай мовай.

Падыход да справы ў будаўніка і перакладчыка не аднолькавы. Падабенства яго — чыста фармальнае. Цесля — рамеснік, перакладчык — творца. Не дай Бог ім перамяніцца ролямі. У цеслі мэта носіць чыста практычны характар. Ён узнаўляе дом на новым месцы, каб жыць у ім. Перакладчык узнаўляе твор, каб умацоўваць духоўныя сувязі народаў, іх літаратуру, таму ён выступае ў ролі духоўнага пасярэдніка збліжэння і ўзаемаабагачэння нацыі, місіянера дружбы і інтэрнацыянальнай сувязі народаў. Ён жыве не для сябе, а для народа.

Варыянтнасць перакладу […]. Любы пераклад недастатковы, бо ён не люстраны адбітак арыгінала. Не дай Бог перакладчыку браць на дапамогу люстра. У яго руках яно можа аказацца крывым. І тады…

Ёсць вершы, нібыта напісаныя для перакладу, а ёсць і неперакладныя. У Яварава «Две хубави очи». Нават назву нельга перакласці так, каб не даць ёй іншае адценне. Перакладзеш даслоўна — і атрымаеш амаль анатамічны выраз: два прыгожыя вокі. Паэзія назвы разбурана ўшчэнт. Значыць, яе трэба мяняць, сыходзячы са зместу верша, а ён таксама «неахвотна» кладзецца ў чужую для яго моўную стыхію.

Напачатку пайшлі варыянты назвы: «Яе вочы», дарэчы, у рускім перакладзе яна гучыць менавіта так — «Её глаза» (памойму не проста недакладна, але і дрэнна); першы варыянт адышоў сам — на змену прыйшло «Твае вочы» — не тое, затым «Як промні, твае вочы» — дакладней, але доўга, сінтаксічна абгрувашчана, у арыгінале — святло, лёгкасць, музычнасць, як гэта перадаць? Паэт прызнаваўся, што вочы яго каханай, а ёй акурат прысвечаны верш, аблівалі яго, бы промні майскага сонца. Такім чынам, спыніўся на канчатковым і найбольш блізкім — «Вочы-прамяні».

Пераклад верша парадзіў 10 варыянтаў… Так, па сутнасці, трэба працаваць над кожным перакладам.

Вось ён, канчатковы варыянт, калі яго можна назваць дастатковым:

## Вочы-прамяні

*Два промні ззяюць у вачах тваіх.*
*Душа дзіцяці ў іх —*
*і песню ловіць слых.*
*Ні просьбы ў іх, ні абяцання ў іх…*
*Душа мая — маленне,*
*дзіця,*
*душа мая — маленне.*

*На ўзлёце ці ў падзенні*
*закрые іх назаўтра лёс*
*заслонай сораму і слёз.*
*Заслонай сораму і слёз*
*іх не закрые заўтра лёс*
*на ўзлёце і ў падзенні.*

*Душа мая — маленне,*
*дзіця,*
*душа мая — маленне.*
*Ні просьбы ў іх, ні абяцання ў іх…*
*Душа дзіцяці ў іх.*
*І песню ловіць слых.*
*Два промні ззяюць у вачах тваіх.*

**10.03.1985–20.03.1985**

**З рукапіснага архіва аўтара.**
**Да друку падрыхтаваў Алесь Каско**

АГЛЯД

# ПРАГА ВОЛЕВЫЯЎЛЕННЯ: «ДЗЕЯСЛОЎ»-54

ЛеГАЛ

**Прага свабоды, як унутранай, так і знешняй, у чарговым нумары «Дзеяслова» вылучная ў лепшых публікацыях часопіса.**

Да прыкладу, Уладзімір Някляеў (нізка вершаў «Лісты да Волі») прамаўляе з нутра сваёй Айчыны, прагнучы ўласнай знешняй свабоды, а Макс Шчур (аповесць «Аўтсайдэр») адгукаецца з чужаземнага вонку, але прагне свабоды ўнутранай... Аднак тады як у Някляева, нават скрозь шчыліны турэмных укратаванняў, прасвечвае падтэкставы світальны прамень аптымізму, у Шчура, у фінале твора (пры ўдалым зняцці героем вулічнай прасталыткі, каб нарэшце наталіць свой сексуальны пожад) героі сыходзяць у глыбокую беспрасветнасць начы...

Тры найбольш выбітныя творы нумара — цыкл аповедаў В. Казько «Пра Моцю», нізка вершаў Уладзіміра Някляева «Лісты да Волі» і аповесць Макса Шчура «Аўтсайдэр».

Порцыя даволі вясёлых (з сур'ёзным падтэкстам) апавяданняў Віктара Казько выклікае настальгію па краіне дзяцінства. Прыгоды хлапчука Моці (Моні, Мацвейкі) даволі займальныя і, што важна, сучасныя. Пры чытанні раз-пораз усплываюць асацыятыўныя вобразы з «Прыгодаў Тома Соера» Марка Твена. Праўда, тое — параўнальнае — бачыцца як дзіўныя, застыглыя ў далёкім часе, заваконныя пейзажы з вакна хуткаснага цягніка. Ці не мог бы сённяшні казькоўзкі Моця стаць для чытачоў своеасаблівым беларускім Томам Соерам? Пэўна мог бы, калі б, скажам, гэты запамінальны тэкст пераўвасобіўся аўтарам у арыгінальны сцэнарый мультыплікацыйнага фільма (а ў дадатак знайшліся б таленавіты рэжысёр і спонсар). Пасля ранейшых цяжкіх, падчас трагічна-пакутлівых, твораў Віктара Казько гэтыя яго тэксты — як глыток азону пасля гарачага задушлівага пераднавальнічнага ліпеньскага сонцастаяння. Сучасная Беларусь як радзіма новага беларуса праглядваецца ва ўсіх неймаверных сюжэтах, з якіх вынікае беспрасветнасць і наканаванасць яго чалавечай долі. І нездарма, відаць, аўтар (праз Моцю), разважаючы пра сталых людзей, задаецца зусім недзіцячым пытаннем: «Дзе і калі яны страцілі здзіўленне. Раздзяцінелі. Дзе і калі яны так паразумнелі, што назаўсёды страцілі, не, не толькі здзіўленне, а саму радасць здзіўляцца»... Ёсць над чым задумацца. (Праўда, пры далейшай публікацыі шаноўнаму аўтару сям-там трэба пазбавіцца стылявых агрэхаў і русізмаў, тыпу «кружка», «к вечару», «у тую стэп»...)

Вершы Уладзіміра Някляева пазнавальныя не толькі сваёй «імяннной задакументаванасцю» ахвярна-змагарнага часу, але і стылістычна-нязменнай пастановачнай тэатральнасцю дзеяння, голаса, жэсту — працей кажучы, прыналежнай яму ўнут-




ранай драматургіяй. Лаканічнасць і афарыстычнасць твораў тонка прадуманая і вычувальна-выбаленая. Праўда, нельга адсланіцца ад думкі, што і тут паэт змагаецца талентам з рэжымам, тады як насамрэч талент павінен змагаць паэта.

*Хто ж мой вядок? Ён служка Бога,*
*Ці служка д'ябла — мой вядок?*

Не зважаючы на некаторую кан'юнктурнасць паводзін паэта, я заўжды быў і застаўся прыхільнікам паэзіі У. Някляева. Яго вершы заўсёды былі жывыя і жывучыя. У іх не было запраграмаванай панылdescribed, заняпаду і незваротнага песімізму. Вось і цяпер, патрапіўшы ў ахвярны задзёр дзеля святой ідэі, нягледзячы на жорсткі драматызм паразы, ён не перастае высмоктваць з гэтай страшнай па сваёй сутнасці гісторыі паэтычны нектар для яе мастацкага ўвасаблення. Барацьба за нацыянальныя ідэалы, змаганне за самога сябе для паэта Някляева — гэта адчайныя спробы згарманізаваць палярны чорна-белы свет.

Безумоўна, цяжка знайсці пазітыў, а тым больш аптымістычныя настроі, сыходзячы з агульнага ўспрымання усяго цыкла гэтых вершаў, гэтак як нельга нарадзіцца белым ад негрыцянскага шлюбу. Таму — Бог над усім. Не памятаю, каб Ён так часта (і не думаю, што «всуе»?) упамінаўся паэтам у іншых яго публікацыях ці кніжках.

*Пераступіўшы праз парог*
*І ўбачыўшы, што за парогам*
*Няма нічога, я бярог*
*Усё, пра што ў сумоўі з Богам*
*Дамоўлена было, а Бог*
*За гэта ўсё*
*Мяне бярог.*

Сціслей і вытанчаней не скажаш. Але не быў бы то беларус, каб не пачаць наноў свой звычны колазварот жыцця, як толькі паслабее ўдаўка лёсу:

*І запарваеш гарбату*
*Мне сама,*
*Бо ўсё ж хата — гэта хата.*
*Не турма.*

Хочацца спадзявацца, што той запарны дымок над кубачкам будзе віцца бясконца, нераўнуючы як нітачка нашай паднебнай вечнасці... Чалавечае жыццё і высокая паэзія таго вартыя.

Аповесць Макса Шчура «Аўтсайдэр», шчыра скажу, чыталася мной з большым імпэтам, чым астатнія тэксты часопіса, у тым ліку і ўжо вышэй упомненыя. Змрочна-зляжалая, густая, з прэлым пахам дэкадэнцкая проза ўжо даволі вядомага аўтара стамляе, але не адпускае чытача невядома якім чынам нарастаючай спагадай да беспрытульнага, зняверанага і абыякавага героя, які спадзяецца не так на сябе, як на нейкі цуд...

Мяне не асабліва ўразілі раней прачытаныя празаічныя тэксты М. Шчура, а вось гэты забраў (можа, таму, што ён пэўным чынам уласна ім перажыты). Зрэшты, чытаючы, я ўвесь час не выпускаў з галавы недзе некалі вычытанае і ўпадабанае мной выслоўе: «пишут от побуждения и увлечения, а не от принуждения и необходимости». Магчыма адсюль і вынікае маё чытацкае стаўленне да прозы гэтага літаратара. У кароткай аповесці ім падвяргаецца падрабязнаму псіхалагічнаму аналізу адзін дзень «беглага эмігранта» ў чужаземным Месце. І хоць герой кажа:«Пастанаўляю, што ў рамане не будзе ніякага Места, я выкрэсліваю яго з плану і з памяці: надоўга, назусім. Ніякіх хронікаў штодзённасці, споведзяў, ляментацыяў. Пісаць пра што заўгодна, толькі не пра той здзек, што адбываецца вакол мяне й са мною. Знікнуць, уцячы з гэтага банальнага свету, дзе няма нічога геraічнага, і дзе толькі цяпер я напоўніцу адчуваю сябе самым нікчэмным і прыніжаным чалавекам, тым, кім я ёсць насамрэч: паразітам і дармаедам без усякіх перспектываў...». Жорсткая «самакрытычная» характарыстыка. Але і пэўны спадзеў у гэтай самнамбулістычнай прастрацыі тэкста з яго аморфна-бясконцым одумам таксама ёсць і ён пасвойму адпаведны спадзевам і думкам тых безыменных герояў, што засталіся тут...

Вартыя чытацкай увагі і напісаныя з густам — жыва і займальна — успаміны вядомага журналіста і сатырыка Алеся Усені. Яго запісы, заснаваныя на дакуменце чалавечай памяці, сваім шчырым ненавязлівым сан-

**Але не быў бы то беларус, каб не пачаць наноў свой звычны колазварот жыцця, як толькі паслабее ўдаўка лёсу**

тыментам выклікаюць у чытача пачуццё зваротнай удзячнасці. Неўкамянелыя, не зараслыя быльнягом нябыту часы далёкага савецкага дзяцінства на пачатку брэжнеўшчыны адкрываюцца аўтарам нязмушана і хораша, любасна і балюча, як тое і ўспрымалася жыццесцвярджальнай падлеткавай душою. Божа, колькі прыгажосці ў людзях было, і колькі яе згінула разам з людзьмі і... адышоўшым часам, хацеў напісаць, аднак Алесь сваімі літаратурнымі памяткамі засцярог: многае й засталося... І праўда, чытаеш і цешышся, бо і ў тваім жыцці былі падобныя дзеі — і па сёння засталіся не менш цёплыя ўражанні ад іх. Цяпер іх шкада, як самога сябе. І добра, што некаторыя з нас яшчэ рупяцца пакінуць (хоць на паперы) сляды той памяці для нашчадкаў. Нехта можа запярэчыць майму станоўчаму стаўленню да гэтых тэкстаў, маўляў, праставата напісана... Дык аўтар і прэтэндуе ўсяго толькі на свайго чытача, а не на нобелеўскую прэмію...

Чытач не павінен прамінуць і нечаканую публікацыю з астрога праваабаронцы і літаратуразнаўцы Алеся Бяляцкага «Сардэчная мова нябёсаў» (невядомыя вершы Анатоля Сыса). Вядомы палітычны і грамадскі дзеяч дзеліцца ўспамінамі пра асобныя моманты жыцця «выклятага» паэта, а таксама з дзясяткам невядомых і недрукаваных дагэтуль вершаў і перакладаў А. Сыса. Раю пачытаць.

Варта ўважліва прыглядзецца і да стракатай і аб'ёмнай выбаркі лепшых твораў маладых аўтараў, што вылучаны журы з дасланых на конкурс, абвешчаны беларускім ПЭН-цэнтрам да 100-годдзя з дня нараджэння лаўрэата Нобелеўскай прэміі Чэслава Мілаша, каб раптам здзіўлена запыніцца на нізцы вершаў Асі Волкавай... Адметны пераклад прозы нідэрландскага пісьменніка Тона Толегена («Ад усяго сэрца», святочныя апавяданні пра жывёлаў) зроблены Ганнай Янкутай. Агулам змешчаны тэксты 35 паэтаў, празаікаў і перакладчыкаў са 136, што бралі ўдзел у гэтым конкурсе. З задавальненнем адзначу, што ёсць таленавітая змена ў нацыянальнай літаратуры. Праўда, склалася ўражанне, што шмат якія падборкі маглі б быць карацейшымі. Таму завяршу агляд канкурсантаў напаўіранічнай цытатай з верша ўпомненай вышэй А. Волкавай:

*Адно паэты, ад Байрана*
*І да апошняга жывога*
*постмадэрніста,*
*Пахнуць дымам і пацалункі іх*
*Горкія на смак,*
*Бо паляць яны беспрабудна.*
*І той самай запалкай*
*Пакідаюць папялішчы рукапісаў.*

Прыцягне да сябе ўвагу і кароткая, але выдатна выпісаная, «Сечка-15» Андрэя Федарэнкі. Даўно заўважана, што поблізнае дыханне «великого и могучего» не дае Андрэю Міхайлавічу спакою, як і яго заўсёдныя літаратурныя «апаненты» — Л. Талстой, А. Чэхаў... Я. Брыль і В. Быкаў. (Якія пары для духоўнага двубою!) І яшчэ: аўтар, мабыць, разлічваў на шырокі публічны рэзананс працытаванага парасійску пасквіля, накіраванага «невядомым даносчыкам» на адрас Адміністрацыі Прэзідэнта, у якім спляжаны ідэалагічны ўхіл публікацый часопіса «Маладосць», у тым ліку аповеда «Уночы» самога А. Федарэнкі. Канечне, «какая гадость, эта ваша заливная рыба!», але ж ці навіна гэта сёння ў нашай дзяржаве і ў літаратуры ў прыватнасці?!

Апроч гэтых, бегла разгледжаных мной твораў, у часопісе змешчаны чытэльнае, але відочна падагнанае пад злабадзённую тэматыку, апавяданне Віктара Сазонава «Залік па ЧэДэГэ», увогуле дабротныя вершаваныя нізкі паэтаў Ігара Сідарука, Алеся Аркуша і Эдуарда Дубянецкага ды ўжо звычны для творчасці паэткі са Светлагорска Соф'і Шах вянок санетаў, ад пачатку да канца прадзьмуты скразняком жыццёвых акалічнасцяў, мо таму так і называецца — «Вецер».

Публікуецца чарговая порцыя дзённікавых старонак Ніла Гілевіча «Год дзевяноста восьмы», дзе, на мой погляд, для суперажывальнага ўспрымання запісаў чытачом аўтару трэба было б зменшыць перавагу ўласнай нязломнай правоты і дадаць хаця б трохі крошак іранічнай (а Гілевіч гэта ўмее!) самакрытычнасці. Але ўсё адно, дужа цікава «вярнуцца» ў канец дзевяностых, калі яшчэ песімізм і пафігізм дарэшты не паралізавалі грамадска-нацыянальную свядомасць большасці беларускага электарата.

Працягваецца публікацыя «кінадраматургічнага лёсу Васіля Быкава» яго даследчыкам і «збіральнікам» Сяргеем Шапранам. Літаратуразнаўца Анатоль Трафімчык друкуе артыкул пра няпростыя ўзаемаадносіны Якуба Коласа і Панцеляймона Панамарэнкі. Алесь Гібкоўскі разважае над «парадоксамі геапалітыкі («другая сусветная вайна і Беларусь»). Доктар філалогіі Іван Лепешаў «выдае на гара» рэпліку адносна напісання прыназоўнікаў «у» і «на» ў дачыненні Беларусі як дзяржавы і пэўнай адміністрацыйнай адзінкі. Аўтар гэтага агляду (ЛеГАЛ) паспрабаваў упісаць «у вечны кантэкст нацыянальнай літаратуры» юбіляра (80 гадоў, яшчэ раз сардэчна віншуем!) знанага паэта Анатоля Вярцінскага. Журналістка Кацярына Безмацерных жыва і актуальна гутарыць з мастакамі Аленай Бараноўскай і Віталём Герасімавым.

Гэтым разам заўважны раздзел крытыкі. Павел Абрамовіч друкуе частку сваёй будучай, пакуль недапісанай, кнігі. І хуткае выданне тэкстаў даравітага літаратара бачыцца істотным і, што важна, чытэльна-палемічным. Крытык Ірына Шаўлякова публікуе разгорнутую рэцэнзію на новую кнігу Алы Сямёнавай «У святой краіне выгнання...» Афарыст Алег Аблажэй лаканічна адгукаецца на кніжку для дзяцей Сержука Вітушкі «Дзінь-дзілінь: пара гуляць у казкі».

Завяршае публікацыі нумара рубрыка «Дзеяпіс» з анатацыяй кніжных навінак, што выйшлі апошнім часам у недзяржаўных выдавецтвах. Увага! Падпісчыкам «Дзеяслова» прыкладваецца да нумара аўдыёдыск з дакументальнай стужкай пра змагарную айчынную паэтку Ларысу Геніюш.

Словам, тэкстаў хопіць на ўсе густы. Таму, спадарства, актыўней далучайцеся да беларускага пісьменства, «каб не страціць святое штосьці».

## ПАЛІЦА

**Барадулін Рыгор. Anima: вершы. — Мінск: Рым.-Катал. парафія св. Сымона і св. Алены, 2011. — 452 с. + 22 с. укл.**




Anima — па-латыні «душа». Душа вечная, бо яна ўдыхнута ў чалавека Усявышнім. Душа, дух, дыханне. Усё з душой жывое, без душы мёртвае. У кнізе сабраны кананічныя малітвы ў паэтычнай інтэрпрэтацыі аўтара, біблейскія балады, псалмы, вершы-малітвы, а таксама вершы пра сэнс жыцця, пра вялікую любоў да бацькі, маці, роднай зямлі. «Anima» — роздум творцы пра сутнасць жыцця, спроба сам-насам пагутарыць з Нябёсамі.

**Барадулін Рыгор. Толькі б яўрэі былі!..: кніга павагі і сяброўства. Склад. Н. Давыдзенкі, прадм. В. Нікіфаровіча; заўв. І. Сляповіча. — Мінск: Кнігазбор, 2011. — 244 с.**




Кніга народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, як заўсёды, незвычайная, змястоўная. Яе складаюць артыкулы і ўспаміны пра знаных дзеячаў яўрэйскай культуры, пераклады паэзіі Х.-Н. Бяліка, М. Надзіра, М. Шагала, І. Харыка, Х. Мальцінскага, Р. Рэлеса і многіх інш.

Аснова заключнага раздзела — вершы, прысвечаныя яўрэйскім святыням, а таксама вершы і дарчыя надпісы (захаваныя ў рабочых блакнотах) творцам, блізкім сябрам і калегам: Н. Кісліку, А. Дракахрусту, Я. і М. Серперам, В. Нікіфаровічу, Б. Забораву, Д. Сімановічу і інш., асабліва кранальныя сваёй журбой і вясёлай пяшчотай.

**Гілевіч Ніл. Збор твораў у 23 тамах. Том 17. Паэты і пісьменнікі замежных краін: штрыхі да партрэтаў, эсэ, эцюды, абразкі. — Мінск, 2011. — 568 с.**




У 17 том Збора твораў народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча ўвайшлі эсэ пра паэтаў і пісьменнікаў Расіі (А. Пушкіна, Ул. Маякоўскага, С. Ясеніна, А. Твардоўскага і інш.), Украіны (Т. Шаўчэнку, І. Франко, П. Тычыну і інш.), літаратурна-крытычныя эцюды пра балгарскіх паэтаў, а таксама эсэ пра пісьменнікаў іншых краін свету.

**Гілевіч Ніл. Збор твораў у 23 тамах. Том 20: фальклארыстыка. — Мінск, 2011. — 496 с.**




Кнігу склалі «Гутаркі пра апавядальніка і мудраслоўныя жанры беларускага фальклору», даследаванні «Паэтыка беларускіх загадак», навукова-папулярныя нарысы «Песенны фальклор паўднёвых і заходніх славян», а таксама артыкулы, рэцэнзіі, матэрыялы для лекцый.

**Лукашук Аляксандр. Сьлед матылька. Освальд у Менску. (Бібліятэка Свабоды. ХХІ стагодзьдзе.) — Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2011. — 390 с.: іл.**




«Сьлед матылька. Освальд у Менску» — гісторыя двух гадоў жыцця ў беларускай сталіцы Лі Гарві Освальда — амерыканскага грамадзяніна, які стаў забойцам 35-га прэзідэнта ЗША Джона Кэнэдзі. Разам з тым гэта дакументальнае падарожжа ў Менск 1960-х.

**Лыч Леанід. Нацыянальна-культурнае жыццё на Беларусі ў часы вайны (1941–1944 гг.) — Вільня: Наша будучыня, 2011. — 332 с.: іл. — («Неизвестная история»)**




У нядалёкім мінулым «партыйныя даследчыкі» малявалі жыццё былых савецкіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі як адно працяглае катаванне злымі ворагамі, як знішчэнне беларускага народа. На самой жа справе, калі параўнаць жыццё беларусаў «пад немцамі» са сталінскім тэрорам і русіфікацыяй 30-х гадоў, дык бачна, што тут адбывалася адраджэнне беларускай мовы і школы, беларускай царквы і беларускай культуры. Пра гэта чытачы даведаюцца з кнігі вядомага даследчыка айчыннай культуры, доктара гістарычных навук, прафесара Леаніда Лыча. Яна разлічана на шырокую аўдыторыю.

**Мілаш Чэслаў. Даліна Ісы; пер. з пол. Марыі Пушкінай; Нобелеўская лекцыя; пер. з польскай Яўгена Бурага. — Мінск: Логвінаў, 2011. — 376 с.**




Раман «Даліна Ісы» — адзін з найцікавейшых празаічных твораў нобелеўскага лаўрэата Чэслава Мілаша (1911–2004). Аўтабіяграфічная кніга пра дзяцінства і сталенне, «вялікая вандроўка па краіне памяці». Яна напісаная Мілашам у эміграцыі і апублікаваная ў Парыжы ў 1955 годзе. Апавядае пра хлопца Томка, які толькі-толькі ўваходзіць у дарослае жыццё. Падзеі разгортваюцца пасля першай сусветнай вайны, у Літве, на берагах ракі Нявежы, якая атрымала ад аўтара літаратурнае імя Іса. У якасці дадатка друкуецца «Нобелеўская лекцыя» Чэслава Мілаша.

**Мільён непатрэбных гукаў: Конкурс маладых літаратараў. — Мінск: Галіяфы, 2011. — 30 с.**



«Мільён непатрэбных гукаў» — зборнік вершаў маладых паэтаў, якія «дэкламуюць» жэстамі нязвыклыя людзі. Нязвыклыя — у тым, што размаўляюць на фантастычнай мове — мове глухіх. Такім чынам, у зборніку ёсць спроба вынаходкі мастацкай формы — сімбіёза тэксту і фотаздымка. Аўтар ідэі — Аляксандр Абуховіч — паказвае існаванне вершаў у новым вымярэнні. Перад чытачом распачынаецца карагод паэзіі ў яркіх фарбах — мастацкае слова гучыць праз мову жэстаў.

**Максімюк Ян. Словы ў голым полі: беларуская літаратура 1990-х гадоў у снах, успамінах і фотаздымках. — Мінск, Логвінаў, 2011. — 224 с. — (Галерэя «Б»).**




Кніга напісана ў рэдкім жанры «крытычных успамінаў пра эпоху», тэкстаў, што пісаліся аднačасова з ходам падзей у беларускі літаратурным жыцці і апублікаваныя ў розных выданнях. Заканчваецца «падарожжа па памяці» ўспамінамі пра даўнюю вандроўку ў «сталіцу свету» («New York, New York»), напісанымі Янам Максімюком адмыслова для гэтага выдання.

**Паўзэфанг Гудрун. Хмара: раман. Пер. з нямецкай Ул. Папковіч. — Мінск: Логвінаў, 2011. — 160 с.**




Кніга была напісана аўтаркай пасля трагедыі ў Чарнобылі. Раман — фантастычная гісторыя пра жудасную ядзерную катастрофу на адной з АЭС у Германіі. Сярод бежанцаў аказаліся двое дзяцей: дзяўчынка чатырнаццаці гадоў і яе сямігадовы брацік. Іх бацькі ў ад'ездзе, таму дзеці рушылі ў цяжкае і небяспечнае падарожжа на роварах. Хлопчык гіне, дзяўчынка апраменьваецца…

**Стагановіч Аляксандр. Успаміны пасла. Прадм. А. В. Пашкевіча; камент. А. В. Пашкевіча, А. Э. Гардзіенкі. — Мінск: Лімарыус, 2011. — 270 с.: іл. — («Беларуская мемуарная бібліятэка»)**




Гэтай кнігай пачынае жыццё новая серыя, якая не мае аналагаў у нашай краіне: «Беларуская мемуарная бібліятэка». Тут будуць сабраныя ўспаміны, дзённікі, эпісталяры, пакінутыя беларусамі або выхадцамі з беларускіх земляў, пра падзеі, што адбываліся ў Беларусі, у блізкім і далёкім замежжы цягам апошніх стагоддзяў. Ва ўспамінах пасла польскага Сейма Аляксандра Стагановіча, апрача палітычнай дзейнасці, знайшлі адлюстраванне і іншыя перыяды яго біяграфіі: дзяцінства, маладосць, служба ў Францыі, дзейнасць падчас Другой сусветнай вайны і на эміграцыі. Храналагічна ўспаміны завяршаюцца канцом 1940-х гг. і даводзяцца да часу ад'езду аўтара за акіян.

**Янушкевіч Яўстафій. Успаміны (1805–1831). Уклад., пер. з польскай мовы, уступ. арт., камент., паказ. В. В. Гарбачовай. — Мінск: Лімарыус, 2011. — 256 с.: іл. — («Беларуская мемуарная бібліятэка»)**




Выданне ўяўляе з сябе першую ў беларуска-польскай традыцыі публікацыю ўспамінаў слуцкага эмігранта 30-х гадоў XIX ст., выдаўца твораў Адама Міцкевіча, заснавальніка Польскай друкарні і кнігарні ў Парыжы Яўстафія Янушкевіча (рукапіс захоўваецца ў Ягелонскай бібліятэцы (Кракаў, Польшча)). Тэкст друкуецца ў перакладзе на сучасную беларускую мову і ў польскім арыгінале. Выданне разлічана на даследчыкаў, гісторыкаў і філолагаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, краязнаўцаў, а таксама на ўсіх аматараў айчыннай гісторыі.

ПРЭМІІ

# БУКЕР-2011

**Букераўскую прэмію за 2011 год атрымаў брытанскі пісьменнік Джуліан Барнс — за раман «Адчуванне канца» («The Sense of an Ending»).**



Ён уступіў у «літаратурны клуб», у якім значацца Салман Рушдзі, Бэн Окры, Айрыс Мердок, Кінгслі Эйміс, Роддзі Дойл ды іншыя літаратары, уганараваныя «Букерам».

«Рашэнне аб узнагароджанні прэміяй сёлета далося нялёгка», — прызналася падчас прэсавай канферэнцыі ў Лондане старшыня журы, экс-старшыня брытанскай выведкі MI-5 Стэла Рымінгтон. 150-старонкавы раман Д. Барнса крытыкі назвалі «навэлай», і многія члены журы выступалі супраць пісьменніка.

Аднак «ні кроплі крыві на дыван не пралілося», запэўніла С. Рымінгтон. Паводле яе, усе члены журы засталіся задаволеныя вынікамі.

«Адчуванне канца» распавядае пра гісторыю звычайнага чалавека, імя якога Тоні і які аднойчы ўсвядоміць, што яго ўспаміны не такія праўдападобныя, як яму здавалася раней. Як адзначыла С. Рымінгтон, каб адчуць усю красу рамана-навэлы, яго неабходна перачытаць некалькі разоў, і тады адкрыецца велізарны пласт утоенай інфармацыі і паўнамёкаў.

Брытанскі пісьменнік атрымае грашовую ўзнагароду ў памеры 50 тысячаў фунтаў стэрлінгаў (каля 75 тысячаў даляраў ЗША), яго калегі па пяры, якія ўвайшлі ў шорт-ліст прэміі, таксама атрымаюць грашовую ўзнагароду — у памеры 2,5 тысячаў фунтаў.

Нагадаем, што летась «Букерам» уганараваўся «габрэйскі Джэйн Осцін» Говард Джэйкабсан. Прэмія была прысуджаная яму за раман «Пытанне Фінклера». Твор прысвечаны лёсу габрэяў у Вялікабрытаніі. Пісьменнік закрануў і агульначалавечыя тэмы: пошук кахання, здабыццё сяброўства і ўменне змірыцца з паразамі.

# ЛІТПРЭМІІ ФРАНЦЫІ

**2 лістапада сталі вядомыя ўладальнікі дзвюх прэстыжных французскіх прэміяў — Ганкураўскай і прэміі Рэнадо.**

Лаўрэатам Ганкураўскай прэміі стаў 48-гадовы пісьменнік Алексіс Жэні (Alexis Jenni) за свой раман «Французскае мастацтва вайны» (L'Art français de la guerre). Раман выйшаў у выдавецтве Gallimard.

Гэта трэці раман Алексіса Жэні, настаўніка біялогіі з Ліона, хаця дэбютны з надрукаваных. Першую сваю кнігу аўтар не прапаноўваў да друку, другі ж яго твор выдавецтвы друкаваць адмовіліся. Сам сябе аўтар называе «нядзельным пісьменнікам», маючы на ўвазе свае спарадычныя заняткі літаратурай.

Паводле аўтара, праца над кнігай «Французскае мастацтва вайны» заняла ў яго пяць гадоў. На яе стварэнне Жэні часткова натхнілі дэбаты пра французскую нацыянальную ідэнтычнасць, распачатыя ўрадам Нікаля Сарказі. Жэні меў на мэце справакаваць чытачоў на роздумы з гэтай нагоды. У аснове кнігі — прыгоды, што разгортваюцца на фоне французскай ваеннай гісторыі падчас нямецкай акупацыі ў часы Другой сусветнай вайны, а таксама ў каланіяльную эпоху ў Індакітаі і Алжыры.

Яшчэ да перамогі ў Ганкураўскай прэміі кніга прадалася накладам у 56 000 асобнікаў. Звычайны ж наклад для лаўрэатаў Ганкура — 400 000 асобнікаў. Хаця грашовы эквівалент прэміі зусім невялікі. Цяпер ён складае 10 еўра.

У сёлетні шорт-ліст прэміі таксама ўвайшлі Сорж Шаландон (Sorj Chalandon) з раманам «Вяртанне ў Кілібэгс» (Retour a Killybegs), Кароль Марцінэс (Carole Martinez) з раманам «Маёнтак Мюрмюр» (Du Domaine des Murmures) і Ліянэль Труё (Lyonel Trouillot) з раманам «Прыўкрасная любоў чалавечая» (La belle amour humaine).



Алексіс Жэні

Лаўрэатам другой літаратурнай прэміі Францыі, якую ўручаюць у адзін дзень з Ганкураўскай, — прэміі Рэнадо — стаў Эмануэль Карэр з кнігай «Лімонаў» пра расійскага пісьменніка і палітыка Эдуарда Лімонава.



Эмануэль Карэр

Біяграфічная кніга Карэра перамагла ў другім туры галасавання раман Сільвена Тэсона «У сібірскіх лясах» з шасцю галасамі журы супраць чатырох.

Падчас напісання твора Карэр, продкі якога эмігравалі ў Францыю з Расіі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, спецыяльна прыязджаў у Маскву і сустракаўся з героем сваёй кнігі.

«Ён (Лімонаў) глядзіць на сябе як на героя, яго можна назваць нягоднікам. Але са свайго боку я не спяшаюся з высновамі і ацэнкамі», — адзначыў Карэр.

Сам жа Лімонаў у сваім блогу пазітыўна ацаніў працу пісьменніка. Стаўленне да сябе з боку аўтара кнігі Лімонаў ахарактарызаваў так: «Часам прыязна, часам варожа. Адчуваецца, што аўтар інтэлектуал і буржуа».

Гэта не першая біяграфічная кніга Эмануэля Карэра. Раней ён выдаў біяграфію амерыканскага пісьменніка Філіпа Дзіка «Я жывы, гэта вы памерлі». Нагул жа яго кнігі перакладзеныя больш чым на 20 моваў свету.

Прэмія Ренадо (або прэмія Тэафраста Рэнадо) — літаратурная прэмія, заснаваная ў 1926 годзе дзесяццю французскімі журналістамі і літкрытыкамі, якія чакалі вынікаў абмеркавання Ганкураўскай прэміі. Лічыцца, што прэмія Рэнадо стала своеасаблівым дадаткам да Ганкураўскай. Па традыцыі абедзве прэміі ўручаюцца ў адзін дзень, у першы аўторак лістапада.

РОЗГАЛАС

# «ПІПІ» АБВІНАВАЦІЛІ Ў РАСІЗМЕ

**Паводле нямецкага тэолага з асацыяцыі жанчын-евангелістак Эксе Вольрад, вядомая ва ўсім свеце кніга «Піпі Доўгаяпанчоха» шведскай пісьменніцы Астрыд Ліндгрэн утрымлівае прыкметы расізму.**




«Рэч не ў тым, што вобраз Піпі расісцкі, але ўсе тры кнігі трылогіі ўтрымліваюць каланіяльныя расісцкія стэрэатыпы», — заявіла Вольрад шведскай газеце «The Local».

Выдаўцы памянялі ўжо тытул бацькі знакамітай дзяўчынкі з Негрыцянскага караля Паўднёвага мора на Караля Паўднёвага мора. Але, па словах Вольрад, у кнізе яшчэ стае «праблемных месцаў».

«У кнізе чорныя дзеці кідаюцца на пясок перад белымі дзецьмі», — адзначыла яна, — Чытаючы кнігу свайму чорнаскураму пляменніку, гэты абзац я папросту прапусціла». «Канечне, я б не стала асуджаць кнігу цалкам, наадварот, у ёй шмат пазітыўных месцаў, з аднаго боку, яна вельмі смешная, а, з другога, павучальная, бо ў ёй не толькі моцная гераіня, але яна таксама выступае супраць кіраўніцтва дарослых і пратэстуе супраць гвалту над жывёламі — у кнізе вельмі добрая крытыка ўлады», — кажа актывістка.

Дапамагчы даць рады з «сумнеўнымі эпізодамі», на думку Вольрад, могуць зноскі ў новых выданнях «Піпі», якія патлумачаць кантэкст «расісцкіх выказванняў», каб з дзяцінства прывучыць дзяцей да жыцця ў мультыкультурным грамадстве. «Трацiна дзяцей ва ўзросце да пяці гадоў з эмігранцкіх сем'яў. Выдаўцы ж думаюць, што толькі белыя жанчыны сярэдняга класу купляюць гэтыя кнігі», — зазначае яна.

Кніга «Піпі Доўгаяпанчоха» выйшла ў 1945 годзе ў Швецыі і хутка разляцелася па ўсім свеце. На беларускую мову першую частку трылогіі пра свавольную дзяўчынку Піпі ў 2008 годзе пераклаў Дзмітры Плакс.

**Паводле замежных інфармацыйных крыніцаў падрыхтавала Юля Цімафеева**

ЛІТКУХНЯ

# НЕ КРАДЗІЦЕ — І БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ

**Песню «Бывайце здаровы» беларускага паэта Адама Русака прысвойваў сабе Міхась Ісакоўскі. І аўтар ведаў аб тым. А Саюз пісьменнікаў БССР адстойваў аўтарскія правы беларуса!**

«Бывайце здаровы» — народны шлягер, які ў розныя гады ўпрыгожваў рэпертуар Леаніда Уцёсава, Ларысы Аляксандроўскай, Іосіфа Кабзона, Якава Наўменкі, Надзеі Мікуліч, ансамбля «Песняры». Спакойная, светлая, лірычная, танцавальная, народная — сёння песню з сямідзесяціпяцігадовай гісторыяй ведаюць малыя і дарослыя.

У далёкім 1936 годзе паэт, скрыпач і валтарніст з сяла Пясочнае Капыльскага раёна Адам Русак, саліст Ленінградскага сімфанічнага аркестра Малога опернага тэатра, напісаў некалькі знакамітых радкоў у лісце да маці… Крыху пазней на Адама набеглі ўспаміны аб родным краі, выдатных нівах і палях, гасцінным народзе, і ён працягнуў пачаты верш. Ісаак Любан, які разам з Русаком вучыўся ў Мінскім музычным тэхнікуме, патрапіўшы ў госці да сябра, прыгледзеўся да зграбных рыфмаў. Матыў на душэўныя чатырохрадкоўі-пажаданні прыйшоў сам па сабе… Ад Адама Русака тэкст гэтай песні запісаў, як згадвала дачка паэта-песенніка Людміла Русак, Анатоль Астрэйка, рэдактар газеты «Слава працы».

…І песня стала фальклорнай. Неўзабаве былі апублікаваны тэкст і пазначана аўтарства, а праз некаторы час «Бывайце здаровы» разышлася па ўсіх кутках вялікага СССР.

«Тата атрымаў ад Леаніда Уцёсава ліст, у якім пісалася: «Паважаны Адам Герасімавіч! Вашу цудоўную песню «Бывайце здаровы» я пачаў спяваць у 1938 годзе. Поспех быў велізарны. Як ні дзіўна, яна гучала не толькі ў мірныя гады, але і на фронце, дзе мы яе спявалі, выклікаючы ў байцоў радасную ўсмешку і падзяку за нястрымны аптымізм гэтай песні»», — распавяла Людміла Русак, дачка паэта-песенніка.

Апынуўшыся ў руках паэта Міхася Ісакоўскага, аўтара «Кацюшы», «Сново замерло всё до рассвета», «Ой, цветёт колина…», песня здабыла другое, расійскае, жыццё: была названая «Пожелание», а аўтарам тэкста пачаў значыцца… Ісакоўскі.

У саракавым годзе Саюз пісьменнікаў БССР вырашыў адстаяць аўтарскія правы Адама Русака і напісаў афіцыйны ліст перакладчыку.

«Саюз пісьменнікаў атрымаў афіцыйны адказ ад Міхася Ісакоўскага, у якім ён выбачаецца за тое, што не ведаў, што ў песні ёсць аўтар, і абавязваецца больш не друкаваць песню пад сваім прозвішчам», — згадала Людміла Русак.

Слова вялікі расійскі паэт не стрымаў… У пасляваенныя гады ў сям'ю Русакоў з Масквы патрапіла выдатна аформленая брашура «Бывайце здаровы», і аўтарам значыўся зноў… Міхась Ісакоўскі.

**Н. К.**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 2 СНЕЖНЯ, ПЯТНІЦА

### БЕЛАРУСЬ 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна). 1-я серыя.
**10.15** Вострасюжэтны серыял «Замах» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія).
**12.10** Сфера інтарэсаў.
**12.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**13.00** Драматычны серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**14.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.40** Фартыфікацыя.
**16.20** Эпоха. Падзеі і людзі.
**17.05** Вострасюжэтны серыял «Замах» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.
**18.00** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.45, 01.40** Дзень спорту.
**22.00** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Трылер «Тэлефонная будка» (ЗША).
**00.05** Меладрама «Англійскі цырульнік» (ЗША).

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Дублёр».
**22.45** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**23.00** «Наша Беларашa».
**23.35** Фільм «Мая любімая цешча».
**01.25** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фантастычны фільм «Адысей і Выспа Смугі». Канада, 2008 г.
**10.40** «Ашуканцы».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Паўфінал Першай лігі МС КВЗ.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Расійскія покерныя турніры».
**00.20** Фільм «Крэмень». Расія, 2007 г.
**01.50** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### БЕЛАРУСЬ 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Дакументальна-пазнавальны серыял «Бітвы дыназаўраў» (ЗША).
**10.00** Час футболу.
**10.45** Ясі і худзей.
**11.20** Школа рамонту.
**12.30** Цела чалавека.
**13.05** Страсці па культуры.
**13.50** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна). Заключная серыя.
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.20** Нянудны глобус.
**15.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Бітвы дыназаўраў» (ЗША).
**16.45** Бітва экстрасэнсаў.
**17.50** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна). Заключная серыя.
**18.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Бітва экстрасэнсаў.
**22.35** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**00.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы - 2012. Лёсаванне фінальнай стадыі.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Зварот Прэзідэнта РФ Дз. Мядзведзева да грамадзян Расіі.
**12.05** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.Весткі.**
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Прэм'ера. «Юрмала - 2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** Фільм «Варанька». 2007 г.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25** «Вочная стаўка».
**11.15** «Да суду».
**12.10** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
**23.05** Вострасюжэтны фільм «Хованкі».

### EUROSPORT

**10.30** Санкавы спорт. Кубак свету. Агляд.
**11.00, 17.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Остэрсунд (Швецыя).
**12.30, 16.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Остэрсунд (Швецыя).
**14.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**14.10** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км. Класічны стыль. Куусама (Фінляндыя).
**15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**18.15** Live. Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Остэрсунд (Швецыя).
**19.30** Live. Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**20.00** Live. Футбол.
**21.00** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Хуткасны спуск.
**22.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Хуткасны спуск. Лейк-Луіс (Канада).
**00.00** Live. Конны спорт. Парыж (Францыя).
**01.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.45** Покер. Каны (Францыя).
**02.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**03.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** Басанож па свеце.
**08.00** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 3 серыя.
**08.45** Рэпартэр.
**09.10** «Зорны пірат», тэлесерыял: 1 серыя.
**09.35** «Euromaxx».
**10.05** «Лебядовыя гады», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**10.35** «Краты», дак. цыкл.
**10.45** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бяссрэбранікі», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**11.45** Эксперт.
**12.10** Басанож па свеце.
**12.40** «Навенькая», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**13.20** «Euromaxx».
**13.50** «Зорны пірат», тэлесерыял: 1 серыя.
**14.15** «Афганец», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**14.35** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 3 серыя.
**15.20** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.45** «Краты», дак. цыкл.
**15.55** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бяссрэбранікі», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**17.00** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 13 серыя.
**17.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Навенькая», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**18.50** «Андрэй Такінданг: «..апрануўшы белую кашулю..», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**19.05** Маю права.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 1.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Краты», дак. цыкл.
**21.35** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**22.00** «Надвор'е на заўтра», маст. фільм, 1986 г., Польшча.
**23.35** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**23.40** Аб'ектыў.
**00.05** Гарачы каментар.

## 3 СНЕЖНЯ, СУБОТА

### БЕЛАРУСЬ 1

**06.35** Існасць.
**07.00** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Ранішняя хваля.
**09.45** Скрынка перадач.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** Прэм'ера. «Сваты. Жыццё без грыму». Дакументальны цыкл (Украіна).
**12.10** Музычная камедыя «Дзяўчына з гітарай» (СССР).
**14.00** Мультфільм.
**14.15** Вакол планеты.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.55** Камедыйная меладрама (ЗША).
**17.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Беларуская мара».
**18.00** Ваша лата.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** «Славянскі базар-2011».
**21.00** Панарама.
**21.30** Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне 2011». Прамая трансляцыя з Арменіі.
**23.30** Фантастычная камедыя «Чаго жадаюць жанчыны» (ЗША).
**01.35** Дзень спорту.

### ОНТ

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**12.00** Прэм'ера. «Яўген Міронаў. «Прозвішча абавязвае».
**13.00** Хвіліна славы. Самае лепшае.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Кацярына Васільева. З ценю ў святло пералятаючы».
**17.20** Прэм'ера. «Адмысловае заданне».
**18.40** «Адзін супраць усіх».
**19.25** Прэм'ера АНТ: «Фактар смеху».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Балеро».
**22.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.25** «Што? Дзе? Калі?».
**00.35** Фільм «Адзінаму, да запатрабавання».

### СТВ

**07.00** «Анфас».
**07.15** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.05** «Я - вандроўца».
**09.30** «Чыстая праца».
**10.20** «Мінск і мінчане».
**10.55** Камедыя «Оскар». Францыя, 1967 г.
**12.25** «Прыгоды дылетанта».
**13.00** Дэтэктыў «Шпік пецярбургскай паліцыі». Расія, 1991 г.
**14.35** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**15.05** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Меладрама «Паненка-сялянка». Расія, 1995 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Камедыя «Элвін і бурундукі 2». ЗША, 2009 г.
**21.55** «Зорны рынг».
**23.10** «Покер дуэль».
**00.00** Фільм «Я ўсё яшчэ тут». ЗША, 2010 г.
**01.50** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### БЕЛАРУСЬ 2

**06.55** Каханыя камедыі. Фільм «Падкідыш» (СССР).
**08.15** Дабравест.
**08.45** Мір вашай хаце.
**08.55** Пра мастацтва.
**09.25** Жансавет.
**10.00** Ясі і худзей.
**10.40** Школа рамонту.
**11.45** Інтуіцыя.
**12.50** Серыял «Маргоша» (Расія).
**14.55** Каханыя камедыі. Фільм «Падкідыш» (СССР).
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**17.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Ньюкасл - Чэлсі.
**19.40** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**20.35** «Халі-Галі». Скетч-шоў.
**21.00** КЕНО.
**21.05** Бітва экстрасэнсаў.
**22.15** Крымінальная камедыя «Голы пісталет 2 1/2: Пах страху» (ЗША).
**23.55** Трылер «Паляўнічыя за розумам» (ЗША-Нідэрланды).

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Варанька». 2007 г.
**08.40** «Юрмала - 2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Мая вуліца».
**13.25** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма.
**14.45** «Бацюшкі адмысловага прызначэння».
**15.40** Фільм «Паўночнае ззянне». 2001 г.
**17.35** Прэм'ера. «Новая хваля - 2011». Лепшае.
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Фільм «Адчыніце, гэта я». 2011 г.
**23.45** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Акадэмія прыгажосці».
**09.25** «Гатуем».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.10** «ГРУ. Таямніцы ваеннай выведкі».
**15.00** Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
**16.20** Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
**19.30** Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
**00.20** ДзіДзюЛя. Вялікі канцэрт у Крамлі.
**01.15** Моладзевы трылер «Застацца ў жывых».

### EUROSPORT

**10.30, 14.00, 16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Хуткасны спуск. Лейк-Луіс (Канада).
**12.00** Live. Лыжнае двабоўства. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**12.45** Live. Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны круг. Жанчыны. Данія - Швецыя.
**14.30** Live. Лыжнае двабоўства. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсена. Лілехамер (Нарвегія).
**15.15** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт вольным стылем. Дзюсельдорф (Германія).
**16.30** Live. Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Остэрсунд (Швецыя).
**17.45** Live. Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**18.45** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Остэрсунд (Швецыя).
**21.00** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Супер-гігант.
**22.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Хуткасны спуск. Лейк-Луіс (Канада).
**00.00** Live. Конны спорт. Парыж (Францыя).
**01.30** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны круг. Жанчыны. Швейцарыя - Германія.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Навенькая», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**08.20** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 13 серыя.
**08.45** Калыханка для самых маленькіх.
**09.15** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 1.
**09.45, 13.30** Еўропа сёння.
**10.15, 14.00** ПраСвет.
**10.40** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**11.05** «Андрэй Такінданг: ...апрануўшы белую кашулю...», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**11.20** «Краты», дак. цыкл.
**11.30** МакраФон: «Канцэрт Змітра Вайцюшкевіча».
**12.05** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 13 серыя.
**12.30** Калыханка для самых маленькіх.
**12.55** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 1.
**14.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**14.50** «Надвор'е на заўтра», маст. фільм, 1986 г., Польшча.
**16.25** «Краты», дак. цыкл.
**16.35** Маю права.
**17.00** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 7 серыя.
**17.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Аблічча таталітарызму: «Генацыд армянаў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**19.00** Зона «Свабоды».
**19.30** Вагон.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.25** Беларускія лёсы: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 1.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** «Краты», дак. цыкл.
**21.25** Два на два (тэледыскусія).
**21.50** Суботні сеанс: «Вышэй за падазрэнні», маст. фільм, 2000 г., ЗША.
**23.30** «Мент», дэтэктыўны серыял: 1 серыя.
**00.20** Аб'ектыў.

## 4 снежня, нядзеля

### Беларусь 1

**06.35** Існасць.
**07.00** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Ранішняя хваля.
**09.45** Скрынка перадач.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** Прэм’ера. «Сваты. Жыццё без грыму». Дакументальны цыкл (Украіна).
**12.10** Музычная камедыя «Дзяўчына з гітарай» (СССР).
**14.00** Мультфільм.
**14.15** Вакол планеты.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.55** Камедыйная меладрама (ЗША).
**17.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Беларуская мара».
**18.00** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** «Славянскі базар-2011».
**21.00** Панарама.
**21.30** Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне 2011». Прамая трансляцыя з Арменіі.
**23.30** Фантастычная камедыя «Чаго жадаюць жанчыны» (ЗША).
**01.35** Дзень спорту.

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** Фазэнда.
**11.45** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.45** Ералаш.
**13.30** «Вялікая розніца» у Адэсе. Фінал.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.25** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.40** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Гонар нацыі».
**22.30** Прэм’ера. «Гэта выдатна!» Юбілейны канцэрт.
**00.00** Фільм «Дом кінжалаў, якія лётаюць».

### СТВ

**07.15** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.00** «Аўтапанарама».
**09.30** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.20** «Вялікі сняданак».
**11.00** Камедыя «Элвін і бурундукі 2». ЗША, 2009 г.
**12.35** «Добры дзень, доктар».
**13.10** Фільм «Экіпаж». СССР, 1979 г., 2 серыі.
**15.40** Ток-шоў «Такі лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Хлоя». ЗША-Канада-Францыя, 2009 г.
**22.30** Прафесійны бокс.
**23.30** Фільм «Мастацтва хораша раставацца». Францыя , 2005 г.
**00.50** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### Беларусь 2

**07.35** Камедыя «Мымра» (Расія).
**08.55** Размова са святаром.
**09.05** Прыступкі Веры.
**09.25** Таямніца Душы.
**09.50** Цела чалавека.
**10.30** Ясі і худзей.
**11.05** Школа рамонту.
**12.15** Інтуіцыя.
**13.20** Кінаспробы.
**13.55** Гандбол. Кубак ЕГФ. Прамая трансляцыя.
**15.30** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны.
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**17.10** Хакей. КХЛ.
**19.20** Камедыя «Мымра» (Расія).
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Навіны надвор’я.
**21.45** Камедыйная меладрама «Нявеста, што ўцякла» (ЗША).
**23.55** Драма «Фальшываманетчыкі» (Аўстрыя-Германія).

### Россия

**07.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.25** «Звычайны канцэрт».
**07.55** Фільм «Адчыніце, гэта я». 2011 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** 1/2 фіналу Вышэйшай лігі КВЗ РБ.
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.30** Прэм’ера. «Колер вайны. Бітва за Маскву».
**15.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.00** Прэм’ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**18.05** Прэм’ера - 2011. «Стылягі-шоў».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.00** Выбары-2011.

### НТВ

**07.35** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Першая перадача».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.25** Фільм «Адзін дзень».
**15.15** Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
**21.00** Сёння. Выніковая праграма.
**22.25** Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
**23.20** Прэм’ера. Фільм «Сібірак».

### Eurosport

**10.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Остэрсунд (Швецыя).
**11.45** Live. Лыжнае дваяборства. Кубак свету. HS 131. Лілехамер (Нарвегія).
**12.30** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**13.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Остэрсунд (Швецыя).
**14.15** Live. Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Остэрсунд (Швецыя).
**15.00** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Камандныя спаборніцтвы. Спрынт. Дзюсельдорф (Германія).
**16.00** Live. Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**17.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Остэрсунд (Швецыя).
**18.00** Live. Конны спорт. Парыж (Францыя).
**19.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Камандныя спаборніцтвы. Спрынт. Дзюсельдорф (Германія).
**19.45** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант. Спроба 1.
**20.45** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Супер-гігант. Лейк-Луіс (Канада).
**22.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Остэрсунд (Швецыя).
**22.45** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант. Спроба 2.
**23.45** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Дзень 2-і.
**01.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Жанчыны. Італія - Германія. Масква (Расія).

### Белсат tv / Belsat

**07.00** Аб’ектыў.
**07.15** Зона «Свабоды».
**07.45** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**08.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 7 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.30** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**10.00** «Краты», дак. цыкл.
**10.10** Беларускія лёсы: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 1.
**10.40** Аблічча таталітарызму: «Генацыд армянаў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**11.35** «Мент», дэтэктыўны серыял: 1 серыя.
**12.25** Два на два (тэледыскусія).
**12.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 7 серыя.
**14.05** Калыханка для самых маленькіх.
**14.35** «Краты», дак. цыкл.
**14.45** Беларускія лёсы: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 1.
**15.20** «Вышэй за падазрэнні», маст. фільм, 2000 г., ЗША.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 4 серыя.
**18.00** Два на два (тэледыскусія).
**18.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**18.35** «Ваенныя гульні», дак. фільм, 2009 г., Польшча: 4 серыя.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**19.55** Дакументальная гадзіна: «Катынь», дак. фільм, 2010 г., Польшча: ч. 1.
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**21.40** «Краты», дак. цыкл.
**21.50** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.20** Фільматэка майстроў: «Ясмін», маст. фільм, 2006 г., Польшча.
**00.05** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.15** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**00.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Бабруйск:(8 029) 628 75 01, Вольга
Мінск: (8 029) 178 31 68, Вольга
Слуцк 8-044 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

| Счет получателя | 3012741108019 | Лицевой счет | Код 739 |
|---|---|---|---|
| УНП* | 190790926 | | |

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

НОВЫ ЧАС

www.novychas.org

ІНІЦЫЯТЫВА

# УСІМ ГУЛЯЦЬ У БАДМІНТОН

Алег НОВІКАЎ

**Расійскі прэзідэнт Дзмітрый Мядзведзеў атрымаў у народзе новую мянушку — «Валанчык». Усе дзякуючы афіцыйнай кампаніі бадмінтанізацыі ўсёй краіны.**



Увогуле, роля кіраўніка дзяржавы ў папулярызацыі тых ці іншых відаў спорту ў Расіі заўсёды была высокая. Задоўга да прэзідэнта Мядзведзева генсек Леанід Брэжнеў так моцна балеў за хакейную каманду СССР, што практычна кожная савецкая рэспубліка ў 1970-я абзавялася сваёй камандай. Першы прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын вельмі любіў валейбол (дагэтуль штогод праводзяцца спаборніцтвы на Кубак Ельцына па валейболе) і тэніс, да якога прэзідэнт далучыў усю расійскую эліту. Уладальнік чорнага пояса па дзюдо прэзідэнт Уладзімір Пуцін выклікаў бурны рост школ і секцый па самых розных адзінаборствах.

Свой унёсак у традыцыю зрабіў і Мядзведзеў. Пра бадмінтон загаварылі пасля таго, як напрыканцы кастрычніка прэзідэнт змясціў у сваім блогу відэаматэрыял пра карысць гульні. Гэты матэрыял падрыхтавалі ў якасці ўступнага слова для навучальнага фільма «Азбука валана», які знялі ў Нацыянальнай федэрацыі бадмінтона Расіі. У відэаролiку прэзідэнт не толькі распавёў пра сам спорт, але і прадэманстраваў тэхніку гульні ў пары з Уладзімірам Пуціным. «Хто добра гуляе ў бадмінтон — той хутка прымае рашэнні», — сказаў Мядзведзяў.

Рэакцыя на відэа была практычна імгненнай. Спачатку ў падкантрольных дзяржаве СМІ загаварылі пра тое, каб увесці бадмінтон у расійскіх школах у якасці трэцяга ўроку фізкультуры. Міністэрства адукацыі і навукі аператыўна падпісала дамову з федэрацыяй пра развіццё бадмінтона ў школе.

Пасля ў СМІ з'явілася навіна пра тое, што Міністэрства абароны збіраецца закупіць у 2012 годзе 10 тысяч ракетак і валанаў для вайсковых частак. «Пры гульні ў бадмінтон задзейнічаныя тыя ж органы, што і пры кіданні гранат, нажоў і іншых прадметаў. Таму гэты від спорту вельмі карысны ўсім без выключэння байцам. Але асабліва карысны ён будзе стралкам і снайперам, паколькі назіранне за валанчыкам трэніруе вока, умацоўвае сардэчна-сасудзістую сістэму і развівае хуткасць рэакцыі», — кажа начальнік Упраўлення фізічнай падрыхтоўкі Мінабароны палкоўнік Аляксандр Шчэпелеў.

Нарэшце, бадмінтонам зацікавіліся ў рэгіёнах. Ужо вядома, што на канец лістапада прызначана сустрэча Федэрацыі бадмінтона з настаўнікамі фізкультуры Маскоўскай і іншых абласцей. Адзін з уральскіх сайтаў піша, што ў кабінетах супрацоўнікаў Свярдлоўскага аблвыканкаму з'явіліся дыпломы за добрую гульню ў бадмінтон. «А раней віселі граматы за футбол і валейбол», — распавядаюць сведкі.

У маскоўскіх спартовых клубах у сярэднім попыт на заняткі бадмінтонам узрос у паўтара-два разы як сярод дзяцей, так і сярод дарослых.

Бадмінтон аказаўся някепскім сродкам барацьбы з апазіцыяй. На Радыё «Эхо Москвы» з'явіўся рэпартаж краснадарскай журналісткі, якая прыйшла на традыцыйны сход мясцовай апазіцыі каля будынку гарсавету. І вось што яна там пабачыла: «Спачатку я падумала, што гэта жарт: у сонечны і даволі цёплы для канца лістапада выходны дзень некалькі маладых людзей у сініх куртках з лагатыпам «Адзінай Расіі» на цэнтральнай вуліцы Краснадара прама пад вокнамі краявой адміністрацыі гуляюць (ці, дакладней, спрабуюць гуляць) у бадмінтон. Гучыць патрыятычная музыка са словамі пра адзіную моцную Расію. Дыджэй перыядычна абвяшчае, што «бадмінтон — лепшая альтэрнатыва курэнню», а «сапраўдны адзінарос не паліць папярос». Але гэта быў не жарт. Гэта была спецаперацыя супраць апазіцыйнага пікета».

Больш таго, валан і ракетка, аказваецца, маюць геапалітычнае значэнне. На сайце каўказскай службы «Радыё Свабода» сцвярджаюць, што ініцыятыва Мядзведзева — гэта адказ Саакашвілі.

У Грузіі Саакашвілі пашырае «моду на еўрапейскі стыль жыцця», паўсядзённай часткай якога з'яўляецца ровар. Цяпер захапленне Міхаіла Саакашвілі веласіпедным спортам увайшло ў вырашальную, манументальную фазу. Калі верыць СМІ, у цэнтры Тбілісі на месцы помніка Давыду Будаўніку хутка з'явіцца скульптурная выява гіганцкага ровара.

На думку «Радыё Свабода», Расія проста хоча годна адказаць прэзідэнту Грузіі. Аднак веласіпед для гэтага не падыходзіць. «Папершае, у яго маленькае сядло. А расійская бюракратыя ўкамплектаваная пераважна людзьмі буйнымі. Па-другое, для масавага спорту веласіпед вельмі дарагі. Па-трэцяе, няма веласіпедных дарожак. Іншая справа — бадмінтон! Не буду пералічваць усе бясспрэчныя перавагі гэтага далікатнага спорту. Адна з іх відавочна — таннасць. Можна за «смешныя грошы» забяспечыць кожнага расіяніна бясплатнай ракеткай, разбіць на пары і прымусіць ганяць валан. Уласна, працэс ужо пайшоў», — піша журналіст.

Адным словам, на першы погляд, Расія імкліва набліжаецца да Інданезіі, дзе бадмінтон сапраўды выведзены на нацыянальны ўзровень. Федэрацыю бадмінтона ў гэтай краіне адзін час нават узначальваў галоўнакамандуючы ўзброенымі сіламі.

Аднак некаторыя думаюць, што Інданезіі з Расіі не атрымаецца. Так, папулярны каментатар Віктар Шандаровіч мяркуе, што бадмінтанізацыя праваліцца з-за таго, што яе аўтар не ўспрымаецца ўсур'ёз нават сярод чыноўніцкага апарату.

«Вось калі б з падобнай відэапрапагандай выступіў Пуцін… І запатрабаваў увядзення лапты і гарадкоў… ці стральбы з лука… не важна чаго, важна, што — Пуцін… Выступіў бы і паглядзеў у тэлекамеру не «вінаватай усмешкай», а гэтак спадылба, як ён умее… — вось тады, клянуся, ніякія пісакі не ўтрымалі б Міністэрства абароны ад масавага закупу цецівы і стрэлаў. У Таманскай дывізіі бегалі б з лукамі, як індзейцы, за мілую душу! А з бадмінтонам, здаецца, аблом», — каментуе Шандаровіч.

Аналізуючы інтэрнэт-форумы, відавочна, што захапленне бадмінтонам у калідорах улады не зразумела простаму народу. Таму інтарэс да гэтага віду спорту будзе трымацца ў лепшым выпадку да таго часу, як прэзідэнтам застанецца Мядзведзеў.

У большасці людзі проста смяюцца: «Ура — у нас самая моцная ў свеце армія …па бадмінтону».

Аднак сустракаюцца і больш сур'ёзныя меркаванні: «Гледзячы на дзіўныя выхадкі нашага кіруючага тандэму, я часам пачынаю баяцца. А раптам яны і праўда штосьці такое ведаюць, што дазваляе ім паводзіць сябе так, як быццам будучыні няма? Як ні круці, а гэтыя двое — тэарэтычна адны з нешматлікіх людзей, больш іншых дасведчаныя пра тое, што і як адбываецца насамрэч. Можа, сапраўды застаецца толькі забаўляць публіку бадмінтонам, таму што хутка ўжо ўсё?»

Напрыканцы хацелася б дадаць, што сам па сабе бадмінтон тут не пры чым. Гэта сапраўды карысная для здароўя гульня.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Сёння перад эканомікай пытанне рэфармавання паўстала як ніколі востра. Паслухмяная беларуская наменклатура нават асмелілася спрачацца з прэзідэнтам, даказваючы неабходнасць рэформаў. Інакш, атрымаўшы танныя энерганосьбіты, Беларусь зноў падсядзе на расійскую энергетычную іголку, злезці з якой без поўнай страты суверэнітэту ўжо не зможа ніколі. Лукашэнка, забараняючы рэформы, сур'ёзна разлічвае вярнуць у 2012 годзе энергетычныя датацыі.

**«Независимая газета» (Расія)**

Беларусь як дзяржава знаходзіцца на мяжы банкруцтва: са студзеня інфляцыя імкліва павялічваецца, і, паводле прагнозаў міністэрства эканомікі, да канца года яна павінна скласці 100%. Кошты на прадукты выраслі ўтрая. На працягу шматлікіх гадоў Беларусь жыла не па сродках. Лукашэнка невысокай думкі пра свабодную рынкавую эканоміку. Расія ў 2007 годзе павялічыла кошт на нафту і прыродны газ, а праз год адбыўся сусветны эканамічны і фінансавы крызіс. У выніку прадпрыемствы ва ўсім свеце змушаны былі пайсці на значнае скарачэнне персаналу, а былы дырэктар саўгаса працягваў дзейнічаць так, як быццам нічога не адбылося. Большасць буйных прадпрыемстваў у Беларусі ўсё яшчэ знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці. У апошні час ходзяць чуткі пра тое, што сотні гэтых прадпрыемстваў павінны быць прыватызаваныя за сімвалічны кошт у некалькі еўра.

**«Spiegel» (Германія)**

Супярэчлівыя ўказанні Лукашэнкі, па меркаванні экспертаў, сведчаць пра калапс улады, які ў выніку толькі ўзмоцніць усе негатыўныя тэндэнцыі ў беларускай эканоміцы. У большасці сваёй яны адмаўляюць верагоднасць таго, што Беларусь зможа выйсці з крызісу без змены ўлады.

**«Новое время» (Арменія)**

Ключавым момантам у ціску на беларускі рэжым будзе супольная пазіцыя ЗША і ЕС па пытанні вылучэння Міжнародным валютным фондам крэдыту Беларусі ў памеры 8 мільярдаў долараў. У сваёй афіцыйнай заяве, апублікаванай пасля таго, як дэлегацыя фонду вярнулася з Мінска ў мінулым месяцы, МВФ досыць выразна даў зразумець, што вылучэнне крэдыту рэжыму Лукашэнка хуткім часам не адбудзецца.

**«Voice of America» (ЗША)**

Узнікае пытанне: што ж сама РФ будзе рабіць з расійска-беларускім эканамічным супрацоўніцтвам праз яшчэ пару гадоў? Зразумела, што адразу ж пасля ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю шматлікія нормы, з якімі пагадзіліся расійскія перагаворшчыкі, дзейнічаць не будуць. Пройдзе два, максімум тры гады — і Масквe давядзецца прызнаць, што адносіны з Мінскам, якія дазволілі дыктатару Аляксандру Лукашэнку выбудаваць на тэрыторыі Беларусі адну з самых неэфектыўных эканомік еўрапейскага кантынента, зараз не проста невыгодныя Расіі, але і супярэчаць яе міжнародным абавязальніцтвам. Менавіта таму РФ варта задумацца не пра тое, як абараніць Беларусь ад Украіны, а пра тое, як абараніць яе ад самой сябе.

**«Коммерсантъ» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. ТАТАРСКІЯ НАЦЫЯНАЛІСТЫ ГАЛАСУЮЦЬ ЗА ЛІБЕРАЛАЎ

Радыкальныя нацыяналісты з Саюза татарскай моладзі «Азатлык» («Воля») аказуюць арганізацыйную і агітацыйную падтрымку на думскіх выбарах рэгіянальнаму аддзяленню ліберальнай партыі «Яблоко». Як заявіў лідар «Азатлыка» Наіль Набіулін, Саюз татарскай моладзі, напрыклад, падзяляе меркаванне «яблычнікаў» пра тое, што праблему вывучэння, захавання і распаўсюду мовы ў нацыянальных рэспубліках неабходна перадаць суб'ектам федэрацыі. «Яблоко» выпусціла сваю праграму на татарскай мове, што паказвае павагу партыі да татарскага народа. Калі б выбары былі без фальсіфікацый, гэта партыя несумнеўна заняла б годнае месца ў Дзярждуме. Мясцовыя «яблычнікі» ад падтрымкі нацыяналаў адмаўляцца не сталі. Праўда, па меркаванні экспертаў, падтрымка татарскіх нацыяналістамі «Яблока» была цалкам прадказальная, паколькі партыя актыўна прасоўвае тэму падтрымкі малых народаў. Аднак падобная стратэгія ў Татарстане можа пазбавіць «яблычнікаў» галасоў рускіх выбарцаў, асабліва калі партыя Яўлінскага будзе супрацоўнічаць з радыкальнымі нацыяналістамі. У любым выпадку, татарскіх радыкалаў у рэспубліцы — ад сілы адзін працэнт ад агульнай колькасці насельніцтва, і нават калі яны ўсё прагаласуюць за «Яблоко», адчувальных вынікаў партыі гэта не прынясе.

**Паводле расійскай прэсы**

### ВЕНЕСУЭЛА. АБІРАЮЦЬ АДЗІНАГА КАНДЫДАТА АД АПАЗІЦЫІ

У Каракасе адбылася сустрэча пяці палітыкаў, якія гатовыя паспрачацца за права прадстаўляць усю апазіцыю на прэзідэнцкіх выбарах у кастрычніку 2012 года. Гэта губернатар адной з правінцый Пабла Перэс, мэр горада Міранда Энрыке Радонскі, дэпутат Марыя Мачада, былы мэр Леапольда Лопес і былы дыпламат Дыега Арыа. У лютым сябрам апазіцыйных партый, якія ўваходзяць у блок Mesa de Unidad Democratica, патрэбна будзе абраць адзінага. Найбольшыя шансы, на думку экспертаў, маюць Пабла Перэс і Марыя Мачада. У сваіх прамовах кандыдаты прадставілі план будучай Венесуэлы без Чавеса. У выпадку перамогі дэмакратаў, краіну чакае канстытуцыйная рэформа, накіраваная на скарачэнне паўнамоцтваў прэзідэнта, буйная кампанія супраць злачыннасці і наркамафіі, вялікая антыкарупцыйная чыстка сілавых і фіскальных структур.

**Паводле іспанскай прэсы**

### УКРАІНА. ЗМЕНА СТАРШЫНІ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ

У Саюзе пісьменнікаў Украіны (СПУ) адбылася рэвалюцыя: з'езд гэтай арганізацыі абраў новага старшыню — 61-гадовага кіраўніка кіеўскіх пісьменнікаў Віктара Баранава, адправіўшы ў адстаўку 69-гадовага Уладзіміра Яварыўскага, дэпутата Блока Юліі Цімашэнка, які ўзначальваў арганізацыю 10 гадоў. Абраць старшыню павінны былі яшчэ месяц таму. Тады пра сваё жаданне ісці на трэці тэрмін заявіў Яварыўскі, хоць статутам СПУ тры тэрміны запар забаронены. Усё дзякуючы таму, што юрысты знайшлі зачэпку, якая дазволіла гэта зрабіць. Месяц таму пісьменнікі сабраліся першы раз. Тады на выбарах першыя два месцы занялі Баранаў і Яварыўскі, атрымаўшы адпаведна 156 і 149 галасоў. Для перамогі трэба было 159 галасоў. Тады Яварыўскі зачыніў з'езд, не даўшы правесці другі тур галасавання, а новы выразы з'езд праз месяц. Сярод пісьменнікаў адразу пайшлі чуткі: месяц патрэбен старшыні для «апрацоўкі» тых, хто адсутнічаў. І сапраўды, ужо пасля з'езду луцкі пісьменнік Уладзімір Ліс публічна абвінаваціў «аднаго з дэпутатаў БЮТ» у спробах подкупу пісьменнікаў. Так ці інакш, на новым галасаванні Яварыўскі прайграў, прычым набраў менш галасоў, чым месяц таму — 144 (у Баранава — 171). Яварыўскі пакінуў з'езд, не павіншаваўшы пераможцу. Ці будуць змены ў СП? Па вялікаму рахунку, значных ідэалагічных адрозненняў паміж Яварыўскім і Баранавым няма — абодва з'яўляюцца ліберальнымі ўкраінскімі нацыяналістамі, але Баранаў больш талерантны да апанентаў і не завязаны з апазіцыяй. Варта згадаць, што апошнім часам меў месца канфлікт паміж адміністрацыяй прэзідэнта і кіраўніцтвам СПУ, якое заявіла, што Януковіч праводзіць палітык русіфікацыі.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### ЗША. КАЛЬВІН БЫЎ АНТЫГЛАБАЛІСТАМ?



Сетры Нуомі, генеральны сакратар Сусветнага аб'яднання рэфармаваных касцёлаў (WCRC), падзяліўся з паствай цікавай думкай. Па яго словах, калі б Кальвін быў жывы, ён абавязкова прыняў удзел у акцыі «Захапі Уол-Стрыт». «Я ўпэўнены, што апыніся ён (Жан Кальвін) у Нью-Ёрку або Лондане, ён выйшаў бы на вуліцу з транспарантам. Правадыр кальвіністаў, які, дарэчы паходзіць з Ганы, растлумачыў сваю думку: «Кальвін заўсёды быў супраць грамадскага прымусу, калі крыніца гэтага прымусу хаваецца ў грошах». Сетры Нуомі дадаў, што «сапраўдная царква XXI стагоддзя павінна кантактаваць з сіламі справядлівасці, калі нават гэта значыць неабходнасць выйсці на вуліцу».

**Па матэрыялах польскай прэсы**

ПАРТЫІ

# ТРЫУМФ ЯБЛЫКА

*Алег НОВІКАЎ*

**Вядучая нямецкая неанацысцкая партыя абрала новага правадыра. У той жа час грамадства і ўрад абмяркоўваюць праект забароны ў ФРГ арганізаваных праварадыкальных структур.**




Apfel — з нямецкага перакладаецца як яблык. Таму, калі справа тычыцца палітыкі, слова Apfel адразу выклікае асацыяцыю з партыяй расійскіх лібералаў «Яблоко». Аднак Хольгер Апфель далёка не ліберал. Ён нават не кансерватар. Ён новы фюрэр нямецкіх карычневых, якія, адпаведна праграме, дасюль марацъ пра рэстаўрацыю Трэцяга рэйху.

Лідарам нацдэмаў Апфеля абралі ў мінулыя выходныя на партыйным з'ездзе, які праходзіў у Нойрупіне, адным з гарадкоў зямлі Брандэнбург.

З'езд у Нойрупіне менш за ўсё нагадваў з'езды нацыстаў у Нюрнбергу ў 1930-я, пра адзін з якіх Лені Рыфеншталь зняла славуты «Трыумф Волі».

У Нойрупіне дэбаты наконт абрання старшыні партыі цягнуліся аж дзесяць гадзін! На кану было старшынства Уда Фойгта, які руліць NPD з 1996 года. Яму супрацьстаяў Хольгер Апфель, дэпутат зямельнага парламенту ў Саксоніі.

Гэта быў не проста канфлікт асобаў. Фойгт абараняе архаічную нацысцкую традыцыю, якая, па яго словах, трымаецца на трох ідэйных кітах — радыкалізме, нацыяналізме і сацыялізме. Сыходзячы з гэтага алгарытму Фойгт у свой час нават распрацаваў стратэгію дзейнасці партыі. На яго думку, стратэгія павінна адначасова спалучаць барацьбу за розумы, барацьбу за парламент і барацьбу за вуліцу.

З усіх гэтых задач Фойгт рэалізаваў толькі пункт пра барацьбу за вуліцу. Вялікая колькасць вулічных злачынстваў на расавай глебе ў Германіі ўскосна звязаная з актывістамі NPD. Таксама сабе ў плюс Фойгт можа залічыць паглынанне структур Нямецкага народнага саюза. Гэта партыя доўгі час канкуравала з нацдэмамі, аднак пасля сыходу спонсараў пачала дыхаць на ладан. Фойгт пераканаў народнікаў распусціць арганізацыю і стаць рэкрутамі NPD.

У іншых галінах вынікі старшынства Фойгта вельмі слабыя. Асабліва гэта тычыцца электаральнай статыстыкі. З'езд праходзіў па слядах правалу партыі на зямельных выбарах у Берліне. На цяперашні момант партыя прадстаўленая ў дзвюх землях — Саксонія і Мекленбург — Пярэдняя Памеранія.

Палітычная платформа Апфеля больш апартуністычная. Ён заклікае адмовіцца ад рэліктаў мінулага. Рэвізіі, на думку Апфеля, павінна падпасці нават фігура Адольфа Гітлера і спадчына Трэцяга рэйху. «Патрэбна, каб замілаванне часамі нацызму перастала быць галоўнай тэмай, з якой ідэнтыфікуюць партыю», — кажа Апфель. Ён бачыць NPD як «сучасную накіраваную ў будучыню правую партыю».

Канфрантацыя па лініі Фойгт — Апфель мае яшчэ адзін цікавы момант. Менавіта Уда Фойгт у далёкім 1990 годзе падабраў Апфеля амаль на вуліцы — на адной з тусовак маладых неанацыстаў, пабачыўшы ў ім талент палітыка-арганізатара. Пасля дарučыў стварэнне моладзевай секцыі NPD. Ён таксама дапамог Хольгеру абрацца ў зямельны парламент Саксоніі, дзе яго пратэжэ хутка стаў ключавой асобай у фракцыі. І вось сімвалічнай падзякай за усё зробленае стаў арганізаваны Апфелем бунт у партыі.

З іншага боку, гэта асабістая драма Фойгта ілюструе яго як слабага знаўцу чалавечай псіхалогіі. Фойгт думаў, што дзіцячае захапленне Апфеля гісторыямі пра «герояў» з СС ёсць нешта вечнае. Аднак Хольгер і шмат хто з яго сяброў перажылі юнацкія забабоны, адмовіліся ад старых ідэалаў у імя палітычнага прагматызму.

Падчас апошняй выбарчай кампаніі саксонская арганізацыя NPD адмовілася выступаць пад чорна-бела-чырвонымі сцягамі імперскай Германіі. Выбарчыя пікеты NPD праходзілі пад дзяржаўнай сімволікай ФРГ. З пункту гледжання артадаксальнага нацыста, гэта проста архіздрада. Сімволіка ФРГ — гэта сімволіка Веймарскай рэспублікі, якая гістарычна была для ўльтраправых абсалютным злом. Таксама саксонцы аднабакова змянілі лагатып партыі. У сваёй агітацыйнай прадукцыі NPD называла сябе не «партый нацыяналістаў», а «самай моцнай правай партыяй Саксоніі».

У выніку галасавання па кандыдатуры старшыні большасць дэлегатаў выказалася за абнаўленне. Апфель атрымаў каля 60 працэнтаў галасоў. Але эксперты асцярожна ацэньваюць магчымасць мадэрнізацыі партыі. На думку газеты «Die Zeit», шмат хто галасаваў за Апфеля, таму што ўсім надакучыў аўтарытарызм і неадэкватнасць Уда.

Між тым, пры ўсіх заклікаx саксонцаў да інавацый, Апфель і кампанія ніколі не адмаўляліся ад расавых лозунгаў. Крытыку на адрас Гітлера яны ўпарта называюць праявамі «антынямецкай палітычнай культуры, якая была навязаная немцам у 1945-м».

Палітычныя эксперты кажуць, што ў дадзеным выпадку лепш за ўсё ўжыць лакмусавую паперу. Гэтай паперкай ёсць традыцыйныя штогадовыя маніфестацыі нацыстаў у лютым у знак памяці па ахвярах бамбардзіровак Дрэздэну ў 1944 годзе брытанскай і амерыканскай авіяцыяй. Традыцыйна гэтыя акцыі, якія лічацца самым буйным нацысцкім мерапрыемствам у ФРГ, арганізоўвалі менавіта нацыянал-дэмакраты.

**Гэта быў не проста канфлікт асобаў. Фойгт абараняе архаічную нацысцкую традыцыю, якая, па яго словах, трымаецца на трох ідэйных кітах — радыкалізме, нацыяналізме і сацыялізме**

Пакуль неанацысты абіралі новае кіраўніцтва партыі, нямецкае грамадства спрачалася наконт яе магчымай забароны. Справа ў тым, што паліцыі абсалютна выпадкова ўдалося раскрыць небяспечную групоўку правых тэрарыстаў. Па дадзеных следства, у перыяд з 2000 па 2007 гады гэтыя неанацысты забілі ў розных гарадах ФРГ васьмярых выхадцаў з Турцыі і аднаго грэка, а таксама супрацоўніцу паліцыі, чыёй зброяй завалодалі. Серыя з дзесяці забойстваў, якую не раскрылі за 10 гадоў, — выпадак амаль небывалы ў сучаснай гісторыі краіны. СМІ ўжо назвалі гэту групоўку «Фракцыяй карычневай арміі» — па аналогіі з ультралевай «Фракцыяй чырвонай арміі», якая здзяйсняла тэракты ў ФРГ у 1970–1980-я гады.

Цяпер у Германіі ідуць дэбаты наконт узмацнення жорсткасці ў барацьбе з правымі радыкаламі. Магчыма, адной з ахвяраў кампаніі будзе NPD, якую даўно заклікаюць забараніць. Адзін з новых аргументаў за забарону — фіяска паліцэйскай канцэпцыі працы з правымі радыкаламі. Доўгі час лічылася, што наяўнасць легальных структур кштапту NPD дазваляе трымаць нацыстаў у зоне бачання, пад кантролем, а насычэнне партыі агентамі — прадухіліць любыя эксцэсы. Аказалася, што NPD такой функцыі не выконвае. Цяпер нічога не перашкаджае ўраду даць зялёнае святло на забарону партыі.

Магчыма, у такім выпадку Хольгер Апфель сапраўды атрымае карт-бланш на стварэнне абсалютна новай, пазбаўленай ад настальгіі па нацысцкіх часах арганізацыі.

ВЫБАРЫ

# ІСПАНСКАЯ МАЗАІКА

Алег НОВІКАЎ

**Пасля катастрофы сацыялістаў на парламенцкіх выбарах у Іспаніі, у краіне склаліся падставы для адыходу ад двухпартыйнай сістэмы.**

Як вядома, пасля краху дыктатуры ў Іспаніі ў 1975 годзе тут узніклі два вядучыя палітычныя полюсы. З правага боку — постфранкісты з Народнай партыі (PP). З левага — сацыялісты з Сацыялістычнай працоўнай партыі Іспаніі (PSOE). Гэтыя дзве сілы па чарзе кіруюць краінай ужо 35 гадоў. Аднак выбары 20 лістапада могуць пакласці канец такой бінарнай мадэлі.

Справа ў тым, што сацыялісты, якія знаходзіліся ва ўладзе з 2004 года, паказалі самы кепскі вынік за ўсю гісторыю: у іх толькі 110 дэпутацкіх мандатаў (на 59 менш, чым на мінулых выбарах). На дзесяць працэнтаў скарацілася электаральная база — да 28 працэнтаў. Такім чынам іспанцы пакаралі сацыялістычны ўрад за нядольнасць спыніць спад у эканоміцы і за рост беспрацоўя, якое дасягнула 21,5%, а сярод моладзі — нават 45,8%. Гэта, дарэчы, найгоршы паказчык у Еўрасаюзе.

Альфрэда Рубакальба — цяперашні лідар PSOE — паабяцаў хутка правесці пазачэрговы з'езд, на якім, па яго словах, адбудзецца «радыкальнае абнаўленне».

На думку палітолагаў, застой у лагеры сацыялістаў можа прывесці да дэфрагментацыі іх электарату і з'яўлення на левым флангу і ў цэнтры палітычнага спектру новых уплывовых палітычных актораў.

Або старых-новых актораў. Паколькі, мяркуючы па выніках галасавання 20 лістапада, галоўным канкурэнтам з левага боку для сацыялістаў стане групоўка «Аб'яднаная левая» (IU). IU — гэта шырокая левая кааліцыя, створаная яшчэ ў 1986 годзе падчас агульнай кампаніі левых супраць уступлення Іспаніі ў NATO. Доўгі час тон тут задавала Кампартыя.

На хвалі поспехаў сацыялістаў пачатку гэтага стагоддзя IU перажыла заняпад. У складзе былога парламенту аб'яднаныя левыя мелі толькі двух дэпутатаў. У Картэсах новага склікання ў іх 11 мандатаў. Называюць серыю фактараў рэанімацыі IU. У тым ліку і здольнасць прыцягнуць на свой бок пратэстуючую моладзь з «Руху M15».

Нагадаем, што ўвесну па Іспаніі пракацілася хваля моладзевых пратэстаў. Іх называлі «Рух M15» паводле даты нараджэння — 15 мая. Менавіта ў гэты дзень пачалася акупацыя вуліц і плошчаў. Мабілізаваныя праз платформу «Democracia Real YA!» у сацыяльных сетках на вуліцы выйшлі сотні тысяч людзей. Яны пратэставалі супраць карупцыі і сацыяльнай несправядлівасці. Паколькі год быў выбарчы, узнікла дыскусія пра тое, што рабіць руху на восеньскіх выбарах. IU удалося прыцягнуць да сябе частку актыву «нязгодных».

Аднак не ўсіх. Іншыя «нязгодныя» (увогуле, унутры руху налічваецца каля 200 мікрапраектаў) або ўвогуле адмовіліся ўдзельнічаць у выбарах, або стварылі свае выбарчыя ініцыятывы. Найбольш вядомай аказалася група «Anticapitalistas», якая заручылася падтрымкай аўтарытэтных ва ўсім свеце левых інтэлектуалаў кшталту кінарэжысёра Кена Лоуча і філосафа Ноама Хомскага. Але выбарчы спіс «Anticapitalistas» атрымаў усяго 24 тысячы галасоў.

Таксама варта ўзгадаць пра спробу стварэння ў Іспаніі партыі Зялёных на базе ўсё таго ж «Руху M15». Зялёны рух у Іспаніі, па-сутнасці, уплывовы толькі ў Каталоніі, дзе дзейнічае партыя «Ініцыятыва за зялёную Каталонію». Працуюць Зялёныя і ў іншых рэгіёнах, аднак аб'яднацца ў нацыянальны праект яны вырашылі толькі зараз. Ініцыятыва называлася «Equo» і была звязана з асобай Хуана дэ Уральдэ, былога дырэктара іспанскага філіялу «Грынпісу». Ён здолеў пераканаць эколагаў на месцах запісацца ў «Equo». За «Equo» галасавала каля 60 тысяч выбаршчыкаў.

Што тычыцца правых канкурэнтаў — сацыялістаў, то гэта перш за ўсё сацыяльналіберальны Саюз «Прагрэс і Дэмакратыя» (UpyD). Па-сутнасці UpyD склаўся на базе групы сацыялістаў, якія выйшлі з PSOE у 2007 годзе. Дысідэнты былі не згодныя з тым, што PSOE фліртуе з баскскім нацыяналізмам, не змагаецца з Касцёлам, не развівае мясцовае самакіраванне. За 4 гады існавання сацыял-лібералы дабіліся вельмі шмат — павялічылі сваё прадстаўніцтва ў парламенце з 1 да 5 дэпутатаў галоўным чынам за кошт былых выбаршчыкаў PSOE. І гэта, магчыма, толькі пачатак.

Вялікі ўплыў на будучую расстаноўку іспанскіх партый будзе мець сітуацыя ў аўтаноміях. Асабліва ў Краіне Баскаў, дзе на выбарах сапраўдны фурор зрабілі левыя нацыяналісты (інакш іх называюць «izquierda abertzale»). Іх кааліцыя пад назвай «Amaiur» стала самай папулярнай на выбарах. За «Amaiur» галасавала 330 тысяч выбаршчыкаў Краіны Баскаў, што дало кааліцыі 7 месцаў.

Ёсць цэлы комплекс прычын такога поспеху «Amaiur». Сярод іх, безумоўна, нядаўняе рашэнне тэрарыстычнай нацыяналістычнай групоўкі ЕТА адмовіцца ад вайсковых дзеянняў. Гэта стварыла ў баскскім грамадстве вялікую ілюзію магчымасці дабіцца незалежнасці мірным дэмакратычным шляхам. «Amaiur» ішла на выбары пад пафасным і адначасова супярэчлівым лозунгам: «Пайсці ў Мадрыд, каб пасля сысці адтуль».

У любым выпадку, на мясцовым узроўні трыумф «Amaiur» нельга пераацэніць. Па-сутнасці «izquierda abertzale» становіцца авангардам нацыянальнага руху, выціскаючы на задні план кансерватыўную Баскскую нацыянальную партыю (PNV), якая ў выніку галасавання 20 лістапада атрымала толькі пяць месцаў.

Праваліўся і тактычны план нацыяналістаў. PNV мела надзею, што PP не атрымае большасці ў Картэсах і будзе кіраваць з дапамогай малых партнёрскіх партый кшталту PNV, якая, у сваю чаргу, магла б дыктаваць кансерватарам сваю волю. Аднак Народная партыя набрала абсалютную большасць у Генеральных Картэсах — 186 месцаў з 350, што дае ёй магчымасць праводзіць самастойную палітыку. Увогуле, гэта самая буйная перамога правых сіл у гісторыі дэмакратычнай Іспаніі.

Зараз, нагадаем, аўтаномны ўрад фармуюць сацыялісты, аднак іх шансы на пераабранне, як сведчыць дадзеныя іспанскага барометра, вельмі прывідныя. 20 лістапада за Баскскую сацыялістычную партыю галасаваў толькі 21 працэнт мясцовага электарату.

Радыкальныя перамены ў баскай палітыцы, здаецца, можа прыпыніць толькі вяртанне Мадрыду да рэпрэсіўнай практыкі, калі ўсе партыі з лагеру «izquierda abertzale» былі забароненыя. Новы прэм'ер Марыяна Рахой ужо выступіў з падобнай пагрозай на адрас «Amaiur». Магчымасць абвастрэння сітуацыя ў гэтай галіне выключаць нельга. Тэма барацьбы з баскскім тэрарызмам і сепаратызмам заўсёды была інструментарыем у руках палітыкаў PP. Не выключана, што гэты сродак будзе ўжыты і зараз, хаця б для таго, каб адвесці ўвагу грамадства ад праблем эканомікі.

Сапраўды, сітуацыя ў эканоміцы непрадказальная. Нават самі кансерватары прызнаюцца, што рэцэптаў выхаду з крызісу ў іх няма, і новы кабінет Рахоя чакаюць вялікія цяжкасці. Няўдачы ўраду могуць прывесці да росту супярэчнасцей нават у пакуль, здавалася, маналітнай Народнай партыі. Такі даволі рэалістычны сцэнар яшчэ больш заблытае і без таго заблытаную цяперашнюю іспанскую палітыку.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### РЭДЖЭП ТАЙІП ЭРДАГАН



Прэм'ер Турцыі стаў лепшым сябрам індзейцаў. Справа ў тым, што камітэт па прыродных рэсурсах Палаты прадстаўнікоў ЗША прагаласаваў за прыняцце праекта рэзалюцыі, якая прадугледжвае наданне Турцыі гандлёвых прэферэнцый у адносінах з індзейскімі плямёнамі Амерыкі. Важнасць прынятага дакумента абумоўлена грандыёзнымі перспектывамі, якія адкрывае перад знешнімі фундатарамі магчымасць супрацоўніцтва з індзейскімі плямёнамі. Індзейцы як карэнны народ Амерыкі карыстаюцца ў Штатах падатковымі льготамі. Кампаніі, у тым ліку замежныя, якія дзейнічаюць на тэрыторыі індзейскіх рэзервацый, не плацяць падаткі ў федэральны бюджэт. А індзейцы зарабляюць неблагія грошы. Напрыклад, індзейскае племя семінолаў з Фларыды не так даўно за мільярд долараў набыло ў брытанскай кампаніі «Rank Group» грандыёзную карпарацыю «Hard Rock Cafe», што валодае сеткай рэстаранаў, гатэляў і казіно па ўсім свеце. Не дзіўна, што армянскія і грэчаскія арганізацыі ЗША заклікалі сваіх саюзнікаў у Кангрэсе перашкодзіць прыняццю дакумента. Аргументы іх былі наступныя: Турцыя, якая імкнецца скарыстацца створанымі для пацярпелага карэннага народа льготамі, не раскаялася за злачынствы, зробленыя супраць уласных карэнных меншасцяў — армян, грэкаў, асірыйцаў. Аднак у выніку закон на карысць турэцка-індзейскага сяброўства быў прыняты.

### ЭВА ЖАЛІ



Кандыдат французскіх Зялёных на пасаду прэзідэнта дала старт працэсу, вынікам якога можа стаць адмова Францыі ад эксплуатацыі АЭС. АЭС, нагадаем, з 1970-х гадоў — галоўная галіна французскай энергетыкі. Аднак Зялёныя, якія апошнім часам карыстаюцца падтрымкай 15–20 працэнтаў грамадства, блізкія да таго, каб пазбавіць Францыю мірнага атаму. Яны дабіліся ад сацыялістаў, якім напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2012 года вельмі патрэбныя галасы зялёнага электарату, падпісання спецыяльнай дамовы. Адпаведна тэксту дамовы, за падтрымку сацыялістаў на выбарах Зялёныя пасля атрымаюць наступныя бонусы — каля 16 дэпутатаў у парламенце плюс да 2025 года закрыццё прыкладна паловы (24 з 58) дзеючых у краіне атамных станцый. Навіна пра дамову мабілізавала ўсё французскае атамнае лобі. Пагроза сур'ёзная: кандыдат сацыялістаў — фаварыт выбараў. Шмат хто з аналітыкаў кажа, што рэформа прывядзе да страты Францыяй свайго энергетычнага суверэнітэту, што ў сваю чаргу прывядзе да росту коштаў на камунальныя паслугі на 40 працэнтаў. Да кампаніі супраць дамовы з Зялёнымі нават падключылі прафсаюзы, якія падлічылі, што закрыццё 24 станцыяў будзе значыць страту працы для 100 тысяч чалавек. Самае цікавае, што Зялёныя, нягледзячы на медыя-атаку, працягваюць гнуць сваю лінію. Савет іх партыі раскрытыкаваў Эву за апартунізм і замарозіў дамову да правядзення спецыяльнага з'езду. Зялёным мала закрыцця паловы станцый. Яны таксама патрабуюць прыпынення будаўніцтва адной з новых станцый, пра што ў пакце не гаворыцца.

### ІГАР СМІРНОЎ



Прэзідэнт непрызнанай Прыднястроўскай Малдоўскай Рэспублікі (ПМР), як вядома, балатуецца ў пяты раз, аднак на гэты раз супраць волі Масквы. Апошняя мае свайго пратэжэ. Між тым, у сувязі з афіцыйным пачаткам кампаніі ўсе кандыдаты апублікавалі свае выбарчыя праграмы. Смірноўская праграма выклікала шок. Нягледзячы на тое, што рэжым Смірнова праіснаваў 20 гадоў за кошт датацый Крамля, Смірноў — адзіны кандыдат, у праграме якога пра Расію не гаворыцца ні слова. Больш таго, электарат інфармуюць, што кандыдаты, якія абяцаюць адзінства з Расіяй (гэта значыць асноўныя праціўнікі Смірнова — Шаўчук і Камінскі), насамрэч будуюць планы пра тое, як зацягнуць Прыднястроўе спачатку ў склад Малдовы, а потым і Румыніі, каб «прыняць на пастой натаўскіх салдатаў». Але самае смешнае наперадзе. Цяпер у Маскве прэсуюць сына Смірнова і яго жонку за крадзеж бюджэтных грошай, якія ішлі з Расіі на падтрымку Прыднястроўя. У пракуратуру РФ таксама могуць выклікаць і Смірнова, у якога расійскі пашпарт. Каб не выглядаць маскоўскай «шасцёркай», Смірнову патрэбна як мага хутчэй прыняць нейкае іншае грамадзянства. Пытанне толькі, якое… Як жыхар былой Малдаўскай ССР Смірноў можа акрамя расійскага пашпарта атрымаць пашпарт Малдовы, Украіны ці Румыніі.

ПАРАЛЕЛІ

# ПАРТРЭТ У ПАМАРАНЧАВЫХ КОЛЕРАХ

Таццяна УЛАСЕНКА

**У 2011 годзе ў расійскай прэсе атрымала розгалас акцыя ўкраінскай дзяўчыны Ганны Сіньковай, якая ў цэнтральным скверы Кіева разам са сваімі сяброўкамі смажыла яечню з сасіскамі на газавай гарэлцы мемарыяла «Вечны агонь». «Вечная яечня на вечным агні» — так называлася акцыя. Гэты ўчынак не абмінулі ўвагай і дзяржаўныя СМІ Беларусі.**



Ганна Сінькова



Следам ускіпела віртуальная інтэрнэт-прастора. Удзельнікі форумаў і блогаў вывалілі на завадатарку акцыі мегабайты бруду, здзекаў, абраз. Адны называлі дзяўчыну ўкраінскай патрыёткай, іншыя — неанацысцкай, фашысткай, бандэраўкай і пагражалі «памачыцца» на магіле яе продкаў.

Да акцыі ўкраінак можна ставіцца па-рознаму, але ўся гэта шуміха чамусьці нагадала мне інцыдэнт у Беларусі, калі ідэйныя прыхільнікі «савецкага парадку» ганьбілі Іллю Копыла за выдадзеную кнігу «Нябышына. Вайна». Газета «Народная воля» друкавала кнігу часткамі — з усімі тымі фактамі жыцця паваеннай беларускай вёскі, якія не ўпісваліся ў межы прапагандуемай савецкай гісторыі. У кнізе быў паказаны адваротны бок Другой сусветнай вайны.

Тады з дзясятак ветэранаў, якія, дарэчы, па ўзроставай катэгорыі зусім не падобныя былі на ветэранаў, выйшлі з пікетам да сцен рэдакцыі, бо палічылі некаторыя факты з ўспамінаў Іллі Копыла дыскрэдытацыяй усяго партызанскага руху. Не даспадобы прыйшліся ім ўспаміны пра савецкіх партызанаў, якія рабавалі беларускіх сялян, забіралі харчы, і якіх сяляне баяліся не менш за немцаў.

Я выпадкова пабачыла Ганну Сінькову ў кіеўскай кавярні «Купідон», і не прамінула паразмаўляць з вядомай украінскай дзяячкай. Ганна толькі што вярнулася з чарговай палітычнай акцыі, каб «перавесці дух», абмеркаваць далейшыя дзеянні з сябрамі.

Утульная кавярня з інтэр'ерам падполля ствараe спецыфічны настрой для творчай працы і вольных думак. Таму гэта ўлюбёнае месца журналістаў, мастакоў, паэтаў і пісьменнікаў. Асобны столік зарэзерваваны для топлес-актывістак «FEMEN». Мне прадставілася магчымасць пабачыць прыгажунь апранутымі, у працэсе іх креатыўных змоваў на далейшыя палітычныя акцыі, якіх і без «FEMEN» даволі багата ў Кіеве.

Ганна Сінькова, зараз уся ў барацьбе, адразу тлумачыць: «У Адэсе зачынілі апошні незалежны тэлеканал. На такія дзеянні ўладаў трэба рэагаваць неадкладна. Ва Украіне адбываецца шмат супрацьзаконных дзеянняў, таму я разам з паплечнікамі па некалькі разоў на тыдзень ладжу палітычныя перфомансы і акцыі. Наша задача — інфармаванне грамадства і палітычны пратэст. Часу на ўсё не хапае».

У інтэрнэце часцей можна сустрэць артыкулы і каментары, у якіх маладая і прыгожая дзяўчына падаецца страшным ворагам усяго чалавецтва. Але ж падчас нашага знаёмства высветлілася, што Ганна не толькі вельмі ініцыятыўная і смелая асоба, якой я яе і прадстаўляла раней, але яшчэ і таленавітая. Піша карціны, вершы, п'есы, з'яўляецца журналісткай і ладзіць свае фотавыставы; з'яўляецца сябрам «Мемарыялу ім. В. Стуса», «Саюза тэатральных дзеячаў Украіны» і іншых. Яна распавяла, што заўсёды знаходзілася ў шэрагах нацыянальна-вызвольнага руху Украіны.

Яшчэ ў школьныя гады вольналюбівая дзяўчына, нягледзячы на забарону настаўнікаў, збегла на Майдан падчас Памаранчавай рэвалюцыі, дзе пазнаёмілася з рознымі грамадскімі і палітычнымі актывістамі. У 2008 годзе яна падрыхтавала сур'ёзнае даследаванне пра ўціск украінскай мовы ў Крыму.

З 2010 года Ганна паспявала ўдзельнічаць ва ўсіх акцыях супраць антыўкраінскай палітыкі ўладаў; яна была адным з арганізатараў акцый супраць міліцэйскага беззаконня, калі быў забіты ўкраінскі студэнт Ігар Індыл. І так склалася, што ў 2011 годзе Ганна Сінькова ўпершыню ў часы найноўшай гісторыі Украіны стала адной з першых жанчын-палітвязняў.

29 сакавіка 2011 года дзяўчына была схоплена і абвінавачана ў апаганьванні магілы, ёй інкрымінавалася ад 3 да 5 гадоў турмы, але неўзабаве пасля 3-х месяцаў СІЗА, суддзя Радзівон Кірэеў нечакана вызваляе Ганну па падпіску аб нявыездзе. Заўважу, што пасля нечаканага выхаду з СІЗА на волю Ганна адразу вызвалася прыняць удзел у акцыі ўкраінскіх нацыяналістаў, якія таксама смажылі яечню. А пасля высветлілася, што акцыя ладзілася ў яе падтрымку.

«Суддзяў ва Украіне разыгрывае кампутар метадам латарэі, — распавядае Ганна. — І суддзя, які займаўся маёй справай... Яму страшна не шанцавала! Кампутар выкідваў на яго долю самыя скандаланыя палітычныя справы, якія суправаджаліся гучнымі скандаламі і шматлікімі грамадскімі пратэстамі. Пры тым, што суддзя малады, мае ўсяго два гады судзейскага стажу. Нечакана ён выпусціў мяне па падпіску аб нявыездзе, хаця зараз яму прыйшлося засудзіць самую вядомую ўкраінскую жанчыну-палітыка — Юлію Цімашэнка... Мая ж справа таксама не праходзіла гладка. Падчас суду адбываліся бойкі ўкраінскіх патрыётаў з міліцыяй. Мяне падтрымлівалі дэпутаты, вядомыя дзеячы. Пад узмоцненым канвоем спецслужбы выводзілі мяне з залі суда. Нядаўна на долю таго ж суддзі Радзівона Кірэева выпала яшчэ адна гучная палітычная справа — супраць маёра Мікалая Мельнічэнкі, які перасьледаваўся за запісы размоваў былога прэзідэнта Украіны Кучмы з высокапастаўленымі чыноўнікамі. (У размове фігуравала тэма забойства журналіста Георгія Гангадзэ, які ў выніку і быў забіты. Мельнічэнку ўдалося пазбегнуць пераследу ўладаў, атрымаўшы палітычны прытулак у ЗША. У 2005 годзе яго крымінальная справа была зачынена. Мельнічэнка вярнуўся ва Украіну, але летась на былога ахоўніка Кучмы зноў распачалі крымінальную справу — аб разгалошванні дзяржтаямніцы і перавышэнні службовых паўнамоцтваў. Мельнічэнка зноў з'ехаў за мяжу). Не думаю, што ўсе гэтыя палітычныя справы на сумленні суддзі Радзівона Кірэева з'яўляюцца выпадковасцю, кампутарнай латарэяй. І яго можна толькі пашкадаваць».

***— Ён жа робіць сваю паднявольную справу...***

— Так. Але гэтаму маладому суддзі прыйдзецца потым расплочвацца пасадай, калі зменіцца ўлада. Старыя, вопытныя суддзі добра гэта разумеюць, таму робяць так, каб гучныя палітычныя справы не выпадалі на іх долю метадам кампутарнай «латарэі».

***— Ганна, а што вы ўсё ж хацелі выказаць той акцыяй? Бо вашы дзеянні выклікалі бурную істэрыку ў некаторых людзей і ва Украіне, а пра Расію і гаварыць не даводзіцца: дастаткова набраць ваша імя ў інтэрнэце. Хаця дазволю сабе заўважыць, што ў некаторых расійскіх гарадах бамжы даўно выкарыстоўваюць вечныя агні для прыгатавання ежы...***

— Тая акцыя больш за ўсё прымусіла панервавацца прыхільнікаў партыі ва Украіне. Я наступіла на іх самы балючы мазоль — на іх ідэалагічную сімволіку! Спачатку мне хацелі даць ад 3 да 5 гадоў за апаганьванне магілы салдат. Але ці пахаваны там салдаты Другой сусветнай вайны? Гэта вельмі спрэчнае пытанне. Што да памяці продкаў... Дык памяць для мяне — не пустое слова і не сімвал. У многіх ветэранаў сёння падманам адбіраюць кватэры... Некаторыя з іх не могуць дазволіць сабе правесці газ у хату. Безліч ветэранаў, кінутых дзяржавай, выжываюць — хто як можа! Хіба гэта даніна іх гераічным заслугам? Трэба зразумець, што Вечны агонь не памяць забітых салдат ушаноўвае, а праслаўляе савецкае мінулае, з'яўляецца адным з яго сімвалаў. Вось чаму так раздражніла многіх расійскіх грамадзян гэта акцыя — яны вельмі моцна трымаюцца за сваю ідэалогію «вялікай перамогі»! Гэта не столькі помнік, колькі сімвал. І на гэтым месцы не было гераізму — была трагедыя. Калі тут сапраўды ляжаць невядомыя салдаты, то іх трэба ўшанаваць больш прыстойна — пахаваць па хрысціянскіх традыцыях на вайсковых могілках ці паставіць помнік без аніякай сімволікі. Каб магчыма было запытацца ў іх, забітых салдат, ці хацелі б яны ляжаць пад сталінскай сімволікай? Я ад пачатку выступаю супраць блюзнерства. Але сёння становіцца ўсё больш актуальнай пагроза насоўвання ўкраінцам культу савецкага мінулага і сталінізму — праз вось такія вечныя агні, праз зоркі і чырвоныя сцягі.

***— Вы сядзелі ў знакамітай Лук'янаўцы. Распавядзіце аб умовах утрымання.***

— Асноўная праблема — гэта перапоўненасць. Вельмі цяжка, калі замест 20 чалавек у камеры знаходзіцца 70. Выбітыя вокны, скразнякі... Шмат хваробаў і адсутнасць медыцынскай дапамогі. Але Лук'янаўскае СІЗА славіцца сваімі вязнямі. Тут перасядзела бадай што ўся нацыяналістычная украінская інтэлігенцыя, рэвалюцыянеры і апазіцыянеры розных эпох. Тут утрымліваўся паэт і праваабаронца, палітвязень Васіль Стус, які затым быў пасмяротна рэабілітаваны; там жа ўтрымліваецца і Юлія Цімашэнка...

***— Вас бы асудзілі, калі б Януковіча яшчэ не было пры ўладзе?***

— Думаю, што ўсё ж такі не... Калі кіраваў Ючшанка, у краіне налічваліся адзінкі палітзняволеных, і тое іх хутка адпускалі. Былы прэзідэнт больш лаяльна ставіўся да акцый нацыяналістычнага характару. Пры Юшчанку быў бардак, але пры Януковічу зараз адбываецца рух да таталітарызму пры поўнай усёдазволенасці сілавых структур. Па розных рэгіёнах патрыётаў саджаюць цэлымі арганізацыямі! Праваабаронцы не спраўляюцца здабываць інфармацыю па кожнаму новаму палітзняволенаму.

Справа ў тым, што ўкраінскія нацыяналісты дзейнічаюць пад нікамі. Яны могуць не ведаць адзін аднаго ў твар, не ведаць сапраўдныя прозвішчы паплечнікаў. Таму вельмі цяжка даведацца, каго дакладна схапілі і дзе яго ўтрымліваюць. Таму і немагчыма сказаць дакладную колькасць палітвязняў, але я смела назвала б лічбу ад 50 да 100 чалавек. Мы ведаем, што рэпрэсіі адбываюцца ў Запарожжы, Харкаве, Львове.

Ведаю, што ў вас шмат палітвязняў. Ведаю, што справы ў вас нашмат горшыя. Я маю на ўвазе стан грамадства, бо калі яно змірылася, значыць, палітвязні будуць бясконца. Мяне разам з паплечнікамі заўсёды больш за ўсё здзіўляла змірэнне беларусаў са сваім лёсам. Ваша краіна ў нас асацыіруецца з жорсткім рэжымам. Шчыра кажучы, мы нават адчуваем пагрозу таго, каб з Беларусі да нас гэты рэжым не прыйшоў.

ЦІКАВА

# ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА КУБЭ

## (ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ ЭСЭ)

Працяг. Пачатак у №42–43 (265–266).

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

**Новая сітуацыя ўзнікла ў верасні 1941 года ў Беларусі, калі ўсталяваўся акупацыйны грамадзянскі рэжым. Тут Кубэ сутыкнуўся з праблемай, якую ён назваў беспрэцэдэнтнай.**

### Пра дзяржаўнасць Беларусі

Аказваецца, Беларусь не мела традыцый дзяржаўнай самастойнасці, вынікам чаго стаў слабы ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускага народа і ўзмацніліся расійскія і польскія палітычныя і культурныя ўплывы. Аб гэтым яскрава сведчыла нанятая грамадзянскім рэжымам мясцовая адміністрацыя, нацыянальны склад якой у малой ступені супадаў з тытульнай назвай краіны. І не выпадкова Кубэ адзначаў: «Беларусь была не больш чым імглістым геаграфічным паняткам у самым негатыўным значэнні гэтага слова».

У адрозненне ад афіцыйнай палітыкі Трэцяга рэйху, якая зводзілася найперш да эканамічнай эксплуатацыі акупаваных тэрыторый, Кубэ на пачатку сваёй дзейнасці ў Мінску імкнуўся прывіць Беларусі нацыянальную ідэнтычнасць. Гэтае права яму давала моцная асабістая пазіцыя, якую ён займаў, маючы падтрымку Гітлера. Кубэ ўсяляк прапагандаваў прынцыпы гэтай палітыкі, тлумачачы, што ва ўмовах свабодных ад расійскага і польскага палітычнага ўплыву, якія стварыла нямецкая акупацыя, беларускі народ атрымаў магчымасць за кароткі час дагнаць гістарычнае спазненне ў развіцці нацыянальнай свядомасці. Таму трэба было паскорыць гэты працэс, каб пераадолець чужы ідэйны ўплыў і ўзмацніць беларускія нацыянальныя элементы, і перш за ўсё школу, культуру, працу сярод моладзі.

Развіццё падзей у Беларусі ў выніку палітыкі Кубэ, якая была накіравана на ўзмацненне нацыянальных сіл, ставіла гэтыя спадзяванні пад сумнеў. Пашыралася дзейнасць савецкіх партызанаў, якімі кіравалі і якіх падтрымлівалі з-за лініі фронту. Партызаны правакавалі ўзмацненне карных паліцэйскіх аперацый, што суправаджаліся спальваннем вёсак, вынішчэннем ці дэпартацыяй жыхароў у Германію, якія падазраваліся ў дапамозе партызанам, і іншымі злачынствамі. Падчас такіх аперацый загінула каля 100 тысяч жыхароў беларускіх вёсак, у асноўным старых, жанчын і дзяцей.

Кубэ разумеў, што злачынствы супраць мірных жыхароў з боку СС і паліцыі падчас карных аперацый перакрэсліваюць усю ягоную палітыку, разлічаную на заваёву сімпатый акупаванага насельніцтва. З гэтай прычыны і гуманістычных намераў ён распачаў барацьбу з СС і паліцыяй, абараняючы невінаватых людзей.

Не маючы права, паводле яго статуса, аддаваць загады паліцэйскім уладам, Кубэ выкрываў злачынствы карных аддзелаў, дакладваў пра іх вышэйшаму кіраўніцтву ў Берлін і наўпрост разлічваў, што з яго заступніцтва будзе плён. На гэтай глебе разгарэўся востры канфлікт, і кіраўніцтва СС і паліцыі патрабавала выдаліць Кубэ з Мінску, пра што было згадана вышэй.

У снежні 1942 года паліцэйскія ўлады ў Берліне і Мінску адначасова пачалі кампанію, якая была накіравана на палітычную дыскрэдытацыю Кубэ як ініцыятара «супярэчлівых» інтарэсаў Германіі беларускіх нацыянальных тэндэнцый. У першую чаргу пачалі распрацоўваць кіраўніцтва БНС і збіраць довады яго «злачыннай дзейнасці». Галоўны ўдар прыйшоўся па Івану Ермачэнку, а разам з ім і на прынцыпы яго палітыкі, якая пакрывалася рашэннямі нямецкіх вышэйшых грамадзянскіх уладаў. Следства пачало займацца гаспадарчай дзейнасцю БНС, дзе былі выкрыты злоўжыванні. Ермачэнка звольніўся з пасады і 27 красавіка 1943 года пакінуў Мінск.

У Мінску знаходзілася вышэйшая цывільная акупацыйная ўлада — Генеральны камісарыят Беларусі на чале з Вільгельмам Кубэ. Тут размяшчаўся штаб корпуса па ахове тылу групы армій «Цэнтр», аддзел абвера пад кіраўніцтвам паліцыі бяспекі СД, штаб па барацьбе з партызанскім рухам, галоўная палявая камендатура, ваенная камендатура, паліцыя аховы і парадку, шматлікія часткі СС, жандармерыя. Ваенны гарнізон у горадзе налічваў каля 5 тысяч салдат і афіцэраў. Акрамя гэтага ў Мінску і яго прыгарадах дыслацыраваліся буйныя армейскія рэзервы, якія папаўняліся і перафарміроўваліся пасля баёў на фронце. Іх колькасць часам даходзіла да 50–60 тысяч чалавек. Дарэчы, з асяроддзя павольжскіх немцаў, якія за некалькі гадоў да нападу Германіі на СССР прыехалі ў Мінск і другія месцы Беларусі, рэкрутаваліся работнікі германскіх акупацыйных органаў.

Ратуючы Ермачэнку, Кубэ абараняў сваю ўласную пазіцыю, але заплаціў за гэта разбурэннем механізму палітычнай дзейнасці, які ён паслядоўна ствараў з верасня 1941 года. Пад націскам паліцэйскіх уладаў вясною 1943 года былі ліквідаваны ўсе не прадугледжаныя статутам БНС структуры, у тым ліку і Галоўная рада. У красавіку 1943 года была распушчана Беларуская самаахова.

Атакі паліцэйскіх уладаў, якія каардынаваў прызначаны Гімлерам кіраўнік СС і паліцыі ў Беларусі брыгадэнфюрэр Курт фон Готберг, не прымусілі Кубэ адмовіцца ад працягу пазітыўнай беларускай палітыкі.

Кубэ пачаў дзейнічаць больш асцярожна і ўсе важнейшыя ініцыятывы ўзгадняў з міністэрствамі акупаваных усходніх абласцей у Берліне.

Ён неаднаразова падкрэсліваў: «Мы прыйшлі сюды як пераможцы, але пераможцы бальшавізму, а не беларусаў, для якіх мы вызваліцелі», і заклікаў так арганізаваць беларускую нацыю, «каб яна была на ўзроўні еўрапейскіх нацый».

23 жніўня 1943 года, за месяц да гібелі Кубэ, адбылося пасяджэнне Камітэта даверу (больш вядомага як Рада даверу). Сярод пытанняў значылася і такое: метады барацьбы з партызанамі. Разглядаліся злачынствы паліцэйскіх аддзелаў у час антыпартызанскіх карных аперацый. На пасяджэнні былі выказаны наступныя прапановы: а) спыніць спальванне вёсак і рэпрэсіі супраць нявіннага мірнага насельніцтва; б) стварыць умовы і рэальныя гарантыі бяспекі для людзей, якія б вярнуліся з лясоў дадому; в) стварыць нямецка-беларускую камісію, даручыўшы ёй распрацаваць адпаведныя рэкамендацыі па гэтых пытаннях і ажыццявіць кантроль за іх выкананнем.

Паводле ўспамінаў Я. Калубовіча, пазіцыя Рады даверу выклікала абурэнне прысутных афіцэраў СС і паліцыі.

Сябры Рады даверу пабойваліся арышту, і іх не пакідала думка, што немцы могуць з імі расправіцца. Не выключалася магчымасць, што органы СД і СС і паліцыі не даруюць гэтага Кубэ.

Яшчэ ў жніўні 1942 года былі спробы стварыць нацыяналістычныя фарміраванні ваеннага тыпу з ліку беларусаў. Паводле ўказанняў Кубэ кіраўнікі Беларускай народнай самапомачы распачалі арганізацыю Беларускага корпуса самааховы, прызначанага для ўзброенай барацьбы з партызанамі. Але многія з тых, каго акупанты прымушалі служыць у атрадах «самааховы», ухіляліся ад мабілізацыі і ішлі ў партызанскія атрады. У выніку правалу задумы Кубэ ў красавіку 1943 года акупанты загадалі распусціць атрады «самааховы».

Акупацыйныя ўлады ўсё рабілі для таго, каб як мага больш выкарыстаць багацці захопленых тэрыторый, падавіць супраціўленне насельніцтва пры дапамозе гвалту, прымусу, крывавай расправы, расстрэлу. Кубэ адзначаў, што мэта акупацыйных уладаў — прымусіць беларусаў працаваць на Германію, а з Беларусі вывозіць усё, чаго не хапала ў Германіі. Ацалелыя прадпрыемствы акупанты прыстасоўвалі для рамонту ваеннай тэхнікі, для патрэбаў арміі імкнуліся наладзіць работу мясцовай прамысловасці.

Кубэ пратэставаў супраць варварскіх метадаў акупацыі Беларусі: масавыя расстрэлы, захоп жанчын і дзяцей не маюць нічога агульнага з гуманным вядзеннем вайны. Колькасць вёсак, знішчаных у час вялікіх карных паліцэйскіх аперацый, намнога перавышала колькасць вёсак, якія спалілі партызаны. Кубэ разумеў, што калі нямецкія ўлады і ў далейшым будуць дзейнічаць такімі метадамі, то яны не змогуць разлічваць на ўціхамірванне краю. Карныя аперацыі часта ператвараліся ў крывавыя оргіі. Нямецка-фашысцкія захопнікі апрача абяцанняў, у якія ўжо ніхто не верыў, практычна не давалі нічога народам Усходу, гэта значыць акупаванай тэрыторыі СССР.

Цяжка вызначыць, чаго было больш у дзеяннях Кубэ — разбою, садызму ці лагоднасці ў адносінах да беларускага народу.

Безумоўна, не пра беларускі народ, не пра захаванне і развіццё беларускай мовы і культуры клапаціўся ён, а перш за ўсё пра танную рабочую сілу, бясслоўную і пакорлівую. А што тычыцца яўрэйскай моладзі, то яна, як у падпісаным Кубэ распараджэнні 10 верасня 1941 года, «не падлягае абавязковаму навучанню». Ёй, як вядома, быў угатаваны іншы лёс.

На пачатку 1943 года з генеральнай акругі Беларусі сілком адправілі ў Трэці рэйх 500–1000 юнакоў і дзяўчат. Паўсюдна ішло паляванне на людзей, нават у школах у час аблавы адбіралася моладзь для ўгону ў Германію.

Тут, у Мінску, нямецкім «шэфам» (у першую чаргу генеральнаму камісару Беларусі, гаўляйтару Кубэ) дастаўляліся ў неабмежаванай колькасці тлушч, хатняя птушка, белая мука, а «шэфы» ўсім гэтым удала гандлявалі ў Берліне. Выконваліся і іншыя інтымныя даручэнні вышэйшага нямецкага начальства, пра што будзе расказана далей.

Кубэ ўчыніў рабаванне нацыянальнай бібліятэкі імя Леніна. Паводле яго распараджэння ў Берлін рэгулярна вывозіліся рарытэтныя кнігі па гісторыі Беларусі аддзела рукапісных і старадрукаваных кніг. Каб схаваць сляды сваіх злачынстваў, гаўляйтар разам са сваімі падручнымі — «шэфам» культурных устаноў Генеральнага камісарыята Беларусі Куртцам, а потым са зняміўшым яго Шосцам — распарадзіліся ў 1942–1943 гадах правесці так званую чыстку фондаў бібліятэкі, вынікам чаго стала яе фактычнае знішчэнне. Гэта бібліятэка, значна разрабаваная, была вернута ў БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Працяг будзе



В. Кубэ сярод бліжэйшага атачэння Гітлера

Пасля акупацыі на ўсёй тэрыторыі Беларусі было ўведзена ваеннае кіраўніцтва, якое ўзначаліў камандуючы тыламі групы армій «Цэнтр» генерал Макс фон Шэнкендорф. Яму падпарадкоўвалася сетка палявых камендатур, а ім, у сваю чаргу, — мясцовыя камендатуры, якія ствараліся практычна ва ўсіх гарадах і былых раённых цэнтрах Беларусі. Згодна з дырэктывамі Галоўнага камандавання Вермахта, ваеннае кіраўніцтва мела пераходны характар і з цягам часу яго адміністрацыйныя функцыі мусілі перайсці грамадзянскія ўлады. Але ў выніку няспрыяльнай сітуацыі на Усходнім фронце, армія перадала цывільным уладам толькі заходнюю частку Беларусі, а яе ўсходняя частка да канца акупацыі заставалася ў зоне ваеннага кіраўніцтва.



Галоўная Рада БНС, ліпень 1942 . Сядзяць (злева): Іван Касяк, Павел Свірыд, архіепіскап Філафей, Іван Ермачэнка, ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, Вацлаў Іваноўскі

КАНЦЭРТНЫЯ НАТАТКІ

# НА СКРЫЖАВАННІ МУЗЫЧНЫХ ШЛЯХОЎ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Аматары беларускай рок-музыкі і гурта «:B:N:» з асаблівым пачуццём прыйшлі на канцэрт любімай каманды: музыканты з Бярозы не так даўно абвясцілі пра пачатак працы над трэцім па ліку альбомам. Падзея павінна была адбыцца менавіта пасля гэтага канцэрта, які прысвячаўся 12-годдзю гурта.**



Слухачы, якія прыйшлі ў сталічны клуб «Re:Publik», чакалі новыя песні ад любімага гурта, назіралі за тым, як змяніліся гучанне каманды, задаваліся пытаннем, якія «фішкі» падрыхтавалі «бээнаўцы» для свайго музычнага шоу? На ўсе гэтыя пытанні ў вопытных музыкантаў знайшоўся адказ, бо «жывы» канцэрт — заўсёды экзамен для таленавітых музыкантаў, якія смела ідуць на наўпраставы кантакт са слухачамі. А музыканты «:B:N:» заўжды адрозніваліся менавіта гэтымі якасцямі. Цікаўнасць да канцэрта была падвышана і тым, на сцэну клуба была запрошана яшчэ адна суперпапулярная каманда — магілёўскі гурт «Akute».

У нечым гэтыя каманды падобныя, бо выконваюць энергічны гітарны рок, хоць магілёўцы граюць трыо, а бярозаўцы — квартэт. Абедзве каманды былі трыумфатарамі фэсту «Басовішча», «:B:N:» у 2002 годзе, а іх магілёўскія сябры — у 2010-м. Аб'ядноўвае музыкантаў і тое, што за аснову сваёй творчасці яны бяруць жыватворны рок-н-рол, а тэксты іх заўсёды напоўнены яскравымі пачуццямі, якія імкнуцца раскрыць унутраны свет сучасніка. Да таго ж, іх яднае агульная прыхільнасць да беларускай мовы ў песнях, што робіць іх кампазіцыі ўзорамі нацыянальнай музычнай творчасці маладой генерацыі беларусаў пачатку XXI стагоддзя.

На канцэрце ў сталічным клубе «Re:Publik» музыканты прадставілі свае праграмы, якія адлюстроўвалі сённяшні стан выканаўчага і кампазіцыйнага майстэрства вядомых выканаўцаў. Зразумела, музыканты «Akute» прадстаўлялі сталічным слухачам песні са свайго новага альбома «Дзеўчынкі і космас», а вось «бээнаўцы» нагадалі хіты з папярэдніх кружэлак — «Не трывай» і «Жыве рок-н-рол». Запіс наступнага, трэцяга альбома бярозаўскімі музыкантамі быў толькі абвешчаны, і гурт «:B:N:» праспяваў слухачам дзве кампазіцыі з чарговага альбома. Гэта песні «Выраю няма» і «Напрыканцы»...

Затое госці з Магілёва з гурта з «Akute» яшчэ раз «выпрабавалі» ў канцэртных умовах свой новы альбом. Дзякуючы таму, што ўпершыню яго можна было пачуць і спампаваць з інтэрнэта, слухачы добра ведалі словы песень і актыўна дапамагалі лідарвакалісту і гітарысту «Akute» Стасю Мытніку. Так, агульным спевам, прагучалі вядомыя ўжо ў Мінску песні гурта «Машына», «Свяці», «Агонь», «Павольна», «Непазбежнасць» і, канешне ж, песня, якая ў нейкай ступені вызначыла лёс музыкантаў — «Адзіноцтва». Прагучала і навінка ад «Akute»: песня «Іголкі», якая плануецца для другога альбома каманды.

У музыцы «Akute» шмат эксперыментальнага — незвычайныя сугуччы і гітарныя акорды, нечуваныя раней у айчыннай рок-музыцы рытмічныя і кампазіцыйныя малюнкі. У той жа час песні гурта напоўнены «касмічнай» меланхоліяй і сімвалізмам адзіноты далёкіх зорак, мінорным строем некаторых кампазіцый. Гэтая своеасаблівасць музыкі «Akute» вылучае яе на фоне ўсіх гуртоў, якія дэкларуюць прыхільнасць да стылістыкі рок-музыкі XXI стагоддзя. «Akute» ад дэкларацый робіць значны крок да рэалізацыі гэтай мэты: каманда ўспрымаецца як флагман мадэрновых стылістычных эксперыментаў айчынных музыкаў. Нездарма магілёўскія музыканты з вялікай доляй самаіроніі ахрысцілі свой гурт «дыска-дэкадансавым»...

Музычная і гукавая эвалюцыя гурта «:B:N:» адбываецца даволі традыцыйна: ад рок-н-рольных рытмаў у бок «металічных» гітарных рыфаў і хард-рокавага ансамблевага гуку. Гэтыя змены добра былі заўважныя ў каверы на знакамітую песняроўскую апрацоўку народнай песні «Ружа», якую на канцэрце музыканты «:B:N:» прысвяцілі памяці Уладзіміра Мулявіна. Кавер на «Ружу» вызначаўся акцэнтаваным рытмічным інструментальным малюнкам у metal-стылістыцы, а ў выніку — незвычайным прачытаннем мулявінскай аранжыроўкі.

Песні з новага, трэцяга па ліку альбома «:B:N:» засведчылі, што музыканты сталеюць і гатовы прапанаваць слухачам не толькі хітовую рок-музыку, але і заглыбленыя, філасофскага плана кампазіцыі, якія дадуць прыхільнікам творчасці гурта і беларускай рок-музыкі падставы для больш глыбокага асэнсавання з'яваў нашага жыцця, для больш глыбокага разумення сваёй ролі ў грамадстве, у лёсе краіны. Да таго ж, новыя творы «Выраю няма» і «Напрыканцы» неяк незаўважна намалявалі рысы новай працы музыкаў «:B:N:» і іх адрозненні ад папярэдніх кружэлак. Зрэшты, ці спраўдзяцца гэтыя прагнозы і спадзяванні слухачоў, пакажа час. Тым больш, што бярозаўскія музыканты абяцалі новы альбом ужо вясной будучага года.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284—85—11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1193

Падпісана да друку 25.11.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.